КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 17 (240) ◂ 29 красавіка ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час



**БІТВА ЗА КРЭМЛЬ**

Стар. 28

**ЯК КОШТЫ ГРЫЗУЦЬ ЗАРОБКІ**

У краіне няма грошай, і яны не хутка з'явяцца. Нават з улікам расійскіх і «еўразійскіх» крэдытаў

Стар. 5

**ГЕНЫ ВАСІЛЯ ШАРАНГОВІЧА**

Летась Васіль Шарагновіч прэзентаваў мне кнігу ўспамінаў «Ген жыцця». А ў гэтым годзе я запісаў яго аповед пра галоўныя складнікі, што вызначылі яго лёс

Стар. 30–31

**ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ**

Стар. 9–24

ISSN 2218-2144
9 772218 214401 10016

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**УЛАДЗІМІР МАЦКЕВІЧ**

Нарыс Аляксандра Тамковіча з цыклу «Трэці сектар у асобах»

▸ **ПАЛІТЭКАНОМІКА**

# КРАХ ЭКАНАМІЧНАЙ СІСТЭМЫ

**Вольга ХВОІН**

**Эканамічная палітыка кіраўніцтва краіны прывяла да боек пад абменнымі пунктамі валют. Напал эмоцый на глебе жадання набыць валюту канстатавала нават МУС, заявіўшы, што трэба ўзмацняць каля абменных пунктаў ахову. Афіцыйна дэвальваваць беларускі рубель улады адмаўляюцца, але за іх гэта ўжо даўно зрабілі людзі. У разліках прымаецца не курс Нацбанка, а намнога большы. Долар можна купіць-прадаць па 3 800 і вышэй, еўра — пачынаючы ад 4 900 рублёў. Праўда, аперацыі гэтыя праводзяць не банкі, а фірмы, якія прадаюць тавары і паслугі, і самі людзі.**




Нацбанк і ўрад, каб разруліць сітуацыю, планавалі ўвесці на валютна-фондавай біржы дадатковую сесію, дзе курсы валют будуць вызначацца на аснове попыту і прапановы. Але праз тыдзень Нацыянальны банк апублікаваў афіцыйнае паведамленне, у якім гаворыцца, што «цяпер няма неабходнасці ўводзіць дадатковую сесію на таргах ААТ «Беларуская валютна-фондавая біржа». Адкрыццё альтэрнатыўных па адносінах да асноўнай сесіі таргоў патрабуе выканання значнай падрыхтоўчай працы тэхнічнага характару, а таксама стварэння ўсіх умоў, неабходных для ўстойлівага і эфектыўнага функцыянавання дадатковай сесіі». Такі шанец быў паглядзець на рэальны курс беларускага рубля! Праўда, пасля першага дня таргоў наўрад ці ўжо можна было б гаварыць, што не ўсё так страшна і сітуацыя пад кантролем.

Чыноўнікі працягваюць запэўніваць, што ў дэфіцыце валюты вінаватыя самі беларусы, якія скупляюць долары і еўра пад эмацыйным ціскам.

Урад ужо не можа хаваць высокіх коштаў. Міністр эканомікі Мікалай Снапкоў заявіў, што Мінэканомікі Беларусі пералічвае прагноз інфляцыі на 2011 год. «Мы цяпер новы прагноз лічым. Інфляцыя ўжо перавалiла за прагнозны ўзровень, хоць база інфляцыі без уліку энергетыкі і імпартуемых харчовых тавараў складае 3,6–3,7%, — сказаў Мікалай Снапкоў. — Цяпер мы праводзім разлікі, мы не хацелі б памыліцца яшчэ раз. Пры гэтым асноўнымі фактарамі, якія мы выкарыстоўваем у разліках, з'яўляюцца тыя, наколькі Нацбанк вызначыць раўнаважны курс, а таксама тое, наколькі сціск выдаткаў бюджэту дазволіць выканаць параметры ВУП. Пакуль мы канчаткова ні на першае, ні на другое пытанне адказаць не можам. Тыя сцэнары, якія мы падлічваем, нам пакуль не хацелася б афішаваць».

Прэм'ер-міністр Міхаіл Мясніковіч на пасяджэнні Савета міністраў дамаляваў карціну, сказаўшы пра 1% прыцягнутых замежных інвестыцый ад гадавога плану. За першы квартал.

З краіны збягаюць імпарцёры. Вытворцы падвышаюць кошты на тавары, што вырабляюцца з сыравіны, якая пастаўляецца ў краіну. Экспарцёры, як перадае Інтэрфакс, прапануюць валюту на пазабіржавым рынку па завышаных курсах (хаця цягам апошняга месяца гэтым наўрад ці здзівіш людзей, занятых у бізнэсе). «Мы выдатна разумеем, што акрамя курсу Нацбанка ёсць яшчэ і курс пазабіржавы. І сёння там лічбы вельмі высокія, і яны ў прынцыпе не дазваляюць нам купляць валюту, каб разлічыцца з замежнымі партнёрамі. Мы і не купляем, таму што гэта будзе проста спусташэнне для кампаніі купляць валюту па тых спекулятыўных курсах, якія на сёння прапануюць. Чым даўжэй гэтая незразумелая сітуацыя працягнецца, тым вышэй там будуць кацiроўкі», — цытуе прадстаўніка кампаніі-імпарцёра харчавання Інтэрфакс.

Падаецца, што блізка калапс, які столькі гадоў прарочылі беларускай эканоміцы. Але эканаміст-аналітык Леанід Заіка падкрэслівае, што «ніякага развалу, краху эканомікі няма, відавочны крах непрадукцыйнай эканамічнай палітыкі Аляксандра Рыгоравіча і ўсіх тых, хто засядае з ім у кіраўнічых фатэлях».

«Нашаму кіраўніцтву парады, як палепшыць сітуацыю, не патрэбныя. Яны мусяць атрымаць па поўнай праграме за сваю працу, толькі людзей шкада, — разважае эканаміст. — Парады я даваў яшчэ летась: праводзіць на працягу года мяккую дэвальвацыю па 1–1,5 працэнта штомесяц. Калі б гэта рабілі, то ўжо выйшлі б на 14% дэвальвацыі абменнага курса. Аналагічна з улікам росту коштаў трэба было праводзіць дэвальвацыю па 3% штомесяц сёлета. І мы б ужо выйшлі на курс 3600—3700 рублёў за долар. Гэта ўраўнаважыла б сітуацыю. Але ні кіраўнік дзяржавы, ні старшыня Нацбанка, ні прэм'ер гэтага не рабілі і атрымалі ,што хацелі. Першае: кіраўніцтва краіны прадэманстравала немагчымасць вырашаць макраэканамічныя праблемы, другое — якія парады ні давай, гэта бессэнсоўна. Трэба не ложкі перастаўляць у публічным доме, а памяняць дзяўчат».

Цяпер кіраўніцтва краіны чакае расійскага крэдыту. «На Захадзе нам ужо няма чаго рабіць, 19 снежня апошні шлях туды з дапамогаю расійскіх спецыялістаў быў адрэзаны. У беларусаў застаўся толькі адзін вектар — крамлёўскі. І Лукашэнку варта было б звярнуцца наўпрост да Пуціна з просьбаю даць грошы пару месяцаў таму. На той момант любімы беларускім народам Лукашэнка паехаў бы да любімага расійскім народам Пуціна і папрасіў на шчырае сяброўства мільярды тры. Думаю, гэтыя грошы б далі пад поўныя абавязальніцтвы аддаць частку ўласнасці. А беларускаму народу ўласнасць не патрэбная, іх задавальняе тое, што ёсць. Працавалі б на расіян ці турак — гэта наша псіхалагічная адметнасць, — то навошта перашкаджаць», — разважае Заіка.

Эканаміст гаворыць, што безвыходнасці ў цяперашняй сітуацыі няма. «Па-першае, дэвальваваць нацыянальную адзінку можа любы дурань, другое — вывесці курс на больш-менш медыянную, сярэднюю велічыню таксама можна. Але гэта не робіцца праз таргі на біржы. Гэта прадугледжвае сур'ёзнае паніжэнне прыбытку. Трэба было пачаць з таго, што прэзідэнту і ўсім чыноўнікам — вертыкальшчыкам-гарызантальшчыкам — скараціць заробак напалову, потым скараціць хаця б на чвэрць расходы бюджэту... але калі гэтага не рабіць і чакаць, што прыедзе Аляксандр Лукашэнка і прывязе 3–4 мільярды ад расіян, то мы пагарэзім некалькі месяцаў. А потым усё вернецца да цяперашняй сітуацыі», — папярэджвае эксперт.

СУДЫ

# АГЕНТ ЦІ МІНАК?

Таццяна ШАПУЦЬКА

**27 красавіка на лаву падсудных селі гісторык-архівіст Зміцер Дрозд, гродзенскі маладафронтавец Алесь Кіркевіч, сябра кампаніі «Гавары праўду» Павал Вінаградаў, праграміст Андрэй Пратасеня і беспрацоўны Уладзімір Хамічэнка.**

Апошняга праз дзіўныя паводзіны на плошчы Незалежнасці журналісты назвалі «агентам Навушнікам». Нагадаем, фотакамеры зафіксавалі, як падчас бійца дзвярэй Дома ўраду ён рабіў незразумелыя рухі, падобныя на перадаванне інфармацыі ў прыхаваны мікрафон. Пазней людзі, якія адбывалі разам з ім адміністрацыйнае пакаранне, апавядалі, як Хамічэнка «пераязджаў» з камеры ў камеру і кожны раз паведамляў пра сябе іншыя звесткі.

На судзе Уладзімір Хамічэнка даваў паслядоўныя паказанні, не збіваўся, адмоўна супраць маніфестантаў не сведчыў, імкнуўся распавесці ўсё ў дэталях. Паводле ягоных словаў, мужчына проста гуляў па горадзе, выпіўшы да гэтага 4 літры піва, і, пабачыўшы вялізны натоўп, вырашыў далучыцца і паглядзець, куды рушаць людзі. Хамічэнка часткова прызнаў віну і пацвердзіў, што біў па драўляных загародках у дзвярах Дома ўраду, але зазначыў, што агулам агрэсіўнага настрою ў людзей не было. Падчас аповеду Хамічэнка заікаўся, ягонае маўленне і артыкуляцыя выглядалі нездаровымі. Адвакатка Хамічэнкі папрасіла выклікаць у суд лекараў, якія праводзілі псіхіятрычную экспертызу абвінавачанага і могуць патлумачыць гэтыя асаблівасці падсуднага, але суд хадайніцтва адхіліў.

Андрэй Пратасеня прызнаў віну цалкам — ён некалькі разоў ударыў па драўляных загародках у дзвярах і выхапіў шчыт у міліцыянта.

Алесь Кіркевіч, які, дарэчы, адзіны даваў паказанні па-беларуску, віну не прызнаў, як і Зміцер Дрозд, які пацвердзіў, што з адчаю толькі ўдарыў мегафонам 3 разы па драўляных загародках, а пасля сышоў з прыступак Дома ўраду. Павал Вінаградаў адмовіўся даваць паказанні, і суддзя зачытала сведчанні хлопца, дадзеныя ім падчас папярэдняга следства. У адпаведнасці з імі, хлапец разбіваў шкло дзвярэй малатком. Падчас зачытвання пратаколу Вінаградаў усміхаўся, на юнаку была апранутая майка з выявай малатка.

Нагадаем, працэс над пяццю ўдзельнікамі падзеяў 19 снежня адбываецца ў судзе Кастрычніцкага раёна Мінска. Судовы працэс вядзе суддзя Ала Булаш, сумна вядомая палітычнай расправаю над Змітром Дашкевічам у 2006 годзе.

# ДВА ГАДЫ БАНДАРЭНКУ

Таццяна Шэлег

**Прысуд Зміцеру Бандарэнку — два гады пазбаўлення волі.**

Даверaную асобу экс-кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саннікава адправілі ў турму з хваробай пазваночніка і частковым паралічам правай нагі.

Суддзя Таццяна Равінская 27 красавіка прызнала яго вінаватым у парушэнні арт. 342 ч.1 Крымінальнага кодэкса. А менавіта ў арганізацыі і актыўным удзеле ў дзеяннях, якія груба парушаюць грамадскі парадак. Дзяржаўным абвінаваўцам на працэсе выступаў намеснік пракурора Першамайскага раёна Мінска Сіманоўскі.

Суддзя разгледзела справу за адзін дзень, а на наступны вынесла прысуд. Большасць тых, хто прыйшоў на разгляд справы, так і не змаглі патрапіць у залу суда. На чатырох кароткіх радах лавак ушчыльную змясціліся каля 40 чалавек. Два рады поўнасцю занялі «практыканты», якія назваліся студэнтамі юрфака БДУ. Маладых людзей адмыслова сагналі ў суд, каб як мага меней людзей патрапіла на працэс.

А хто ўсё ж змог туды прайсці, трапіў пад беспрэцэдэнтны кантроль. Наведнікам працэсу давялося двойчы прайсці праз металашукальнікі і асабісты дагляд — пры заходзе ў будынак і ў залу суда. Міліцыянты абмацвалі людзей і капітальна рыліся ў торбах. На ўваходзе ў залу стаяў апаратар у штацкім і здымаў на відэакамеру кожнага, хто прыйшоў на суд да Бандарэнкі.

Асноўныя прэтэнзіі да Зміцера зводзіліся да перашкоды руху аўтобусаў па праспекце Незалежнасці падчас акцыі 19 снежня. «Мінсктранс» ацаніў страты ад затрымкі іх руху, пакуль па праспекце адбывалася шэсце, у суму 159 тысяч 475 рублёў. Родныя Бандарэнкі перадалі суддзі квітанцыю аб аплаце гэтай сумы. І прадстаўнік «Мінсктранса» адмовіўся на судзе ад свайго іску да арганізатараў акцыі. А сведкі-кіроўцы паведамілі, што скаргаў ад мінчан наконт затрымкі транспартнага руху вечарам 19 снежня не паступала.

Зміцер Бандарэнка адзначыў, што ў Канстытуцыі гарантуецца права грамадзян на свабоду сходаў і на свабодныя выбары. «Бываюць у жыцці краіны моманты, калі і транспарт можа не пахадзіць. Бо голас народа павінны быць пачуты», — лічыць ён.



Зміцер Бандарэнка

На пытанне пра здароўе палітвязень паведаміў, што яго стан у СІЗА КДБ сур'ёзныя захворванні: падагра, язва дванаццаціперснай кішкі. Але самае галоўнае — хвароба пазваночніка, якая яшчэ да зняволення прывяла да частковага паралічу правай нагі. Зміцера напаткалі чатыры грыжы міжпазванковых дыскаў. І ён хацеў класціся на аперацыю. У палітвязня — болі ў спіне. Аднак дагляд медыцынскімі спецыялістамі яму так і не забяспечылі.

«Я яшчэ спадзяюся, што поўным інвалідам не буду», — сказаў Зміцер Бандарэнка.

# ПАЛІТЫЧНАЯ СПРАВА

Альбіна Вішнеўская

**Пра ціск следства і прапановы агаварыць кандыдатаў заявілі абвінавачаныя па справе аб «масавых беспарадках».**

27 красавіка ў Партызанскім судзе Мінска распачаўся працэс над экс-кандыдатам у прэзідэнты Андрэем Саннікавым, а таксама яшчэ чатырма маладымі ўдзельнікамі акцыі 19 снежня. Гэта Фёдар Мірзаянаў, Ілля Васілевіч, Алег Гнедчык і Уладзімір Яроменак. Справу разглядае суддзя Наталля Чацвертакова, а дзяржаўным абвінаваўцам выступае пракурор Загорскі.

Падчас суда хлопцы распавялі, як экс-кандыдатат у прэзідэнты Віталь Рымашэўскі спрабаваў спыніць біццё шкла. «Гэта правакацыя», — выкрыкваў ён. І тых, хто на гэта ішоў, адцягвалі ад дзвярэй дэманстранты. А апаратары ў штацкім у гэты час спакойна здымалі відэа.

Фёдар Мірзаянаў адзначыў, што яму прапаноўвалі даць паказанні, што кандыдаты заплацілі за ўдзел у акцыі, і прызнаць сваю віну ў «беспарадках». У гэтым выпадку Фёдара абяцалі выпусціць з СІЗА і перавесці ў статус сведкі. Аб прапановах даць паказанні супраць кандыдатаў і пагрозах даць вялікі тэрмін распавёў і Ілля Васілевіч.



Андрэй Саннікаў

«Справа носіць палітычную афарбоўку», — заявіў Андрэй Саннікаў. І сказаў, што ведае, як расправіліся на папярэдніх судах з удзельнікамі акцыі пратэсту.

Экс-кандыдат распавёў пра сваё затрыманне на плошчы 19 снежня. Калі пачаўся разгон, яго чымсьці цяжкім ударылі па назе. Ён атрымаў сур'ёзную траўму. Акрамя гэтага, яго білі дубінкай па галаве. Калі знаёмы і жонка Саннікава павезлі яго на машыне ў бальніцу, іх «падрэзала» міліцэйская машына. Экс-кандыдата выцягнулі з машыны, кінулі тварам на зямлю, збівалі нагамі. Потым павезлі на Акрэсціна, адвялі ў медпункт. Дактары сказалі, што на хуткай дапамозе яго адправяць у бальніцу. «Замест бальніцы прывезлі ў СІЗА КДБ», — адзначыў Саннікаў.

Прарывацца ў Дом ураду, паводле яго словаў, ні ён, ні іншыя кандыдаты не заклікалі. «Абсалютная лухта», — так расцаніў абвінавачанне ў пагромах экс-кандыдат. Акрамя сцягоў, як зазначыў ён, у дэманстрантаў нічога не было.

Мэта акцыі, як патлумачыў Саннікаў, была ў тым, каб паказаць, што ў Беларусі вялікая колькасць людзей хоча сумленных выбараў. І не хоча мірыцца з іх фальсіфікацыяй.

СПРАВА

# БАГАНЁЎ СУПРАЦЬ КДБ

**Адметная судовая справа была разгледжана ў Мінску: былы начальнік КДБ Фрунзенскага раёна Мінска Аляксандр Баганёў намагаўся абскардзіць рашэнне Камітэту наконт свайго статуса часова невыязнога з Беларусі.**

Рашэнне абгрунтаванае тым, што, выйшаўшы на пенсію, супрацоўнік КДБ валодае звесткамі, якія ўяўляюць сабой дзяржаўную таямніцу. «Чаму забарона на выезд з'явілася пасля трохгадовага знаходжання на пенсіі? Я за гэты перыяд аб'ехаў усю Еўропу і жыў там некаторы час. Чаму іншым пенсіянерам майго ўзроўню не абмежаваны выезд?» — задаецца пытаннем Аляксандр.

Нарэшце, па словах Баганёва, ён не валодае звесткамі, што ўяўляюць дзяржтаямніцу. І ніякіх адпаведных падпісак пра абмежаванні правоў да 2012 года не даваў. А тэрміны дзеяння ранейшых падпісак выйшлі.

«Калі ў КДБ альбо ў іншых структурах маюцца на мяне якія-небудзь матэрыялы, то прашу патлумачыць, у чым я вінаваты? Магу толькі меркаваць, што гэта вынік бяссільнасці і помсты канторы за маю патрыятычную пазіцыю. Хачу патлумачыць, што нейкай незаконнай дзейнасці я не праводжу. Выказваю, як і пераважная большасць беларусаў, што цвяроза мысляць, пэўныя незадаволенасці ўладай, таму што як патрыёту мне не абыякава тое, што адбываецца ў краіне, з якой уцякаюць самыя прагрэсіўныя і разумныя людзі, і я хачу жыць у вольнай, дэмакратычнай і адэкватнай дзяржаве, а не знаходзіцца ў атмасферы хлусні і беззаконня», — падкрэслівае Баганёў.

Невыязным Баганёва раптам зрабілі пасля ягонага выступу па тэлеканале «Белсат» у маі 2010 года, дзе ён даў каментар па гучных справах Аўтуховіча і Байковай. Між тым, яму трэба выязджаць за мяжу і па бізнэсовых справах, і каб папраўляць здароўе.

Але, скасавання статусу невыязнога Аляксандр не дамогся ані праз суд Цэнтральнага раёна Мінску, ані праз Мінскі гарадскі суд, ані праз Вярхоўны суд.

Баганёў распавёў, што надзеі на вынік суда на сваю карысць не меў: «Я прыйшоў туды, каб сказаць, і сказаў у тым ліку на пасяджэнні ў Вярхоўным судзе, што ўсім дзевяцідзецца адказваць за свае дзеянні. Нарэшце, я вырашыў прайсці ўсю працэдуру да канца, каб мець маральнае права распавесці пра ўсё гэта… 26 красавіка 1930 года былі расстраляныя мае продкі — як ворагі народа. Дарэчы, раскулачваў іх вядомы дзед Талаш, сын якога батрачыў у майго дзеда. І вось нейкага ворага народа робяць з мяне».

Паводле Руху «За Свабоду»

САЛІДАРНАСЦЬ

# ПАДТРЫМАЕМ НЕЗАЛЕЖНУЮ ПРЭСУ

**Міністэрства інфармацыі 25 красавіка падало іскавыя заявы ў Вышэйшы гаспадарчы суд аб спыненні выпуску газет «Наша Ніва» і «Народная воля».**

«За ўсю гісторыю незалежнасці Беларусі па гэткім жа сцэнары ў судовым парадку было закрыта тры выданні: «Свабода» (1997 г.), «Пагоня» (2001 г.) і «Згода» (2006 г.). Сёлета ж цягам некалькіх месяцаў Мінінфармацыі фактычна спрабуе зліквідаваць адразу тры незалежныя СМІ: акрамя «Народнай волі» і «Нашай Нівы», гэта яшчэ і «Аўтарадыё»…», — нагадвае намеснік старшыні ГА «БАЖ», юрыст Андрэй Бастунец.

Сябры БАЖ, журналісты і чытачы незалежных выданняў ужо пачалі змагацца за свае газеты. У прыватнасці, яны тэлефануюць на «гарачую лінію» міністэрства (+375 17 203 92 31), каб выказаць сваё абурэнне. А таксама запаўняюць адмысловыя формы «Пытанне — Адказ» на сайце Мінінфармацыі, патрабуючы адклікаць іскавыя заявы і афіцыйна адказаць на зварот у вызначаны законам тэрмін на паштовы адрас.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# СОРАМ НА ЎСЮ ПЛАНЕТУ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**З «закідонамі» беларускага прэзідэнта, здаецца, усе ўжо звыкліся. Ягоныя выступы расцягваюць на цытаты, некаторыя збіральнікі нават невялічкія кніжкі з ягонымі цытатамі выпускаюць. Выказванні беларускага прэзідэнта ходзяць нават у анекдотах. Але ніколі не было так сорамна за яго выказванні, як на гэтым тыдні.**



Пасол Украіны ў Беларусі Раман Бяссмертны

26 красавіка Лукашэнка падчас гутаркі з журналістамі ў Нароўлі (Гомельская вобласць) зрабіў рэзкія выказванні на адрас кіраўніцтва Украіны і Еўрасаюза. У прыватнасці, у адказ на пытанне, чаму ён не прысутнічаў ва Украіне на мерапрыемствах, прысвечаных 25-годдзю аварыі на ЧАЭС, Лукашэнка параіў звярнуцца да прэзідэнта Украіны Віктара Януковіча.

«На жаль, вашывасці хапае і ў цяперашняга кіраўніцтва Украіны. Пытанне трэба задаць Януковічу, чаму беларускі прэзідэнт не прысутнічае на іх мерапрыемствах», — сказаў Лукашэнка. Паводле яго меркавання, Кіеў пачаў «скакаць пад дудку» Брусэля ў адносінах з Беларуссю.

Адначасова Лукашэнка прайшоўся і па кіраўніцтву Еўрасаюза. «Проста нягоднікі. Таму я не жадаю гаварыць пра ўсякіх Барозу, «казлоў», «быкоў» і іншых», — заявіў Лукашэнка.

Лукашэнка перавёў пытанне санкцый у плоскасць наяўных падзей. «Хіба можна супраць краіны, якая больш за ўсё пацярпела ад чужой расхлябанасці (аварыі на ЧАЭС), весці гаворку пра тое, каб увесці нейкія санкцыі. Нам дапамагаць трэба», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь траціць велізарныя сродкі на адраджэнне пацярпелых рэгіёнаў, у тым ліку на арганізацыю бяспекі, у прыватнасці пажарнай, на гэтых тэрыторыях. «Мы толькі з бюджэту за гэтыя гады ўклалі 25 мільярдаў долараў у рэабілітацыю гэтых зямель. А палічыце, колькі пазабюджэтных? Гэта ўсе 30 мільярдаў», — дадаў прэзідэнт.

«Не факт, што калі б тут штосьці ўспыхнула, то гэта не паляцела б у паспяховую Еўропу. Дык плаціце, дапамагайце! — заявіў Лукашэнка. — Але казлы — яны і ёсць казлы. Што сёння пра іх казаць? Такі народ. Мы для іх канкурэнты. Мы — ідэалагічныя сапернікі. Мы — людзі, якія прапаведуюць іншы спосаб жыцця і паказваюць, што можна нават у такой краіне, бедная на энергарэсурсы, людзям нармальна жыць. Але ім гэта не трэба».

«Мы для іх небяспечныя, і справа не ў нейкай дыктатуры і дэмакратыі. Нам не патрэбна такая іх дэмакратыя. Калі яны хочуць мець з намі справу, то толькі паважаючы наш народ», — заключыў Лукашэнка.

Хіба ж так можна? Гэта ж — прэзідэнт краіны! Хай нехта сумняецца ў ягонай легітымнасці, але ж, нават па самых песімістычных (а для каго — аптымістычных) падліках трацина насельніцтва за яго галасавала! Яны выказалі яму свой давер. І абражаць прэзідэнта суседняй краіны, з якой у нас заўсёды былі добрыя стасункі, называць яго «вашывым» — проста непрымальна. Непрымальна і абзываць «казлом» Жазэ-Мануэля Барозу. Калі жадаеш дапамогі — паважна стаўся да таго, хто гэтую дапамогу табе прапаноўвае.

Неаднойчы Лукашэнка выказваў удзячнасць Еўропе, якая сваімі крэдытамі дапамагала Беларусі. Асабліва падчас крызісаў у адносінах з Расіяй. Раптам яны сталі «казламі». Лепш бы Лукашэнка падлічыў, колькі дзетак з забруджаных Чарнобылем рэгіёнаў прайшлі аздараўленне ў сем'ях «казлоў» з Германіі, Францыі, Італіі, Нідэрландаў і іншых еўрапейскіх краін. Ці будуць зараз гэтыя сем'і паважліва ставіцца да беларусаў, калі ім на самым высокім узроўні, на ўзроўні кіраўніка дзяржавы кажуць: «Але казлы — яны і ёсць казлы!»

Адказ сябе чакаць не прымусіў. У Міністэрстве замежных спраў Украіны абураны «беспрэцэдэнтна некарэктнымі каментарыямі» Аляксандра Лукашэнкі, гаворыцца ў паведамленні дэпартамента інфармацыйнай палітыкі ўкраінскага МЗС.

У каментарыі МЗС Украіны падкрэсліваецца, што аварыя на ЧАЭС з'яўляецца трагедыяй, якая аб'ядноўвае тры суседнія і дружалюбныя народы — украінцаў, беларусаў і расіян.

«Памяць пра ахвяр радыяцыйнай катастрофы павінна быць звяном кансалідавання для нашых краін. Менавіта з гэтых меркаванняў зыходзіў прэзідэнт Украіны Віктар Януковіч, запрашаючы сваіх калег — прэзідэнтаў Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь разам ушанаваць загінулых у выніку выбуху на ЧАЭС менавіта ў дзень, калі адбылася найбуйнейшая тэхнагенная катастрофа ў гісторыі чалавецтва. У гэтым мерапрыемстве не было і не магло быць ніякай палітыкі. У гэты дзень любыя сваркі і ўзаемныя прэтэнзіі тоесныя скокам на касцях», — гаворыцца ў каментарыі.

«Тым большае абурэнне выклікаюць беспрэцэдэнтна некарэктныя каментары прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Асабістыя абразы непрымальныя ў зносінах паміж людзьмі. Асабліва яны непрымальныя, калі абразлівыя выказванні адрасуюцца дзяржаўным дзеячам, якія выступаюць ад суверэнных краін і цэлых аб'яднанняў краін», — адзначаецца ў паведамленні МЗС.

Украінскае МЗС са шкадаваннем канстатуе, што «падыходы афіцыйнага Мінска да адносін з Еўрапейскім Саюзам, многімі іншымі ўдзельнікамі міжнароднай супольнасці ў апошнія месяцы ўсё менш адпавядаюць нормам міжнародных зносін». «Украінская дзяржава, украінскі народ непахісныя ў сваім цёплым, сяброўскім стаўленні да беларускага народа. У дзень памяці ахвяр трагедыі на ЧАЭС мы падзяляем боль нашых суседзяў, гэтак жа, як яны, не сумняваемся, падзяляюць нашу. Спадзяемся, кіраўніцтву Беларусі хопіць адказнасці перад уласнымі грамадзянамі вярнуцца да канструктыўнай палітыкі супрацоўніцтва і з Украінай, і з ЕС, якія жадаюць бачыць Рэспубліку Беларусь квітнеючай, дэмакратычнай і паспяховай», — адзначаецца ў каментарыі МЗС Украіны.

Карацей, Аляксандр Лукашэнка атрымаў славесную «аплявуху» амаль той жа манетай. Гэта ўжо яго абвінавацілі ў «скоках на касцях» і намякнулі, што трэба «вярнуцца да канструктыўнай палітыкі супрацоўніцтва і з Украінай, і з ЕС». Больш за тое, яму намякнулі, што гэта павінна быць зроблена з «адказнасці перад уласнымі грамадзянамі». Не з адказнасці перад Украінай, ЕС, а з адказнасці перад тымі, хто за яго галасаваў і хто жыве ў Беларусі. У тым ліку — у «чарнобыльскіх» рэгіёнах.

Кіраўніку дзяржавы трэба быць стрыманым у выказваннях. Усё ж — публічная асоба, а не базарная бабка.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### МАКСІМ БУЙНІЦКІ



Маладога рэжысёра з Бабруйска пакуль ведаюць хіба што ў вузкіх колах. Але гісторыя яго мала таго, што вельмі яскравая, дык яшчэ і мае налёт тэндэнцый цяперашняй Беларусі. Максім Буйніцкі атрымаў Гран-пры анлайн-кінафестывалю PutItOn Picture Show (фота, відэа). У якасці ўзнагароды малады рэжысёр атрымае стыпендыю ў памеры 5 тысяч долараў для навучання ў кінаакадэміі Нью-Ёрка. Максім Неафіт Буйніцкі перамог з гульнявой стужкай «Перашкода», якую ён стварыў па матывах твора Данііла Хармса. Раней гэты ж фільм Максіма заваяваў два Гран-пры ўкраінскага кінафестывалю «Кінолев», а таксама ўвайшоў у складанку «Українська сучасна панорама», што была прадстаўленая на «Берлінале–2011».

А цымус гісторыі вось у чым: Максім Буйніцкі з 2007 года вучыцца ў Кіеўскім нацыянальным універсітэце тэатра, кіно і тэлебачання імя Карпенка-Карага. Да гэтага ён быў студэнтам беларускай Акадэміі мастацтва, але быў выключаны за палітычны перфоманс «Дзень Волі» на Кастрычніцкай плошчы Мінска. Максім спрабаваў перапаступіць у беларускую ВНУ, але яму ясна далі зразумець, што такія там не патрэбны. За мяжой, нават яшчэ будучы студэнтам, Максім атрымаў прызнанне свайго таленту. «У БедЛАМ... то бок БелДАМ (Беларуская дзяржаўная Акадэмія мастацтваў) галоўны іспыт — «Лаяльнасць». Да выкладчыка, дэкана, рэктара, «першаснай ячэйкі» БРСМ. Галоўны ж іспыт у КНУТКіТ (Кіеўскі нацыянальны ўніверсітэт тэатра, кіно і тэлебачання) — «Творчасць», — акрэсліў розніцу ў навучальным працэсе на радзіме і за мяжой парталу babruisk.by Максім Буйніцкі.

### СЯРГЕЙ РУМАС



Старшынёй Беларускай федэрацыі футбола абраны 41-гадовы намеснік прэм'ер-міністра Сяргей Румас. Ужо былы кіраўнік федэрацыі Генадзь Нявыглас свой сыход з пасады, рашэнне не вылучацца на новы тэрмін патлумачыў тым фактам, што яго прозвішча ў неўязных у ЕС, «што не дазваляе весці паўнавартасную міжнародную дзейнасць». «Акрамя таго, я не хачу ствараць канфліктную сітуацыю ў футболе. Пэўная група людзей прадэманстравала гатоўнасць зрабіць футбол лепшым, заявіла аб гэтым на высокім узроўні і вылучыла Сяргея Румаса», — сказаў Генадзь Нявыглас. Паводле яго слоў, вынікі працы новай каманды будуць бачны вельмі хутка.

Сяргей Румас на пасадзе старшыні Беларускай федэрацыі футбола плануе ўдвая павялічыць колькасць тых, хто займаецца масавым футболам, «перш за ўсё хлапчукоў і дзяўчынак», а таксама колькасць спаборніцтваў для ўсіх аматараў футбола.

«Падняўшы масавасць заняткаў футболам, мы зможам істотным чынам падвысіць магчымасць больш якаснага адбору футбалістаў у прафесійныя клубы і нацыянальныя зборныя», — адзначыў Румас. Паводле яго слоў, неабходна ствараць рэальную канкурэнцыю ў барацьбе за права называцца прафесійным футбалістам, трэнерам, суддзёй. Румас заявіў, што адсутнасць элементарных умоў для заняткаў футболам, у тым ліку ў спецыялізаваных школах, «становіцца непераадольнай перашкодай у тактычным і тэхнічным выхаванні маладых футбалістаў.

### АНАТОЛЬ КУЛЯШОЎ



Міністр унутраных спраў Анатоль Куляшоў, выступаючы ў Палацы прадстаўнікоў, расказаў, што арганізатары выбуху ў мінскім метро 11 красавіка планавалі ўчыніць яшчэ тры выбухі, таксама ў сталіцы. Раней Аляксандр Лукашэнка ў штогадовым пасланні народу і парламенту сказаў, што «магло быць і горш», але спецслужбы своечасова выявілі гэта «горш», інакш выбухаў было б «як мінімум тры». Кіраўнік дзяржавы не прамінуў сказаць, што выбух у метро выкарыстоўвае «пятая калона», якая «енчыць, што цяпер іх задавяць». Лукашэнка заўважыў, што «нават не бачыць іх датычнасці». Тым не менш гэта не перашкаджае праводзіць вобшукі ў прадстаўнікоў апазіцыі пад маркай пошуку вінаватых і доказаў у справе выбуху.

Але вернемся да міністра Куляшова, які паведаміў, што распачаты дзве крымінальныя справы. Адна — супраць арганізатараў выбуху, другая — супраць супрацоўнікаў праваахоўных органаў, якія з-за сваёй нядбайнасці і халатнасці не прадухілілі выбух у метрапалітэне. Потым міністр прызнаў, што ў Беларусі, акрамя транспартных, «існуе дастатковая колькасць вельмі прыступных аб'ектаў. Для таго, каб зрабіць іх бяспечнымі, патрэбны дадатковыя тэхнічныя і грашовыя сродкі. За два-тры месяцы мы гэтыя пытанні не вырашым», — акрэсліў патрэбы ў дадатковым фінансаванні сілавікоў міністр.

АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# ВЯРТАННЕ АДЗІНАГА НАРОДА

Сяргей НІКАЛЮК

**Ключавыя словы Паслання–2011 — «інавацыі» і «адмарозкі». Такое спалучэнне не з'яўляецца выпадковым.**




Стратэгія–2012, распрацаваная ў Цэнтры еўрапейскай трансфармацыі Таццянай Вадалажскай і Андрэем Ягоравым, прадугледжвае пераход «ад дыялога ўнутры дэмакратычных сіл да дыялога з рэжымам». Для такога пераходу першы дыялог, прынамсі, павінен існаваць у прыродзе. За апошнія гады я неаднаразова прыкладаў намаганні адшукаць яго ўдзельнікаў, і кожны раз яны заканчваліся нічым. Мае ж асабістыя ініцыятывы ў партыйным асяроддзі заўсёды сустракалі неразуменне. Прывяду два прыклады.

Некалькі гадоў таму я прапанаваў Партыі БНФ звярнуцца да грамадства з пасланнем. Ініцыятыва караецца. Сам унёс такую прапанову, самому давялося яго і пісаць. Удзельнічаць у папярэднім абмеркаванні тэзаў паслання ахвотнікаў не знайшлося. Зразумела, што падрыхтаваны мной дакумент не мог быць апублікаваны без сур'ёзнага рэдагавання, для чаго неабходна было арганізаваць унутрыпартыйны дыялог… Думаю, каментаваць шматкроп'е не мае сэнсу.

Другі прыклад. Яшчэ да таго, як мне ўдалося азнаёміцца са Стратэгіяй–2012, я звярнуўся да кіраўніцтва роднай партыі (АГП) з прапановай абмеркаваць задачы партыі ва ўмовах, што складзіся пасля 19 снежня. Але замест шырокага дыялога атрымаліся дзве працоўныя сустрэчы «ў цесным коле абмежаваных людзей», на якіх адбыўся абмен рэплікамі.

## Пра божы дар і яечню

Пакуль прыхільнікі дзвюх узаемавыключальных стратэгій (байкоту і дыялога) спрабавалі данесці да грамадства свае аргументы, караван рэжыму вярнуўся на пракладзеную сцежку, што мудрагеліста віхляе сярод эканамічных і сацыяльных барханаў. «Большасць» і «меншасць» раскалатага беларускага грамадства, мяркуючы па тэксце паслання, знікла, нібы міраж, нездарма ж тэкст быў апублікаваны пад загалоўкам «Мы — единый народ!»

Прызнаюся, я меркаваў, што пасля таго, як «адзіны палітык» (АП) сказаў «А», афіцыйна прызнаўшы наяўнасць у беларускім грамадстве «меншасці», ён будзе змушаны сказаць і «Б». Пераход да другой літары алфавіту азначаў бы прызнанне за «меншасцю» ўласных інтарэсаў. Разважаючы па дадзенай логіцы, варта было б чакаць вымаўлення наступнай літары, ад якой рукою дастаць і да прызнання за нейкай палітычнай сілай права на выказванне інтарэсаў «меншасці», частка якога, паводле разлікаў самога АП, складае 20%.

Я не настолькі наіўны, каб паверыць у магчымасць АП прызнаць прадстаўнікоў партыйнай апазіцыі ў якасці выразнікаў інтарэсаў «меншасці». Я ўсяго толькі меркаваў, што ва ўмовах імітацыйнай дэмакратыі пытанне пра такое прадстаўніцтва будзе вырашана ў імітацыйным ключы. Былі б грошы, а са знаходжаннем палітычных акцёраў праблем не паўстане. Але я памыліўся.

Наяўнасць «адзінага палітыка» ў краіне азначае адсутнасць палітыкі як такой. Звернемся да тэксту паслання: «Считаю, что единение нации — в ее созидательной активности при построении сильного и процветающего государства, в сплоченности всех и каждого вокруг национальных ценностей и идеалов». Тая ж думка, але іншымі словамі: «У нас есть свои идеалы! У нас есть свои цели! Мы — единый народ!»

Палітыка, з пункту гледжання азбукавых паліталагічных уяўленняў, існуе ў тым ліку і для фармавання грамадскіх ідэалаў і мэт. Без дыялога тут не абысціся, таму што сучасныя грамадствы досыць складана ўладкаваныя. Аднак «построение сильного и процветающего государства» не можа выступаць у якасці канчатковай мэты палітычнага дыялога. Не варта блытаць божы дар з яечняй. Сучасная дзяржава з'яўляецца не мэтай, а ўсяго толькі сродкам. Мэта ж — асоба, нават грамадства на ролю мэты даўно ўжо не цягне.

## У катэгорыях сілавога супрацьстаяння

Там, дзе дзяржава ўспрымаецца большай часткай грамадства ў якасці мэты, няма ні сучаснай дзяржавы, ні сучаснага грамадства. Любы апанент такой дзяржавы — «отморозок» па вызначэнні. З лёгкай рукі АП, айчынных «отморозков», якія аб'ядналіся разам, сёння прынята называць «пятай калонай». Звернемся за тлумачэннем да Вікіпедыі: «Пятая калона — (ісп. Quinta columna) — назва агентуры генерала Франка, якая дзейнічала ў Іспанскай рэспубліцы падчас Грамадзянскай вайны ў Іспаніі. У шырокім сэнсе — любыя таемныя агенты ворага (дыверсанты, сабатажнікі, шпіёны, правакатары, тэрарысты, агенты ўплыву)».

Аўтарства тэрміна «пятая калона» належыць франкісцкаму генералу Эміліа Мале. Наступаючы на Мадрыд, ён перадаў па радыё зварот да насельніцтва, у якім заявіў, што апроч чатырох армейскіх калон ён мае ў самой сталіцы яшчэ пятую калону, здольную ў вырашальны момант стукнуць з тылу.

Прыхільнікам Стратэгіі–2012 неабходна памятаць, што дзяржава-мэта з унутранымі апанентамі ў дыялог не ўступае. Такую дзяржаву не варта блытаць з еўрапейскім state, пазашлюбным дзіцём Рэнесансу, рэфармацыі і асветніцтва. State нараджаўся ў пакутах і ў дыялогу (у пакутах дыялогу), на які змушаны былі пайсці супрацьлеглыя бакі пасля завяршэння рэлігійных войнаў, што спусташалі Еўропу на працягу 150 гадоў.

Дзяржава-мэта — законнае дзіцё мілітарызацыі (выбудоўванне мірнага жыцця на ваенны ўзор). На сваім класічным этапе развіцця яно патрабавала поўнага падначалення інтарэсаў асобы інтарэсам Улады, што на практыцы рэалізоўвалася ў выглядзе прыгоннага права. Беларуская кантрактная сістэма — яго сучасны аналаг. Ад іншага атрыбуту прыгоннага права — прапіскі — рэспубліка пазбавілася толькі ў студзені 2008 года. Будаўніцтва мірнага жыцця на ваенны лад немагчыма без канцэнтрацыі рэсурсаў у руках дзяржавы. Абабраўшы першапачаткова падданых да ніткі, дзяржава атрымлівае магчымасць выступіць у ролі дабрадзея, раздаючы «па справядлівасці» тое, што ёй не належыць.

Народжаная для вайны, дзяржава-мэта і сёння здольная ацэньваць унутраныя і вонкавыя працэсы выключна ў катэгорыях сілавога супрацьстаяння. У якасці прыкладу прывяду другі абзац паслання: «Анализируя произошедшее, конец прошлого года, начало этого, приходишь к выводу, что наше молодое суверенное государство, которое проводит самостоятельную внешнюю и внутреннюю политику, хотят «нагнуть», заставить плясать под чужую дудку. Беларусь подвергается массированному давлению. Сначала политические угрозы — неприятие результатов последней президентской кампании, списки невыездных, экономические санкции. Затем раздувание ажиотажа и паники на валютном и потребительском рынках с подачи разных «тутэйшых» и зарубежных «аналитиков». Потом «пляска на костях» в связи с событиями на станции метро «Октябрьская».

## Што ў сухой рэшце?

Створаная для вайны, дзяржава-мэта не здольная функцыянаваць ва ўмовах міру. За прыкладам далёка хадзіць не трэба, досыць успомніць сумны фінал, што напаткаў «Союз нерушимый республик свободных». Са страшнай вайны, страціўшы каля 30 мільёнаў сваіх грамадзян, ён выйшаў у статусе Вялікай дзяржавы. Ва ўмовах «халоднай вайны» ён першым запусціў чалавека ў космас, але распаўся ад марных спроб выканаць чарговую харчовую праграму.

Мірныя мэты адрозніваюцца ад мэтаў вайскоўцаў. Яны вызначаюцца на падставе іншых каштоўнасцяў і дасягаюцца іншымі сродкамі. Культуролагі любяць апераваць паняццем «ментальнасць». Калі культуру разумець як пазабіялагічны пакет праграм чалавечай дзейнасці, то ментальнасць адказвае за структураванне гэтага пакету. З яе дапамогай ажыццяўляецца выбар і камбінаванне пэўных праграм у зададзеных сітуацыях (ментальнасць — гэта тое, як мы думаем, а не тое, што мы думаем).

Адсюль зразумелая праблема чалавека, які сутыкнуўся з зусім новай для сябе сітуацыяй. Вельмі часта немагчымасць абраць з «запасніка» адпаведную праграму прыводзіць да млоснасці і ванітаў. Кожны, хто азнаёміўся з тэкстам паслання, хутчэй за ўсё, звярнуў увагу на наступны эмацыйны фрагмент: «Накануне президентских выборов (помните, я уже говорил) мы додемократизировались до того, что не только вас, но и меня, человека, принимающего решения в этой части, подташнивало уже. Ну уже столько было «демократии» (в кавычках), что просто тошнило...»

Усё правільна, ад «демократии» (в кавычках), якая нечакана звалілася падчас выбарчай кампаніі на нашы непадрыхтаваныя галовы, ванітавала шмат маіх знаёмых.

Чалавек — не кампутар, сфармаваную ў дзяцінстве і юнацтве ментальнасць перазагрузіць не надта проста. Памятаеце абвешчаную яшчэ Леніным і з поспехам рэалізаваную на практыцы Сталінам тэорыю пра ўзмацненне класавай барацьбы падчас будаўніцтва сацыялізму ў асобна ўзятай краіне? Нешта падобнае мы зараз і назіраем. Для гэтага размешчаную ў геаграфічным цэнтры Еўропы рэспубліку давялося для пачаткуператварыць у «асобна ўзятую краіну». На сённяшні дзень рашэнне гэтай задачы ў цэлым завершана, нягледзячы на тое, што «нас хотят заставить быть такими, как все вокруг нас, как они, в конце концов».

А зараз крыху статыстыкі: слова «адмарозак» у пасланні 2002 года было згадана адзін раз. У тэкст паслання 2006-га яно не патрапіла, мабыць, выпадкова. Затое сёння мы назіраем колькасны скачок — шэсць згадванняў!

Сталіну «пятая калона» была патрэбна для згуртавання грамадства. Ён, як адзначыў у свой час Чэрчыль, «прыняў Расію з сахой, а пакінуў з атамнай бомбай». У сялянскай краіне правесці ў сціслы тэрмін індустрыяльную мадэрнізацыю было магчыма, толькі ламаючы патрыярхальнае грамадства праз калена. Сёння Беларусь мае патрэбу ў мадэрнізацыі, але гэтым разам у постіндустрыяльнай. Таму «адмарозкі» ў тэксце дакладу чаргуюцца з «інавацыямі» (дзевяць згадванняў), і гэта арыгінальная сумесь густа заправлена дысцыплінай. Менавіта дысцыпліна дазволіць беларусам («русским со знаком качества») выкараніць «расхлябанность, нерасторопность, медлительность, боязнь принятия решений, бесхозяйственность».

Што мы атрымаем у сухой дысцыплінарнай рэшце? Мы атрымаем «решительный выход страны на уровень передовых европейских держав»! Адзіны народ для выканання надзвычай маштабнай працы ёсць. Раскол, што намеціўся ў канцы снежня, за першы квартал 2011 года ліквідаваны.

ФАКТЫ

# ЯК КОШТЫ ГРЫЗУЦЬ ЗАРОБКІ

Канстанцін СКУРАТОВІЧ

**Плюралізм меркаванняў — рэч карысная для дэмакратыі, а для рэальнай ацэнкі сітуацыі патрэбны факты. Таму пачнём са статыстыкі.**



Прынамсі, возьмем паказчыкі знешняга гандлю. У студзені тут была вельмі непрыемная сітуацыя. Розніца паміж вартасцю экспарту і імпарту (сальда) склалася адмоўная, у памеры 903 мільёны долараў.

Магчыма, студзень — месяц нетыповы. Як калісьці казаў эканамічны дарадца Ельцына Аляксандр Ліўшыц, у студзені эканоміка спіць разам з грамадзянамі. Але люты толькі дадаў негатыву ў наша паступовае эканамічнае развіццё. Хоць па выніках двух месяцаў памер знешнегандлёвага таваразвароту павысіўся да 10,7 мільярда долараў (на 44% у параўнанні са студзенем-лютым 2010 года), памер экспарту павысіўся на 26%, а імпарт падскочыў аж на 61%. Адпаведна, склалася адмоўнае сальда блізу 2 мільярдаў долараў, што ў чатыры разы болей, чым было на такі перыяд мінулага года.

Гэта факт, на якім можна будаваць любыя інтэрпрэтацыі і даваць ацэнкі.

Невядома, як склалася сітуацыя ў сакавіку (статыстыка знешняга гандлю публікуецца з адставаннем на месяц), але амаль поўнае знікненне наяўнай валюты з абменнікаў можна лічыць фактам, які сведчыць аб далейшым пагаршэнні знешнегандлёвых перспектыў беларускай эканомікі.

Чым больш мы прадаём, тым меней атрымоўваем. Тады навошта ўвесь гэты тлум? Ужо і Мясніковіч казаў, што нельга дапускаць такой перавагі ў тэмпах росту імпарту над экспартам, а ніхто не слухае.

З іншага боку, дэфіцыт наяўнай валюты ў абменных пунктах ставіць пад сумнеў карэктнасць доларавага пераліку заробкаў па афіцыйнаму курсу, а актыўнае падвышэнне спажывецкіх коштаў змушае да крытычнай ацэнкі паказчыкаў падвышэння рэальных грашовых даходаў насельніцтва.

Таму больш-менш дакладнымі можна лічыць толькі паказчыкі падвышэння намінальных заробкаў. Аднак і тут імклівыя тэмпы, нашмат большыя, чым у вытворчасці ВУП, сведчаць аб непазбежнасці страты рэальнай вартасці не толькі заробкаў, але і ўсіх іншых грашовых здабыткаў.

Зразумела, гэта версія, але яна мае ўсе прыкметы навуковага факта. Можа, дзе і было інакш, але аб гэтым ніхто дакладна не ведае.

Карацей, у краіне няма грошай, і яны не хутка з'явяцца. Нават з улікам расійскіх і «еўразійскіх» крэдытаў, калі яны будуць атрыманы, нават з улікам магчымых набыткаў ад прыватызацыі, калі яна адбудзецца, урад Беларусі не атрымае магчымасцяў для манеўра. Бо ўзятае ў крэдыт і атрыманае ад продажу капіталу, створанага ў мінулым, давядзецца аддаць на абслугоўванне выдаткаў па ранейшых пазыках, на падтрыманне бягучых фінансавых патрэб. Увогуле, ад прыватызацыі ні адна краіна з так званай пераходнай эканомікай не атрымала вялікіх набыткаў.

Галоўны плён ад яе быў адкладзены да таго моманту, пакуль інвестары не справяцца з адаптацыяй набытых вытворчасцяў да рэальных патрабаванняў спажыўцоў. Прыкладам, асноўным гарадскім, міжгародні і міжнародным аўтобусам у СССР і краінах сацлагеру быў венгерскі «ікарус». Лепшы з тых, што мы ведалі. І дзе ён зараз? Вытворчасць спынена з нагоды поўнай неканкурэнтаздольнасці ў параўнанні з аўтобусамі вядучых сусветных вытворцаў.

Нам жа даводзяць, што, прыкладам, БелАЗ мае дваццаць, МАЗ — дваццаць пяць, а МТЗ — сорак працэнтаў сусветнага рынка. А «Беларуськалій», як на днях зазначыў Лукашэнка, здольны завалодаць ці не паловай сусветнага рынка мінеральных угнаенняў. То бок стаць сапраўдным манапалістам, ад настрою якога залежыць не што іншае, як некалькі мільярдаў людзей. І, мабыць, таму прыватызацыя гэтых прадпрыемстваў (увогуле, продаж за мяжу) павінна даць Беларусі многа грошай.

З гэтай нагоды ўзнікае даволі бязглуздае пытанне: чаму ж зараз, калі гэтымі прадпрыемствамі валодае дзяржава, яны не даюць краіне велізэзных прыбыткаў? Ці не таму, што нашы эксперты ёмістасць рынкаў падлічваюць у адзінках прададзеных трактароў або калёсных цягачоў, а астатнія — у фунтах, еўра і доларах. І пры такім пераліку аказваецца, што сапраўдныя набыткі беларускіх прамысловых гігантаў саступаюць у памеры ганарарам не надта вялікіх футбольных «зорак». Мусіць, нейкі перадавы айчынны завод за год зарабляе болей, чым Аляксандр Глеб, але меней, чым Кака.

Увогуле, многае залежыць ад мовы. Не ў сэнсе, што яны размаўляюць на англійскай або нямецкай, а нашы — на дзяржаўнай трасянцы. Справа ў тым, які, у дадзеным выпадку, эканамічны сэнс укладваецца ў словы. Для нашых тады ўсё добра, калі з фабрычні комінаў дым ідзе. Астатні свет пры гэтым яшчэ лічыць прыбыткі.

На жаль, факты сведчыць, што валюты ў Беларусі няма, і ў блізкім часе не будзе. Таму, у каго ёсць колькі долараў, еўра ці юаняў, можна прыхаваць іх на нейкі тэрмін. Да таго часу, пакуль велічэзная сума наяўных беларускіх грошай, што ходзіць па руках у насельніцтва, не будзе адаптавана да коштаў тавараў на спажывецкім рынку.

Калі ў крамах грэчка каштуе ў чатыры разы болей за рыс, гэта наводзіць на роздум. Можна меркаваць, што хутка на грэчку кошты знізяцца, а на рыс — павысяцца. Але раўнавага ўсталюецца на ўзроўні бліжэй да сённяшняга кошту грэчкі, чым да кошту рыса.

Мусіць, з гэтай нагоды Лукашэнка, відавочна раз'юшаны сітуацыяй у краіне, стан рэчаў на спажывецкі рынку вызначыў з неўласцівай для сябе далікатнасцю. Маўляў, крызіс з харчовымі таварамі справакавала само насельніцтва. Цалкам можна пагадзіцца. Бо насельніцтва свядома і падсвядома лічыць, што валютныя курсы і спажывецкія кошты наўпрост залежаць ад прэзідэнта. А яму апошнім часам веры няма. Бо, як казаў некалі камедыйны Папандопула, у яго «няма залатога запасу». Вядома ж, крышку ёсць, але толькі на пільныя патрэбы. Да іх насельніцтва ў нас традыцыйна не мае ніякага дачынення.

Тыя ж крупы традыцыйна лічыліся ці не самай кансерватыўнай у адносінах да інфляцыі групай тавараў. Але за першы квартал яны падаражэлі на 17,6%, а ў параўнанні з І кварталам мінулага года — у 1,54 разы.

Суадносна з І кварталам 2010 года, харчовыя тавары агульна падаражэлі на 16,2 %, але малако і малочныя прадукты — на 18,4%, сыры — на 22,8%, масла жывёльнае — на 38,6%, алей — на 39,1%, цукар — на 29,2%, кандытарскія вырабы — на 18%, бульба — на 73%, садавіна і гародніна — на 23–26%.

Не нашмат ад агульнага ўзроўню адсталі ў росце кошты на мяса і птушку, кілбасныя вырабы.

Інакш кажучы, у выніку інфляцыйнай адаптацыі пакупніцкая здольнасць заробкаў перш-наперш памяншаецца адносна прадуктаў масавага спажывання, якія складаюць аснову спажывецкага кошыка. Працэс пачаўся і ідзе. Да 12 красавіка суадносна з сакавіцкімі коштамі яйкі курыныя падаражэлі на 2,7%, рыба марожаная — на 4,1%, алей (зноў!) — на 9,4%. Адчувальна падвысіліся кошты на бульбу і гародніну.

Адпаведныя змены адбыліся ў сферы паслуг, асабліва жыллёва-камунальных. Дадалі да малюнку свае фарбы транспартнікі, падвысіўшы тарыфы на праезд у гарадскім і прыгарадным транспарце. Дзякуючы гэтаму згубіла эканамічны змест занятасць многіх малакваліфікаваных работнікаў, так званых маятнікавых мігрантаў. Нашто працаваць, калі за праезд даводзіцца аддаваць да чвэрці заробку.

Узнікае пытанне — чаму? Адказаць на яго дастаткова складана. Таму спашлюся на словы аднаго адметнага палітыка, які лічыў, што інфляцыя не расце на дрэвах. Яна ёсць вынікам дзейнасці дурняў.

ПРАБЛЕМА

# АЛКАГОЛІКІ НЕ БУДУЦЬ БАЦЬКАМІ

Вольга ХВОІН

**Міністэрства аховы здароўя разглядае магчымасць прадстаўлення бясплатных сродкаў кантрацэпцыі беларускім жанчынам, хворым на алкагалізм.**



Галоўны нарколаг Беларусі Аляксей Аляксандраў патлумачыў «EJ: Здароўе», што ў краіне ў апошні час часта ўзнікаюць сітуацыі, калі жанчыны, якія злоўжываюць алкаголем, нараджаюць дзяцей, а потым адмаўляюцца ад іх. Не рэдкія выпадкі сярод такога кантынгенту і грэблівых адносінаў да бацькоўскіх абавязкаў. «Каб пазбегнуць такіх сітуацый, неабходна правільнае рэпрадуктыўнае планаванне жыцця жанчыны», — сказаў Аляксандраў.

Ён прывёў прыклады іншых краін свету, калі жанчынам, хворым на алкагалізм, аказваюць дапамогу ў прадухіленні непажаданай цяжарнасці. Яны могуць бясплатна атрымаць падрабязныя кансультацыі спецыялістаў у гэтай сферы, а таксама эфектыўныя сродкі кантрацэпцыі.

Па словах Аляксандрава, жанчына, схільная да ўжывання алкаголю, мае больш высокую рызыку ў стане неабароненага сэксу набыць непажаданую цяжарнасць. Як правіла, такія жанчыны часцей за іншых заражаюцца інфекцыямі, якія перадаюцца палавым шляхам. А іх наяўнасць можа самым негатыўным чынам уплываць на здароўе будучых дзяцей. Да якіх цяжкіх наступстваў для здароўя дзяцей вядзе і ўжыванне спіртнога падчас цяжарнасці.

Сістэматычная прафілактычная работа сярод такіх жанчын дазваляе скараціць колькасць непажаданых цяжарнасцяў, абортаў, адмоваў ад дзяцей. Як паказвае замежны досвед, самі яны ахвотна ідуць насустрач медыкам, калі разумеюць, што могуць атрымаць просты і даступны спосаб пазбавіцца ад многіх праблем. Па словах галоўнага нарколага, такая практыка можа быць уведзена і ў Беларусі. «Такія планы цяпер сур'ёзна абмяркоўваюцца на ўзроўні Міністэрства аховы здароўя», — паведаміў галоўны нарколаг краіны Аляксей Аляксандраў. Ён падкрэсліў, што размова ідзе толькі аб добраахвотным планаванні сям'і жанчынамі-алкаголікамі.

Сярод 180000 жыхароў Беларусі, якія пакутуюць на алкагалізм, каля 33 тысяч жанчын. За апошнія пяць гадоў колькасць выяўленых выпадкаў алкагалізму сярод жанчын вырасла больш чым на 36 працэнтаў.

Варта нагадаць, што ад 1994 года ў Беларусі назіраецца паніжэння паказчыкаў нараджальнасці. За апошнія 13 гадоў жыхароў Беларусі стала менш на 700 з лішнім тысяч. Калі ў 1998 годзе ў краіне пражывала 10 мільёнаў 203,8 тысячы чалавек, то на 1 студзеня 2011 года гэты паказчык знізіўся да 9 мільёнаў 481,1 тысячы чалавек. Па прагнозах дэмографаў, насельніцтва Беларусі будзе памяншацца і далей. Да 2050 года яно скароціцца да 7 мільёнаў чалавек.

КАТАСТРОФА

# ЭФЕКТЫ АВАРЫІ

Вольга ХВОІН

**Навукоўцы упэўненыя, што вынікі ўплыву апраменьвання на здароўе людзей будуць праяўляцца яшчэ не адно пакаленне. Уздзеянне радыяцыі на жывыя арганізмы выклікае змены на генны узроўні.**



### Хваробаў у разы больш

«Мы толькі пачынаем, а не заканчваем назіраць наступствы аварыі на ЧАЭС», — заявіў загадчык кафедры радыяцыйнай гігіены і эпідэміялогіі Міжнароднага ўніверсітэта імя Сахарава прафесар Аляксей Акіянаў на канферэнцыі, прысвечанай 25-годдзю аварыі на ЧАЭС.

Медыкі прыводзяць звесткі, што ва Украіне 70 працэнтаў дзяцей, якія атрымалі апраменьванне, лічацца хворымі. Цягам апошніх двух дзесяцігоддзяў сталі больш частымі спадчынныя хваробы, узрасла колькасць хворых на дыябет, паражэнні мозга, няракавыя захворванні шчытападобнай залозы. Асабліва гэта тычыцца ліквідатараў — адбываецца хуткае старэнне клетак, людзі паміраюць на 10 гадоў раней, старэюць і зношваюцца сасуды, што вядзе да хваробаў сэрца, паражэнняў ЦНС. Трэба даследаваць не толькі ракавыя захворванні, навукоўцы мусяць мець доступ да ўсіх звестак, у тым ліку і да тых, што знаходзяцца ў сакрэтных архівах. Дапамогу і даследаванні нельга аддзяляць, — канстатуюць навукоўцы.

Прафесар Аляксей Акіянаў звяртае ўвагу на той факт, што моцна павялічылася колькасць пухлін скуры, мочапалавой сістэмы, шчытападобнай залозы. «Цяпер дыягнастуецца ў 12 разоў больш злаякасных новаўтварэнняў, лейкозаў, асабліва гэта тычыцца ліквідатараў-мужчын. Навуковец гаворыць, што сапраўдных доз апраменьвання, атрыманых насельніцтвам, ліквідатарамі ніхто не ведае. У цывільных людзей радыедазіметрычных прыбораў не было ўвогуле, а ліквідатары ў большасці мелі адзін дазіметр на групу, які знаходзіўся ў брыгадзіра.

«Калі лейкіміі ўзнікалі праз 5–7 гадоў пасля бамбардзіроўкі Хірасімы і Нагасакі, то іншыя злаякасныя ўтварэнні праяўляліся нават праз сорак гадоў. Гэта гаворыць аб тым, што высновы, зробленыя міжнароднымі арганізацыямі на дваццацігоддзе Чарнобыля, уключалі ў сябе звесткі на 15–17 год пасля выбуху. І саматычных эфектаў проста яшчэ не было. Таму трэба сказаць, што эфекты Чарнобыля мы толькі пачынаем назіраць. А не заканчваецца гэтая праблема праз 25 гадоў пасля аварыі, як некаторыя любяць падводзіць вынік: усё прайшло, завяршылася, нічога больш няма, і далей можна жыць спакойна», — падкрэслівае Акіянаў.

### Граблі чакаюць

«Толькі малая частка Беларусі не атрымала моцнага ўдару радыеактыўным ёдам. Праз чатыры гады пасля аварыі ў краіне з'явіліся першыя выпадкі рака шчытападобнай залозы. Была вялікая дыскусія на гэтую тэму, і нашы суседзі з Украіны і Расіі на той момант сказалі «як жа так, у вас ёсць усплёск рака шчытападобнай залозы, а ў нас няма, няўжо гэты рак адрозніваe межы?». Але праз некалькі гадоў падобныя выпадкі з'явіліся і ў іх, проста апраменьванне мела меншыя маштабы, — расказвае навуковец. — Беларусь — зона, дзе прыроднага ёду мала. На час аварыі людзі мелі недахоп ёду ў арганізме. Шчытавідка жадна хапае ўвесь ёд, які ёсць. Таму накапленне радыеактыўнага ёду ў беларусаў было вялікім. Ёдная прафілактыка праводзілася праз 12 дзён пасля аварыі, а мусіла ДА ГЭТАГА. Бо праз некалькі гадзін пасля апраменьвання ёдная прафілактыка ўжо нічога не дасць». Акіянаў гаворыць, што тое ж самае цяпер адбываецца ў Японіі пасля аварыі на АЭС «Фукусіма». «Чалавецтва нарадзілася з хобі хадзіць і наступаць на тыя ж граблі», — рэзюмуе прафесар Сахараўскага ўніверсітэта.

Беларусы працягваюць атрымліваць радыяцыйнае апраменьванне — як знешняе, так і ўнутранае. Асноўную пагрозу тояць прыватныя гаспадаркі, а таксама прадукты лесу — грыбы, ягады, дзічына. Радыенукліды на тэрыторыю Беларусі спачатку знаходзіліся ў паверхневых слаях глебы, цяпер заглыбленне адбылося максімум на 30–35 сантыметраў. Падчас сельскагаспадарчых работ радыенукліды з глыбіні 30–35 сантыметраў паднімаюцца наверх, з пылам разносяцца па тэрыторыі краіны. Гэтым паветрам дыхаюць усе жыхары краіны.

### «Падарунак» нашчадкам

Самае страшнае, што радыяцыя накопліваецца ў генетычнай сістэме. І калі вялікія дозы апраменьвання адразу пашкоджваюць мноства клетак, выклікаючы хваробы, то малыя дозы накопліваюцца, што праяўляецца з часам, вядзе да зменаў у генетычнай сістэме.

— Уся тэрыторыя Еўропы забруджаная чарнобыльскімі выпадамі. Уся тэрыторыя Беларусі забруджаная выпадамі, вышэйшымі за натуральны фон, але афіцыйна прызнана забруджанымі 23% тэрыторыі краіны, дзе пражывае прыкладна 1,5 мільёна насельніцтва, — падкрэслівае загадчыца лабараторыі генетычнай бяспекі Інстытута генетыкі і цыталогіі НАН Беларусі, прафесар Роза Ганчарова.

«За гэтыя 25 гадоў былі доказаныя генетычныя эфекты нізкіх дозаў апраменьвання для млекакормячых і чалавека. Выяўленыя і даказаныя новыя радыяцыйныя індукаваныя эфекты. Яны ўключаюць геномную нестабільнасць, байстэнд-эфект (эфект сведкі), транскрыпцыйны адказ і іншае. Мы мелі магчымасць вывучаць генетычныя пашкоджанні ў жывёл на працягу некалькіх год. Назіранні паказалі, што ўзровень цытагенетычнай пашкоджанасці і эмбрыянальнай смяротнасці істотна павялічваўся і адрозніваўся ад таго, што было да Чарнобыля», — гаворыць навуковец.

Апраменьванне нізкімі дозамі ўплывае на нестабільнасць геномаў наступных пакаленняў, у выніку жывёлы наступных пакаленняў больш адчувальныя да нізкіх доз радыяцыі. Назіраліся нашчадкі цяжарных самак жывёл з забруджаных зон, якіх вырасцілі ў лабараторных, то бок чыстых умовах, але і яны мелі такі ж узровень пашкоджанняў, як і іх бацькі. Прафесар Ганчарова папярэджвае, што атрыманыя дадзеныя могуць з пэўнай перасцярогай выкарыстоўвацца і для ацэнкі рызыкі генетычных адхіленняў у чалавека. «Нестабільнасць генома — гэта новы радыяцыйна індукаваны эфект. Мы можам чакаць, што ў людзей, якія жывуць на забруджаных радыяцыяй тэрыторыях, таксама можа ўзнікаць нестабільнасць генома. Для вывучэння гэтай з'явы патрэбная ДНК-дыягностыка. Людзі, якія маюць павышаную адчувальнасць, напрыклад, да акісляльнага тэста, парушэнні ў рэпарацыі ДНК, маюць парушэнні ў генах, што задзейнічаныя ў ахоўных сістэмах арганізма і будуць складаць групу генетычнай рызыкі», — рэзюмуе Роза Ганчарова. Яна зазначае, што людзі, якія атрымалі хранічнае апраменьванне ў Чарнобылі, таксама маюць змененую экспрэсію генаў, і ўсе дактары разумеюць, што гэта можа тым ці іншым чынам уплываць на стан здароўя як цяпер, так і ў будучым.

Па словах прафесара Ганчаровай, цяпер шукаюцца сродкі для правядзення далейшых даследавання.

ЗДАРОЎЕ

# СЭРЦА ЛЕЧАЦЬ АПРАМЕНЬВАННЕМ

Вольга ХВОІН

**Сардэчна-сасудзістыя захворванні — галоўная прычына смерці і інваліднасці сярод насельніцтва як развітых краін, так і краін постсавецкай прасторы. Навукоўцы шукаюць магчымасці для карэкціроўкі наступстваў радыяцыйнага апраменьвання для сардэчна-сасудзістай сістэмы.**



У Беларусі з 2006 па 2008 год адзначаўся паступовы рост хваробаў сістэмы кровазвароту, якія займалі ў структуры агульнай смяротнасці 52,6%. Супрацоўніца Міжнароднага ўніверсітэта імя Сахарава Клаўдзія Буланава ў ліку навукоўцаў, якія вывучаюць уплыў апраменьвання на малекулярным узроўні. Яна падкрэслівае, што праблема захворванняў сардэчна-сасудзістай сістэмы была тыповай і да Чарнобыля, але «пасля аварыі яна, канешне, абвастрылася». Да слова: Клаўдзія Буланава — маці Дзмітрыя Буланава, якія з'яўляецца адным з фігурантаў справы «аб масавых беспарадках» 19 снежня мінулага года. Хлопец не належыць да палітычных рухаў, партый, але пасля «сутак» за ўдзел у мітынгу на плошчы Незалежнасці яго затрымалі і змясцілі ў следчы ізалятар №1 на вуліцы Валадарскага. Матэрыял пра сям'ю навукоўца «Музыка за кратамі» можна прачытаць у папярэднім нумары за 22 красавіка.

«Наша лабараторыя працавала над тым, як уплывае на сэрца і сасуды іанізуючая радыяцыя, — расказвае Клаўдыя Буланава пра сутнасць доследаў. — Было выяўлена, што з павелічэннем дозы апраменьвання ад аднаго да трох грэй функцыянальныя змены ў міякардзе становяцца больш устойлівымі, вядуць да фармавання сіндрому нейрацыркулярнай дыстаніі. Варта адзначыць, што выкліканыя радыяцыяй перадпаталагічныя станы сардэчна-сасудзістай сістэмы вызначаюцца ў значнай ступені недастатковай эфектыўнасцю рэгулятарных механізмаў. Больш высокія дозы апраменьвання былі здольныя выклікаць паражэнне структур і дэгенерацыю міякарда».

Тэарэтычныя і эксперыментальныя даследаванні, праведзеныя за апошнія гады на клеткавым і малекулярным, а таксама арганным узроўнях, прывялі да з'яўлення новага метаду фізіятэрапіі. Ён заснаваны на выкарыстанні электрамагнітнага выпраменьвання міліметровага дыяпазону — КВЧ-тэрапія. Метад прымяняецца ў клініцы для лячэння самых разнастайных захворванняў, у тым ліку і сардэчна-сасудзістай паталогіі. Напрыклад, КВЧ-выпраменьванне аднаўляе парушэнні агрэгацыйнай здольнасці трамбацытаў пасля апраменьвання. «Тое, што некаторыя эфекты апраменьвання радыяцыяй магчыма карэктаваць, на маю думку, — дасягненне. Бо сітуацыя атрымліваецца не настолькі безнадзейная: маўляў, мы ўсе будзем гінуць», — зазначае супрацоўніца Міжнароднага ўніверсітэта імя Сахарава Клаўдзія Буланава.

Навуковец не адмаўляе таго, што апраменьванне радыяцыяй выклікае змены ў геномных сістэмах. Але таксама мяркуе, што не варта драматызаваць сітуацыю. «На адной з канферэнцый была агучаная інфармацыя па Смаленскаму раёну: там таксама выпалі радыеактыўныя асадкі. У многіх дзяцей была пашкоджаная шчытападобная залоза, у 15 гадоў у падлеткавым узросце шчытападобная залоза пачынае актыўна развівацца, і ёд даў найбольшае паражэнне. Калі гэтым дзяўчатам стала 25 гадоў, то ўжо ў многіх іх дзяцей былі выяўленыя паталогіі шчытападобнай залозы. Складана ўявіць, што на генетычным узроўні быў парушаны гэты ген. Відаць, тут уключыліся іншыя механізмы, што ўплываюць на спадчыннасць гэтай паталогіі», — лічыць Клаўдзія Буланава.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 2 ТРАЎНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**07.15** Мультфільмы.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00** Навіны.
**09.10** Канцэрт ансамбля «Пясняры».
**10.50** Камедыйны серыял «Сваты-4 « (Украіна).
**12.00** Навіны.
**12.10** «Прынцэса цырку». Музычная камедыя (СССР). 1-я і 2-я серыі.
**15.00** Навіны.
**15.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Сінематэка».
**16.15** «Май». Меладрама (Расія).
**18.10** «Арэна». Праграма аб спорце.
**18.30** «Акно ў Еўропу». Інфармацыйная праграма.
**19.00** Навіны.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Нацыянальны адборачны тур «Новая хваля- 2011» і «Дзіцячая Новая хваля -2011». Гала-канцэрт. Абранае. Частка 2-я.
**20.30** «Панарама».
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Латвія - Фінляндыя. Прамая трансляцыя.
**23.30** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**00.00** Прэм'ера. «Толькі не зараз». Меладрама (Расія-Польшча).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** Контуры.
**10.10** Камедыя «Белыя росы».
**12.00** Тэлечасопіс «Саюз».
**12.30** «Вялікая розніца» у Адэсе. Фэст пародый.
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Толькі ты…». Канцэрт Стаса Міхайлава.
**18.00** «Зваротны адлік».
**18.35** Фільм «У краіне жанчын». ЗША, 2007 год.
**20.30** Нашы навіны.
**20.55** Навіны спорту.
**21.00** Здабыткі Рэспублікі».
**23.25** Фільм «Мадзільяні». ЗША, 2004 год.

### СТВ

**05.45** «Званая вячэра».
**06.35** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.15** Фільм «Чалавек - амфібія». СССР, 1961 г.
**12.05** «Зорны рынг».
**13.25** Фільм «Трое ў лодцы не лічачы сабакі». СССР, 1979 г.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Наша справа».
**16.50** «Званая вячэра».
**17.45** Фільм «Не хачу жаніцца!». Расія, 1994 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Добры вечар, маляня».
**20.20** Фільм «Мяжа. Тайговы раман». Расія, 2000 г.
**22.50** «Сталічны футбол».
**23.20** Фільм «Паміж анёлам і нячысцікам». Францыя, 1995 г.

### ЛАД

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Трансляцыя беатыфікацыі Папы Рымскага.
**10.35** Пра мастацтва.
**11.10** Камедыйная меладрама «Тэрмінал» (ЗША).
**13.30** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.35** Баявік «Замах» (Беларусь). 5-я і 6-я серыі.
**16.25** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**17.30** «Навіны надвор'я».
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**19.05** Шпіёнская камедыя «Чалавек, які занадта мала ведаў» (ЗША-Германія).
**20.50** Тэлебарометр.
**20.55** Вечар з Максімам Галкіным (Расія).
**00.15** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.

### РОССИЯ

**07.00** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**07.20** Фільм «Выйсці замуж за капітана».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Пакой смеху».
**10.35** «Ранішняя пошта».
**11.10** Фільм «Калі квітнее бэз». 2010 г.
**12.55** Вясновы канцэрт «Дыска Дача».
**14.00** Весткі.
**14.20** Вясновы канцэрт «Дыска Дача». Працяг.
**15.25** Фільм «Кропля святла». 2009 г.
**18.20** Прэм'ера. «Жарты ў бок». Канцэрт. Частка 1-я.
**20.00** Весткі.
**20.25** Тэлесерыял «Заяц, смажаны па-берлінску». 2011 г.
**22.20** Вострасюжэтны тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**23.40** Камедыя «Бацькі і дзяды».

### НТВ

**07.15** «І зноў добры дзень!».
**08.10** Камедыя «Прэзідэнт і яго ўнучка».
**10.00** Сёння.
**10.20** Вострасюжэтны серыял «Мядзведжы кут».
**19.00** Сёння.
**19.30** Вострасюжэтны серыял «Мядзведжы кут».
**23.10** «Суперстар» прадстаўляе: «Чарадзейны баль Сяргея Пенкіна».

### EUROSPORT

**09.30** Матаспорт. Часопіс.
**09.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**11.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Масква. Гала-канцэрт. Паказальныя выступы.
**13.00** Тэніс. WTA. Дзень 1-ы. Мадрыд.
**14.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**16.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**20.30** Вось дык так!!!
**20.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**01.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Масква. Гала-канцэрт. Паказальныя выступы.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.35** Фільматэка майстроў: «Італьянец», маст. фільм, 2005 г., Расія.
**09.25** Дакументальная гадзіна: «Ян Павал ІІ і ягоны сябар», дак. фільм, 1999 г., Польшча.
**10.15** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**10.40** Басаножпа свеце (спазнаваўчая праграма).
**11.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.15** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**11.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Фільматэка майстроў: «Італьянец», маст. фільм, 2005 г., Расія.
**13.55** Дакументальная гадзіна: «Ян Павал ІІ і ягоны сябар», дак. фільм, 1999 г., Польшча.
**14.45** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**15.15** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**15.40** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**15.50** «Старадаўнія інструменты Беларусі», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**16.20** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**16.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 3 серыя.
**17.30** «Час гонару», серыял: 27 серыя.
**18.20** Хто ёсць кім?: «Ігар Неўпакоеў».
**18.35** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**19.00** «Сабачая будка», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.25** Невядомая Беларусь: «Дзень памінання», дак. фільм, 2011 г., Польшча.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**21.45** Фільматэка майстроў: «Італьянец», маст. фільм, 2005 г., Расія.
**23.30** Аб'ектыў.
**23.50** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

## 3 ТРАЎНЯ, АЎТОРАК

### 1

**07.15** «Аддай, што здабыў ты, і бедным не будзеш…». Фільм-эсэ (БТРК).
**07.45** Слова Мітрапаліта Філарэта.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00** Навіны.
**09.10** «Радаўніца». Драма («Беларусьфільм»).
**10.30** «Бацька». Кінааповесць (Расія).
**12.00** Навіны.
**12.10** «Ляцяць жураўлі». Кінааповесць (СССР).
**14.00** «Містэрыя сакавіка».
**14.30** «М.Савіцкі. Сказаць без слоў…» Дакументальны фільм.
**15.00** Навіны.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Дакументальны цыкл «Зорнае жыццё» (Украіна).
**17.15** «Толькі не зараз». Меладрама (Расія-Польшча).
**19.00** Навіны.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Ад Масквы да Брэста». Канцэртная праграма.
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Матч 2-і. Барселона-Рэал. Прамая трансляцыя.
**23.40** «Жыві і памятай». Драма (Расія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.15** Фільм «Верныя сябры».
**12.10** Фільм «Каханне зямное».
**14.00** Фільм «Паненка-сялянка».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Фільм «Кіроўца для Веры».
**18.20** Фільм «Я застаюся». Расія, 2007 год.
**20.30** Нашы навіны.
**20.55** Навіны спорту.
**21.00** Прэм'ера. Фільм «Памятай мяне». ЗША, 2010 год.
**23.10** Фільм «Кво Вадзіс».

### СТВ

**05.45** «Званая вячэра».
**06.35** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.45** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Яраслаўна, Каралева Францыі». СССР, 1978 г.
**10.10** Фільм «Граф Монтэ-Крыста». Францыя - Італія, 1954 г.
**13.30** «Нацыянальны здабытак». Храмы Беларусі.
**14.00** Фільм «Мёртвы сезон». СССР, 1968 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Званая вячэра».
**17.35** Прэм'ера! Фільм «Агрэст». Расія, 2007 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.05** Прэм'ера! Фільм «Хусткі». Расія, 2007 г.
**22.00** «Сапраўдная гісторыя».
**22.30** «Аўтапанарама».
**22.50** Прэм'ера! Фільм «Жонка па кантракце». Расія, 2008 г.

### ЛАД

**07.10** Дакументальны фільм «Беларускі народны каляндар. Радаўніца».
**07.20** Тэлебарометр.
**07.25** Кінааповесць «Знак бяды» («Беларусьфільм»). 1-я і 2-я серыі.
**10.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Агляд тура.
**11.00** «Страсці па культуры».
**11.40** Мастацка-публіцыстычны фільм «Мама» (БТРК).
**12.05** «Калі ласка, будзьце побач».
**14.20** Баявік «Замах» (Беларусь). Заключныя серыі.
**16.05** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Канада-Швейцарыя. Прамая трансляцыя.
**19.35** Прэм'ера. Камедыя «Сям'я» (Расія-Казахстан-Германія-Францыя).
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Францыя-Беларусь. Прамая трансляцыя.
**23.30** «Спорт-кадр».
**00.00** Драма «Калі ты ў апошні раз бачыў свайго бацьку?» (Вялікабрытанія).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**10.10** Прэм'ера. «Загавораны. Тры вайны казака Недарубава». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.50** «Кулагін і партнёры».
**12.25** Тэлесерыял «Заяц, смажаны па-берлінску». 2011 г.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро» (Расія).
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял. Расія, 2010 г.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм'ера. Тэлесерыял «Заяц, смажаны па-берлінску». 2011 г.
**22.20** Вострасюжэтны тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Весткі.ru».
**23.40** «Дзяжурны па краіне».

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Следства вялі…».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Прэм'ера. Дэтэктыўны серыял «Знахар».
**23.30** «Чапаева ліквідавацьі!».
**00.20** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Клуб чэмпіёнаў. Часопіс.
**10.30** Вось дык так!!!
**11.30** Тэніс.
**12.00** Тэніс. WTA. Дзень 1-ы. Мадрыд (Іспанія).
**13.00** Тэніс. WTA. Дзень 2-і. Мадрыд (Іспанія).
**14.45** Футзала. УЕФА.
**15.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Юніёры. Сербія.
**17.15** Вось дык так!!!
**18.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Юніёры. Сербія.
**19.45** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**21.00** Тэніс.
**21.30** Бокс. Цяжкая вага.
**00.00** Экстрэмальныя віды спорту. Freeride Spirit. Часопіс.
**00.30** Аўтаспорт. Гонкі. Серыя Рэно. Бельгія.
**01.00** Відэагульні. Гановер.
**01.30** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**07.30** «Ваенны фатограф», дак. фільм, 2001 г., Швейцарыя.
**08.25** «Час гонару», серыял: 27 серыя.
**09.15** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 3 серыя.
**09.40** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**10.05** Хто ёсць кім?: «Ігар Неўпакоеў».
**10.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**10.35** «Сабачая будка», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**11.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**11.25** Невядомая Беларусь: «Дзень памінання», дакументальны фільм, 2011 г., Польшча.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, 2003 г., ЗША.
**13.20** «Час гонару», серыял: 27 серыя.
**14.05** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 3 серыя.
**14.30** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**14.55** Хто ёсць кім?: «Ігар Неўпакоеў».
**15.15** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**15.35** «Сабачая будка», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**16.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**16.25** Невядомая Беларусь: «Дзень памінання», дакументальны фільм, 2011 г., Польшча.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Эміль з Лёнэбэр'і», серыял: 4 серыя.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 35 серыя.
**18.25** Рэпартэр (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**18.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**19.00** Два на два (тэледыскусія).
**19.25** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.30** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня» (навукова-папулярны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**20.25** Навігатар (інфармацыйна-публіцыстычны тэлечасопіс).
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**22.05** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 4 серыя.
**22.50** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**23.15** Аб'ектыў.
**23.35** Гарачы каментар (публіцыстычная праграма).

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 4 ТРАЎНЯ, СЕРАДА

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.40** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 01.30** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Сфера інтэрасаў». 09.10 Прэм’ера. «Год Залатой рыбкі». Меладрама (Расія).
**11.05** «Невядомая версія «Масфільм». «Афіцэры» (Украіна).
**12.10** «Сястручка». Меладрама (Расія).
**14.05** «Акно ў Еўропу». I
**14.25** Інфармацыйна-забаўляльная праграма «Праверка чутак».
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Ведай нашых».
**15.50** Серыял «Апошняя рэпрадукцыя».
**16.55** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**19.25** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**19.30** «КЕНО».
**19.35** Зямельнае пытанне.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** «Панарама». Інфармацыйны канал.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Паўфінал. Манчэстэр Юнайтэд - Шальке. Прамая трансляцыя.
**23.50** «Двое «. Ваенная драма (Расія).
**01.35** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05, 13.05, 16.10** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Выкрадзеная перамога».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Жаночыя мары пра далёкія краіны». Шматсерыйны фільм.
**22.20** Фільм «Галава ў аблоках».
**00.35** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.30** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Сапраўдная гісторыя».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Сакрэтныя гісторыі».
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі». Серыял.
**21.30** «Мінск і мінчане».
**22.05** «Дабро пажалiцца».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**00.05** «Водблiскi». Серыял.

---

**06.35** Камедыйны серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.05** Фільм-казка «Прыгоды Бураціна» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**10.15** Спорт-кадр.
**10.40** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**11.25** Медычныя таямніцы.
**12.00** Медычныя таямніцы +.
**12.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.15** Меладрама «Фантазіі Фарацьева» (СССР). 1-я серыя.
**14.40** Пазакласная гадзіна.
**15.00** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**15.15** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**16.10** Серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Данія-Латвія. Прамая трансляцыя.
**19.40** Калыханка.
**19.55** Беларуская часіна.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Фінляндыя-Чэхія. Прамая трансляцыя.
**23.30** Авертайм.
**00.00** Рэальны свет.
**00.30** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм’ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Маршалы Перамогі: Жукаў і Ракасоўскі». Дакументальны фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Заяц, смажаны па-берлінску». 2011 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Прэм’ера. Тэлесерыял «Заяц, смажаны па-берлінску». 2011 г.
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм’ера. «Ад’ютант яго высокасці. Асабістая справа». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Следства вялі…».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**10.20** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Жаночы погляд».
**12.05** «Да суду».
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Знахар».
**23.30** «Сапраўдны італьянец». Дакументальны праект.
**00.20** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Фігурнае катанне. Чэмпіянат свету. Масква. Гала-канцэрт. Паказальныя выступы.
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Юніёры. Сербія.
**12.00** Вось дык так!!!
**13.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**15.00** Тэніс. WTA. Дзень 2-і. Мадрыд (Іспанія).
**17.00** Тэніс. WTA. Дзень 3-і. Мадрыд (Іспанія).
**20.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.20** Абранае па серадах.
**20.25** Спартовае вандраванне. Часопіс.
**20.30** Госць у студыі. Часопіс.
**20.40** Абранае па серадах.
**20.50** Конны спорт. Кубак свету. Выездка. Лейпцыг (Германія).
**21.50** Конны спорт. Кубак свету. Джампінг. Лейпцыг (Германія).
**22.55** Гольф. PGA. Цюрых (Швейцарыя).
**23.55** Гольф. Еўрапейскі турнір. Ballantine Cup.
**00.25** Гольф. Жаночы турнір. Валенсія.
**00.30** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**00.35** Яхт-клуб. Навіны ветразевага спорту.
**01.00** Усе віды спорту. Часопіс.
**01.30** Алімпійскі часопіс.
**02.00** Вось дык так!!!

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб’ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30, 12.05** «Фальшываманетнікі. Вяртанне «Зграі», серыял: 4 серыя.
**08.15** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 35 серыя.
**09.15** «Эміль з Лёнэбэр’і», серыял.
**09.40** Праект «Будучыня».
**10.05** Рэпартэр.
**10.30** Навігатар.
**10.45** Беларусы ў Польшчы.
**11.05** Два на два (тэледыскусія).
**11.30** Сальда (эканамічная праграма).
**11.45** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**12.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.50** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 35 серыя.
**13.45** «Эміль з Лёнэбэр’і», серыял.
**14.10** Праект «Будучыня».
**14.35** Рэпартэр.
**15.00** Навігатар.
**15.20** Беларусы ў Польшчы.
**15.35** Сальда (эканамічная праграма).
**15.50** Гісторыя пад знакам Пагоні.
**16.05** Басанож па свеце.
**16.30** Два на два (тэледыскусія).
**17.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Эміль з Лёнэбэр’і», серыял.
**17.30** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**18.15** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**18.35** Эксперт.
**19.00** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.10** Асабісты капітал.
**19.30** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** На колах.
**20.20** Навігатар.
**20.35** Вагон.
**20.40** Госць «Белсату».
**21.00** Аб’ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Маю права (прававая праграма).
**21.45** «Euromaxx».
**22.10** «Дэкалог, тры», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**23.05** Аб’ектыў.
**23.30** Гарачы каментар.

## 5 ТРАЎНЯ, ЧАЦВЕР

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 00.10** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.25** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша» (Расія).
**10.10** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**12.15** «Двое «. Ваенная драма (Расія).
**14.05** Шэф-кухар.
**15.20, 19.10** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вострасюжэтны серыял «Апошняя рэпрадукцыя « (Расія). Заключная серыя.
**16.35** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.30** Меладраматычны серыял «Маруся. Вяртанне» (Украіна).
**18.25** Сфера інтэрасаў.
**19.25** «КЕНО».
**19.30** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**20.30** Панарама.
**21.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Матч другога раўнда. Прамая трансляцыя.
**23.30** «Клуб рэдактараў».
**00.30** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.20** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «У верасні 39-га».
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Жаночыя мары пра далёкія краіны». Шматсерыйны фільм.
**22.15** Прэм’ера АНТ: «Хто там?». Аналітычная праграма.
**22.50** Фільм «Пінжак». ЗША, 2005 год.
**00.40** «Крэм». Шматсерыйны фільм.
**01.35** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Даішнікі». Серыял.
**09.30** «Дабро пажалiцца».
**09.50** «Вялікі горад».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.35** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Турысты». Серыял.
**14.40** «Рэдакцыя». Серыял.
**15.30** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**16.50** «Добры дзень, доктар!».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Даішнікі». Серыял.
**21.30** «Праўда».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Паляванне на ізюбра». Серыял.
**00.05** «Водблiскi». Серыял.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дакументальны фільм «Простая гісторыя» («Беларусьфільм»).
**08.40** Серыял «Ты маё жыццё».
**09.50** Фільм-казка «Прыгоды Бураціна» («Беларусьфільм»). 2-я серыя.
**11.00** Бітва экстрасэнсаў.
**12.05** Дача здароўя.
**12.40** Авертайм.
**13.10** Жансавет.
**13.40** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**14.45** Меладрама «Фантазіі Фарацьева» (СССР). 2-я серыя.
**16.15** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**16.40** Пазакласная гадзіна.
**16.55** «Кулінарыя для дзяцей». Мультфільм.
**17.00** Серыял «Анатомія Грэй-5» (ЗША).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** Ваенная драма «У небе «начныя ведзьмы» (СССР).
**20.35** Калыханка.
**20.50** Тэлебарометр.
**20.55** Беларуская часіна.
**22.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Паўфінал. Прамая трансляцыя.
**00.00** Час футболу.
**00.30** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Паўфінал.

### РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.15** Прэм’ера. «Прамы эфір».
**10.10** «Жыццё ў рытме маршу». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Заяц, смажаны па-берлінску». 2011 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «З новай хатай!». Ток-шоў.
**16.20** «Кулагін і партнёры».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.45** Тэлесерыял «Пяць хвілін да метро».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.00** Весткі.
**20.30** Прэм’ера. Тэлесерыял «Заяц, смажаны па-берлінску». 2011 г.
**22.20** Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.50** Прэм’ера. «Аперацыя «Вялікі вальс». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.05** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** «Следства вялі…».
**09.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Дачны адказ».
**11.15** «Таямнічая Расія».
**12.05** «Да суду».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Пракурорская праверка».
**14.25** «Давайце мірыцца!».
**15.15** «Справа густу».
**15.40** Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Знахар».
**23.30** Прэм’ера. Юбілейны канцэрт Вікі Цыгановай «Сінія мае кветкі».
**00.30** «Асабліва небяспечны!».

### EUROSPORT

**09.30** Конны спорт. Кубак свету. Дубай.
**10.00** Тэніс. WTA. Дзень 3-і. Мадрыд (Іспанія).
**12.00** Снукер. Чэмпіянат свету. Шэфілд. Фінал.
**13.00** Тэніс. WTA. 1/8 Фіналу. Мадрыд (Іспанія).
**14.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Юніёры. Групавы этап. Сербія.
**16.00** Тэніс. WTA. Дзень 3-і. Мадрыд (Іспанія).
**17.00** Тэніс. WTA. 1/8 Фіналу. Мадрыд (Іспанія).
**20.10** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.30** Вось дык так!!!
**21.00** Байцоўскі клуб.
**00.05** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**00.35** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Юніёры. Групавы этап. Сербія.

### БЕЛСАТ tv

**07.00** Аб’ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** «Дэкалог, тры», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**08.25** «Права быць свабодным» (канцэрт альтэрнатыўнай музыкі Луцк-2007): ч. 2, выступ гурта «Індыга».
**08.55** «Каханне, здрада, жарсць», серыял.
**09.40** «Эміль з Лёнэбэр’і», серыял.
**10.05** На колах.
**10.30** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**10.50** Асабісты капітал.
**11.05** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**11.30** Маю права (прававая праграма).
**11.50** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**12.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** «Дэкалог, тры», маст. фільм, 1990 г., Польшча.
**13.00** «Права быць свабодным» (канцэрт альтэрнатыўнай музыкі Луцк-2007): ч. 2, выступ гурта «Індыга».
**13.25** «Каханне, здрада, жарсць», серыял: 4 серыя.
**14.10** «Эміль з Лёнэбэр’і», серыял: 5 серыя.
**14.35** На колах (аўтамабільны тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**15.05** «Над Нёманам» (тэлечасопіс).
**15.20** Асабісты капітал (эканамічная праграма).
**15.35** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**16.00** Маю права (прававая праграма).
**16.20** Вагон.
**16.30** «Euromaxx» (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**17.00** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Школа на санцапёку», серыял: 9 (20) серыя.
**17.30** «Апошнія дні Сафі Шоль», маст. фільм, 2005 г., Германія.
**19.30** Аб’ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Праект «Будучыня».
**20.25** Невядомая Беларусь: «Берасцейская крэпасць. Дзве абароны», дак. фільм, 2009 г., Беларусь.
**21.00** Аб’ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Рэпартэр.
**21.50** Форум (ток-шоу): «Дбаем аб сваім».
**22.35** «Пуаро Агаты Крысці», дэтэктыўны серыял: 4 серыя.
**23.25** Аб’ектыў.
**23.45** Гарачы каментар.

ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Выпуск №4 (56)
(красавік)

www.lit-bel.org www. novychas.gmail.com

Культурна-асветніцкі праект Грамадскага аб'яднання «Саюз беларускіх пісьменнікаў» і «Новага часу»

Анонс

«НАВІНЫ»: літаратурна-грамадскае жыццё красавіка........с. 2.
«ПАЭЗІЯ»: «Вага слова» ад Рыгора БАРАДУЛІНА........с. 3.
«ПУБЛІЦЫСТЫКА»: актуальныя развагі Алеся ГІБКОЎСКАГА........с. 4.
«ПАЭЗІЯ»: вершы і водгук Васіля ЗУЁНКА........с. 5.
«ПРОЗА»: «начыркі» Алеся Масарэнкі........с. 6.
«ПАМЯЦЬ»: паэтычны вянок Івана ЛАГВІНОВІЧА........с. 7.
«ПАЭЗІЯ»: новыя вершы Алеся КАСКО........с. 8.
«СЯБРЫНА»: «Берасцейскі літагляд» ЛеГАЛА........с. 9.
«МАЛЬБЕРТ»: «Вершалёс» Лявона ВАЛАСЮКА........с. 10.
«ФОРУМ»: Сяргей РУБЛЕЎСКІ, Аляксей ГАНЧУК і Мікалай АЛЯКСАНДРАЎ........с. 11.
«КРЫТЫКА»: Мікола МІШЧАНЧУК пра кнігу Алеся ДЗІТРЫХА........с. 12.
«ПЕРАКЛАДЫ»: Сяргей ЯСЕНІН........с. 13.
«ЗАПІСЫ»: Ніл ГІЛЕВІЧ пра 93-і год........с. 14–15.
«ПАЛІЦА»: кнігі аўтараў Берасцейшчыны........с. 16.

НАЧЫРКІ

# СУЧАСНАСЦЬ І МАНА

Алесь МАСАРЭНКА



## Добрае і дрэннае

*Думай галава — картуз куплю!*
***Прымаўка.***

Беларуская, расейская, украінская — мовы аднаго кораня, адной танальнасці. І калі ўжо гаварыць пра пераклад з расейскай — на беларускую ці наадварот, дык гэтым няхай бы займаўся сам аўтар. Ён здолее ўнікнуць моўных плюх-патырчакаў, бо спадзяванак на некага іншага — бясплодны: атрымаецца бяздушна-прыблізны тэкст, пазбаўлены аўтарскай асновы. У маёй аповесці, помніцца, «чорная гадаўка» была праствораная ў «чорную гадалку», і такіх перлаў — па некалькі на кожнай старонцы. Я хвалююся, не прымаю кашчуннай адвольнасці, а рэдактару — ні ў лоб, ні ў брыво: малодшы брат мусіць не заўважаць падобных агрэхаў, калі хоча, каб кніга пабачыла маскоўскае выдавецтва. Той раз мне давялося дасланы машынапіс карэнным чынам перарабляць, таму і пазначаны аўтарызаваным.

Расейцам, як бы яны ні напіналіся, беларуская мова даецца цяжэй, чым нам, беларусам, расейская. Былая супрацоўніца «Литературной газеты» лічыла сябе знанай перакладчыцай. З ахвотаю бралася за раманы нават вядомых празаікаў. І што ж? Лажанулася на зусім простым сказе: «У траве скакалі конікі» перакапыліла на свой лад: «В траве резвились лошадки». Дый пасля гэтага канфузу не ўпала ў творчую дэпрэсію — доўга яшчэ працягвала курочыць творы беларускіх аўтараў.

Як сведчаць факты, рускамоўны пераклад «Новай зямлі» Якуба Коласа пакуль яшчэ нікому і блізка не ўдаўся, хоць напрацоўкі, здавалася б, ужо даволі ўнушальныя — паэма пабачыла свет ажно ці не ў пяці рускамоўных варыянтах.

Зрэшты, нават «Варшаўскі шлях» А. Твардоўскага ў перакладзе А. Куляшова больш выдае на адну з цудоўных паэм Куляшова, бо свецішча менавіта творчай аўрай перакладчыка. І ўсяму прычына — моўнае падабенства. А хутчэй — аднаго кораня мова, тая самая, старабеларуская, над якой пазбодавалі маскавіты, перакруціўшы шмат якія словы на свой баярска-кайсацкі лад.

Вось такая інтэграцыя. І не больш. Сваё сёння трэба чытаць у роднай мове. Тое ж самае і з суседзямі нашымі — творы расейскіх аўтараў і ўкраінскіх мы няблага разумеем і ў арыгінале.

Друкарскай паперы ў нас нібыта усё яшчэ не стае на творы арыгінальныя — як маладых аўтараў, так і сталых. А бібліятэкі — Нацыянальная ў тым ліку — у самоце: на іх паліцах зусім мала беларускамоўных навінак. Паслухаць завертыкаленых выдаўцоў, то ў іх усё на ўзроўні дазволенага: выдаем тых, на каго гранты маем. Няўжо і сапраўды настаў такі змрочны час, што няхай табе семдзесят гадоў ці восемдзесят, а пакуль жывы, але грантаў не ўмееш выбіваць, дык аніякі дзяржаўны мудрамер і блізка не падпускае — з чым ты, юбіляр, узабраўся на круты перавал: напісалася нешта ці, можа, байды біў — вычэквай, пакуль зноў вернуцца бальшавікі й адназначна заявяць: «Выдаем кнігі тых аўтараў, хто хваліць нас!»

Як мне падаецца, сённяшнія выдаўцы-рэдактары найперш занятыя сабою, за свае ўласныя творы пякуцца. Таму пішчом лезуць у дзяржаўныя выдавецтвы й часопісы. І мяне, прызнацца, даймае апошнім часам бадай рэвалюцыйная думка: а няхай бы працавалі рэдактарамі звычайныя філолагі з належнай на тое адукацыяй, а не літаратары ды журналісты сярэдняй рукі. І тады б гэтыя запячурныя прыхвасні на роўні з астатнімі карысталіся б выдавецкімі паслугамі.

У Японіі кожны жыхар атрымлівае ў год каля дваццаці мастацкіх кніг. Арыгінальных. А ў нас? І дзве-тры не набярэцца.

Становішча незайздроснае. Бацька мой, помню, любіў з мяне пацяшацца: «Калі будзеш толькі пісаць, не будзе чаго кусаць». І праўда, каб не памерці з галадухі, трэба з нечага жыць. На жаль, дзяржаўны «кашалёк» з грашыма — не верабей, абы-дзе не лётае і пустыя прыгаршчы папрашаек, як правіла, абмінае. Раскашуюць тарбахваты-пасаднікі. Астатнія — хто як выдаецца, бо на дзяржаўных кухан спадзеву мала.

У нас — так! — не Японія, дзе з пісьменнікам заключаюць дамову, і ён, атрымаўшы грашовы задатак, спакойна піша сваю галоўную кнігу.

Мы пакуль, як любіў гаварыць Анатоль Сыс, пралятаем. Яно ж, чым больш творчых груповак, тым гусцейшаму быць курнаму фіміяму падчас нейкіх там дыскусій: свой услаўляе свайго!

Дохлых пацукоў звычайна вешаюць тады на несябраў, калі тыя адсутнічаюць, завочы. Даўні прыём, выверады. Дзве творчыя групоўкі — найлепшы таму варыянт. А па мне, дык Саюз пісьменнікаў у нас мусіць адзін быць — гэтакая ўмесцістая (канешне ж, Дом літаратараў!) «лазня-духмень», з вабным пахам упрэлай шышшыны, настоенай на бабровым струмяні; з карамазаўскімі бярозавымі венікамі, ёмкімі й сцёбкімі, якія добра гналі б духоўную нечысць, як з падкаўнер'я пакрыўджаных, так і з-пад замусоленых сурдутаў крыўдзіцеляў, а больш дакладней: з «архісведамых» і «не вельмі».

Чытачу — усё роўна: яму абы творы добрыя. І не прывазныя, а свае, у роднай мове.

## Літаратурныя сланечнікі

Сярод беларускіх літаратараў здавён выразна акрэслілася нязвычная, здавалася б, з'ява: першапачаткова большасць з іх нейкі час пісалі свае першыя, вядома ж, часцей недасканалыя творы ў расейскай мове. Дасягшы хоць і не надта каб галавакружнай вышыні, — бадай на паўдарозе на інтэрнацыянальны папас, тойсёй раптам паварочваў рашуча назад і аж як не трухам пешкаваў да сваіх, пакінутых, але яшчэ не зарослых чартапалохам культурных гоняў.

Нялёгкі шлях, затое ў нейкай меры сумленны й да ўсяго — павучальны.

Я назваў бы гэтых творчых пакутнікаў так: паварачэнцы, а больш дакладней — літаратурныя сланечнікі, бо галовы іх доўгі час арыентаваліся на чаргову круг сонца-крамля, а чуйна-партыйныя насы заўсёды былі павернутыя ў бок марксісцка-ленінскага ветравею.

На жаль, падобных літаратурных паварачэнцаў стае і сёння. Праўда, арыенціры апошнім часам памяняліся. Затое амбіцыі й прабіўная дападнасць вышэй названых вертухаяў засталіся ўсё тыя ж.

## Набрыдзь

Наўрад ці ёсць дзе на свеце такі запячурны дзеяч, які змог бы насілкам пазбавіць чалавека роднай мовы, а разам з тым і нацыянальнай культуры ўвогуле, бо ўсё сваё як было спакон веку ў генах нацыі, так і застаецца там быць. І да ўсяго іншага — нашай творчай брацыяй ужо нямала цудоўных кніг напісана ў роднай мове, а навукоўцы-этнографы сабралі й выдалі тым часам больш за паўсотню тамоў вуснай народнай творчасці. Сёння ў распараджэнні беларуса — дыхтоўныя энцыклапедыі, поўныя зборы класікаў, тлумачальныя слоўнікі… Трывалы падмурак!

Сапраўды, гены на мову ёсць. І яны нікуды не ўлятучваюцца з жыццёвай спадчыны, вечна жывуць у схронах чалавечай памяці.

Неяк зайшоў да мяне пракансультавацца аўтар-пачатковец — былы вайсковец у чыне палкоўніка. Сказаў, што яму больш за восемдзесят, але тым не менш узяўся за раман і абавязкова яго скончыць. «Гадоў шаснаццаць яшчэ пажыву, — запэўніў не столькі мяне, як сябе наваяўлены раманіст. — Вам застаецца толькі выпраўляць агрэхі з гэтых вось крамзоляў, — паклаў на стол машынапіс старонак пад трыста і дадаў: — У чаўне роднай мовы мне аднаму цяжка плыць». Я сказаў, што можна і па-расейску пісаць. Ён — у рожкі: «Дзякуй — і нагаварыўся, і напісаўся! Ды мне як не кожную ноч сніцца адзін і той жа голас — нехта ўсё дапытваецца, што я, значыць, зрабіў для сваёй Беларусі такое, каб мог ганарыцца гэтым?.. Мой верш сам Максім Гарэцкі хваліў. Ён да нас у школу прыязджаў, выступаў. І я, васьмікласнік, прачытаў яму свой верш. Пасля дзесяцігодкі мяне накіраваў ваенкамат у ваеннае вучылішча, у Ленінград. На чэкіста вучыўся. І кожны раз, калі даводзілася пісаць аўтабіяграфію, кадравік прымушаў абавязкова згадваць той факт, што нацдэм Гарэцкі хваліў мой верш».

Гэтак вось, прызнацца, і выйшаў на мяне некалішні ўпагонены чэкіст-прафесіянал.

Працяг на стар. 6 (14) ►

СЕМІНАР

# АЎТАРСКАЕ ПРАВА

**У Мінску абмеркавалі праблемы аўтарскага права ў Беларусі і Швецыі. 9 красавіка ў Міжнародным адукацыйным цэнтры імя Ёханаса Рау прайшоў міжнародны семінар «Аўтарскія правы на інтэлектуальную ўласнасць творцаў», арганізаваны Саюзам беларускіх пісьменнікаў, Згуртаваннем беларусаў свету «Бацькаўшчына» і Шведскім саюзам пісьменнікаў.**



Фота Настассі Міхейчык, www.budzma.org

Да ўдзелу ў семінары былі запрошаныя айчынныя пісьменнікі, перакладчыкі, выдаўцы, журналісты, прадстаўнікі Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці, а таксама і іх шведскія калегі.

Падчас сустрэчы прадстаўнік шведскага выдавецкага дома «Lind & Co» Крыстофер Лінд распавёў пра адметнасці кніжнага рынку і выдавецкага сектару ў Швецыі, пра тыя праблемы, з якімі сутыкаецца шведская выдавецкая галіна сёння. Сярод іх: памяншэнне агульнай колькасці прадаваных кніг, зніжэнне ролі выдавецтваў і рост ролі пісьменнікаў у выдавецкім працэсе, значнае павелічэнне колькасці электронных кніг, тэндэнцыі да манапалізацыі кніжнага рынку з боку буйных выдавецтваў, узмацненне рэгіяналізацыі шведскай кніжнай галіны. У звязку з апошнім адметная дэталь – шведы аддаюць перавагу ў асноўным айчыннай літаратуры, па гэтай прычыне ў краіне выходзіць даволі мала перакладаў. Па колькасці перакладных кніг з беларускай мовы наша краіна сёлета займае ў Швецыі шостае месца.

Наступным дакладчыкам са шведскага боку выступіў Турб'ёрн Остром, юрыдычны кансультант Шведскага саюза пісьменнікаў. У сваім дакладзе ён звярнуўся да гісторыі развіцця аўтарскага права ў Еўропе і Швецыі, закрануў асноўныя дакументы, датычныя аўтарскага права, у свеце і больш падрабязна спыніўся на юрыдычных асаблівасцях абароны творцамі сваіх правоў у Швецыі. Сярод асноўных тэндэнцый развіцця аўтарскага права ў Швецыі былі названыя распрацоўка юрыдычнай базы для рэгулявання аўтарскага права ў галіне электронных кніг, развіццё міжнародных механізмаў абароны правоў творцаў, а таксама барацьба з піратствам у Інтэрнэце.

Пасля знаўцы шведскага аўтарскага права слова ўзяў іх беларускі калега – галоўны спецыяліст упраўлення права і міжнародных дамоваў Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці Аляксей Бічурын. У сваёй прамове ён закрануў адметнасць дзеяння беларускага заканадаўства ў галіне аўтарскага права, распавёў пра магчымыя асаблівасці новага закона пра аўтарскае права, прыняцце якога плануецца ў хуткім часе, а таксама неаднаразова падкрэсліў, што палепшыць становішча з аўтарскім правам у Беларусі можна толькі пры зацікаўленасці і актыўным удзеле саміх аўтараў.

Кожны тэматычны выступ семінара суправаджаўся вялікай колькасцю пытанняў як да шведскіх гасцей, так і да прадстаўніка Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Удзельнікаў семінара цікавілі як асаблівасці шведскай выдавецкай галіны і аўтарскага права, так і айчынныя рэаліі.

**Прэсавая служба СБП**

ПЕРШЫНСТВА

# ПАД ЭГІДАЙ МУЗЫ ШАХМАТ КАІСЫ

**У Мінску адбылося традыцыйнае, ужо пятае першынство Саюза беларускіх пісьменнікаў па шахматах. Чэмпіёнам са стопрацэнтным вынікам стаў Васіль Жуковіч.**

Васіль Аляксеевіч усе гады выступае галоўным ініцыятарам і арганізатарам гэтых цікавых спаборніцтваў, пастаянна займае прызавыя месцы, але чэмпіёнскага тытулу дагэтуль не заваёўваў – відаць, арганізатарскія справы крыху перашкаджалі засяродзіцца на гульні. Тым больш заканамерны сёлетні поспех. Дарэчы, Васіль Жуковіч рэгулярна выступае ў шахматных турнірах, што ладзяцца ў сталічным Палацы шахмат, а ў газетах і часопісах нярэдка з'яўляюцца не толькі яго новыя вершы, але і шахматныя задачы і эцюды...

«Серабро» сёлетняга першынства – у празаіка Івана Клімянкова, мінулагодняга пераможцы (а не так даўно ў «Маладосці» выйшла аповесць І. Клімянкова «Паядынак» з «шахматным» сюжэтам).

**Вадзім Жылко**

САЮЗ

# ГЕНЕРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ БАЛТЫЙСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

**1–2 красакавіка ў горадзе Візбю на шведскім востраве Готланд прайшла штогадовая Генеральная асамблея Савета балтыйскіх пісьменнікаў, удзел у якой узяў і Саюз беларускіх пісьменнікаў.**

Падчас двухдзённых сустрэчаў, якія аб'ядналі прадстаўнікоў 14 пісьменніцкіх і перакладчыцкіх арганізацый з 10 краінаў Еўропы, што гістарычна і геаграфічна належаць да Балтыйскага рэгіёну, абмяркоўваліся шматлікія пытанні, датычныя як сучаснага стану нацыянальных пісьменніцкіх арганізацый, так і літаратурнага працэсу наогул.

Пасля зацвярджэння праграмы асамблеі Старшыня Савета Яніна Арлоў (Швецыя) распавяла пра тое, якія накірункі дзейнасці падтрымліваў Савет цягам апошняга года. Найперш гэта шматлікія літаратурныя мерапрыемствы, праведзеныя пры садзеянні Савета.

Яніна Арлоў падкрэсліла, што «беларускае пытанне» не губляе сваёй актуальнасці. Падтрымка няўрадавых культурных ініцыятыў, кантакты з беларускімі дзеячамі літаратуры і мастацтва, спрыянне культурнаму абмену застаюцца адным з важных кірункаў дзейнасці Савета.

Быў названы і новы літаратурны праект «Picture this!», які пройдзе ў чэрвені ў фінскім горадзе Турку. Узяць у ім удзел запрошаныя і беларускія творцы.

Яшчэ адным важным пытаннем, прынятым падчас Генеральнай асамблеі, было ўключэнне ў шэрагі Савета Саюза грузінскіх пісьменнікаў. Пасля ажыўленай дыскусіі з перавагай у дзве трэці галасоў сяброўства гэтай арганізацыі ў шэрагах Савета балтыйскіх пісьменнікаў было зацверджанае.

Падчас Генеральнай асамблеі адбылася прэзентацыя шэрагу літаратурных праектаў, у якім актыўны ўдзел бярэ Савет балтыйскіх пісьменнікаў. Петэр Курман, прадстаўнік Саюза шведскіх пісьменнікаў, распавёў пра ініцыятыву правесці пісьменніцкі круіз, які аб'яднае пісьменнікаў са Швецыі, Фінляндыі, Нямеччыны, Турцыі, Даніі, Ірана ды іншых краінаў. Па задуме арганізатараў, карабель выйдзе з порта ў Стамбуле з прыпынкамі ў Хайфе, Бейруце, Александрыі, Родасе і іншых гарадах, а на яго борце адбудуцца шматлікія літаратурныя чытанні, абмеркаванні і сімпозіумы. Сваёй мэтай арганізатары мерапрыемства бачаць наладжванне дыялогу ў сучасным канфліктным свеце і ўсталяванне асабістых кантактаў паміж удзельнікамі круіза.

Нямецкі паэт Клаус-Юрген Лідткэ прэзентаваў Віртуальную балтыйскую бібліятэку, усе творы якой тым ці іншым чынам прысвечаныя Балтыйскаму мору, краінам, якія знаходзяцца на яго берагах і іх жыхарам. На дадзены момант на сайце прадстаўленыя творы на 11 мовах Балтыйскага рэгіёна і яшчэ двух «небалтыйскіх» мовах: ангельскай і лацінскай. Варта адзначыць, што кожны тэкст у бібліятэцы мусіць быць перакладзены на ўсе «балтыйскія» мовы. На жаль, беларуская літаратура пакуль не прадстаўленая ў бібліятэцы.

Прадстаўнікі пісьменніцкіх арганізацый Савета балтыйскіх пісьменнікаў распавядалі пра дзейнасць сваіх аб'яднанняў за год. Пра здзейсненае Саюзам беларускіх пісьменнікаў, яго праблемы і поспехі сваім калегам расказала Юлія Цімафеева, прэсавы сакратар арганізацыі.

На сёлетняй Генеральнай асамблеі адбыліся выбары кіраўніцтва Савета. На месца старшыні арганізацыі была пераабраная Яніна Арлоў. Прадстаўніца Саюза беларускіх пісьменнікаў стала намеснікам аўдытара Савета балтыйскіх пісьменнікаў.

У перапынках паміж афіцыйнымі пунктамі праграмы шматнацыянальная пісьменніцкая грамада дзялілася навінамі жыцця сваіх арганізацый, абмяркоўвала магчымыя праекты супрацоўніцтва, абменьвалася досведам.

ПАЛІЦА

# ЗБОР ТВОРАЎ АДАМА БАБАРЭКІ

**Адам Бабарэка. Збор твораў у двух тамах: Том 1. Літаратурна-крытычныя працы — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2011. — 939 с., іл. Том 2. Проза, паэзія, філязофія, публіцыстыка, запісныя кніжкі, дзённікі, лісты. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2011. — 726 с., іл.**




Выйшла ў свет літаратурная спадчына Адама Бабарэкі — два тамы ўвабралі ў сябе больш за 1600 старонак літаратуразнаўчых, мастацкіх тэкстаў, ліставанне. У першы том увайшлі літаратурна-крытычныя працы. Большасць з іх публікуецца ўпершыню. Гэта дзясяткі крытычных і літаратуразнаўчых артыкулаў, працы, прысвечаныя творчасці Язэпа Пушчы, у тым ліку манаграфія «Супроць ветру». Другі том склалі проза, паэзія, філасофія, публіцыстыка, запісныя кніжкі, дзённікі, лісты.

Адам Бабарэка (1899-1938) — адзін з арганізатараў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша». У 1930-м арыштаваны па справе Саюза вызвалення Беларусі. Асуджаны да 5 гадоў высылкі. Пасля тэрмін быў прадоўжаны яшчэ на 2 гады. У 1937 паўторна арыштаваны. Памёр у лагеры. У Маскве жыве яго дачка Алеся — адзіны прамы нашчадак крытыка.

Пры жыцці ў Адама Бабарэкі выйшла толькі адна кніга — зборнік апавяданняў. Выдаваць яго пасля першага арышту ў 1930 годзе было немагчыма. У канцы 1950-х Бабарэку рэабілітавалі, але яго напрацоўкі так і заставаліся незапатрабаванымі.

Адзін з укладальнікаў і рэдактар двухтомніка Віктар Жыбуль адзначае, што яшчэ ў 1926 годзе мелася выйсці кніга крытыкі. Але ў гэты час адбыўся раскол «Маладняка», і частка літаратараў, у тым ліку і Бабарэка, стварылі аб'яднанне «Узвышша». І кніга, якая рыхтавалася «Маладняком», выйсці не магла ўжо з ідэйных меркаванняў.

«Цягам 1920-х ствараліся штучныя ўмовы, каб кніжка ў Бабарэкі не выходзіла. Падразалі фінансаванне... Не любілі Адама канкурэнты, прадстаўнікі варожых «Узвышшу» суполак. І так атрымлівалася, што гэтыя людзі займалі пэўныя пасады. Да прыкладу, Цішка Гартны, найбольш актыўны апанент «Узвышша», — прызнаецца Віктар Жыбуль.

У канцы 1960-х, да 70-годдзя Адама Бабарэкі, меркавалася выдаць том выбранага. Але далей размоў справа не пайшла. Толькі ў 1999 годзе асобным выданнем выйшлі лісты з турмы і высылкі Адама Бабарэкі да сям'і. Выдаў іх Мікалай Ількевіч.

В. Жыбуль сярод прычын, па якіх спадчына не выдавалася, называе і тое, што пра архіў крытыка, які знаходзіўся да нашых дзён у яго сям'і, мала хто ведаў. Ды і сямейнікі толькі адзінкавым даследчыкам дазвалялі зазірнуць у яго.

Нялёгка было ўратаваць той архіў.

Калі ў высылцы Адама Бабарэку прыйшлі арыштоўваць другі раз, яго жонка Ганна паклала спаць дачку Алесю на канапу, у якой захоўвалася частка рукапісаў мужа. Энкавэдзісты тады канфіскавалі лісты, рукапісы Бабарэкі, архіў «Узвышша». Але не сталі будзіць дзяўчынку. І частку ўдалося захаваць.

У Беларусь архіў быў перавезены ў канцы 1990-х – пачатку 2000-х. І цяпер ён захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.

**Паводле www.nn.by**

ВЕРШЫ

# ВАГА СЛОВА



Фота С. Шапрана

Рыгор БАРАДУЛІН

***

Багата
Ў мінулым стагоддзі было —
Падлётак сподзеў,
Бацька і маці.
Ды выпала
Застудзіцца гармаце,
І ўсё
З аблачынкай дыму сплыло…

***

Дзверы павешалі,
І яны
Мусяць рукацца
З усімі…

***

Убачыць сваю спіну
Хацелася б валуну…

***

Гарыцца
Нецярпліваму агню
Сагрэць
Абражаныя сцюжай
Долы…

***

У люстэрка гляджу
І прывыкаю да шаржа.
Не паленаваўся шаржыст…

***

Як ні напінаецца
Струна,
Не расчуліцца ніяк
Труна…

***

Смерць бачыць подыхам.
І ад позірку еднага
Не схавацца нікуды…

***

Раніца
Раіцца з жаўруком,
Даверыць ад радасці
Ключ каму.
Вожык маладую душу
Абараняе калючкамі…

***

З панядзелкам пабрацца
Хацела б субота,
Але нядзеля раўнівая…

## Канкрэтна

Доўга клялі,
І калі вага
Слова
Сябе адчула,
Сыру санлівага,
Хлебу драмлівага,
Трасцы далі —
І яна заснула…

## Хто?

Вырваўшыся з цямніцы,
Нецярпіцца
Крыўды забыцца
Нявольніцы навальніцы.
А ёй загадана
Ліцца і ліцца,
Пакуль
Не дазволена будзе спыніцца.
А хто той дазвол дае,
Як запытацца ў яе?..

## Вярнуўся

На аглухлы шыферны дах
Наплывае западзісты мох.
Светла самоціцца
Сад соннарукі.
Вецер імёны зорак
Вучыцца вымаўляць па складах.
З атавы ўспамінаў
Пірамідзіцца светлы стог.
Хусцінка пулятая
У маладзіцы скрухі.
Як некалі ў мамы…

***

Нічога не забудзе забыццё,
Аднойчы ўзяўшы да сябе былое.
Туман схавае адкрыццё ў лісцё,
Апалае, пачутае імглою.
Ляшчына далюляе ў цішыні
Арэхі над суцішанай зямлёю.
Чакаць не стоміцца ніколі дні,
Калі дазволяць дрэву карані
Адчуць нябёсы голай галавою…

## Як храм...

Паэт будуе сам сябе, як храм
Ці як пахіленую халабуду.
У храме весялей адбыцца цуду,
У халабудзе вылежыцца хлам.
На твары неба бліскавічны шрам
Заные, адчуваючы астуду.
Набожна ўкленчыўшы эцюду цуду,
Паэт будуе сам сябе, як храм.

А храм служыцьме долам
і гарам,
Звон давярацьме гуду й перагуду.
У халабудзе кут адвёўшы цуду,
Паэт будуе сам сябе, як храм...

***

Лёс
Поўны воз табе вязе.
Яшчэ бяда
Не горбіць плечы.
І маладому па назе
З жыццём навыперадкі бегчы.

Скупую торбачку нясе
Твая здарожаная доля.
І пачынаеш пакрысе
Ступаць абачліва,
Паволі.

Жыццё ідзе,
А ты за ім
Пляцешся
Уначэлым ценем.

Ты на зямлі,
Як ціхі дым,
Сплывацьмеш
Са сваім найменнем…

***

Прыйшла аднойчы,
Каб пайсьці,
Журбу пакінуўшы са мною.
У сэрцы ўсё
Як і ў жыцці —
Мана змяняецца маною.

Сны недаснёныя ў маны.
Іх ані ўзважыць,
Ані змерыць.
Сябе ашукваюць яны.
А сэрца верыць...

***

І заўтра, і сёння,
І ўвесь свой век
У самога сябе ў палоне
Жыве чалавек.

Спачатку вядома
Малому,
Як уцячы з палону.
Дарослы розум
Больш давярае
Крозам.

Пасля
Ўжо зямля
Падказвае выйсце.

Як і заўсёды…
Як і калісьці…

## Пачынае часцей...

Думацца пачынае часцей
Пра той,
У якім мушу атайбавацца,
Свет,
Дзе спачне ўжо зямная праца.
Вярнуся я з гэтага,
Як з гасцей.

Ці там чакаюць мяне свае,
Якіх застаць мне не давялося,
Ці там наліваецца жалем
калоссе
І птушка памяці гнёзды ўе?

Ці там гэты кут,
Дзе няма пакут,
Дзе не прыручана воля
цярпеннем?
Да зоркі лёсу
Пазычаным ценем
Прывязаны
Я пасуся тут...

***

Хмараў горы
Цягнуцца караванам.
Змоўк звон.
Адпачывае званіца.
Хворы,
З горлам перабінтаваным,
Сон
Ніяк не можа дасніцца…

***

Раўнівы час,
Напэўна, сам старэе,
Бо люта старыць
Нашых дарагіх.
Надзея ў шлюбным вэлюме
Ўдавее.
Адно ўспамін,
Як малады жаніх.

***

І смех, і жах,
Як на нажах.
Смех хоча
Не паддацца жаху.
Высока
Смелакрылы птах.
Са смехам
Жах вядзе
На плаху…

***

На далонях лістоў
Лініі лёсу дубровы:
Ці выгарбіць спіны мастоў,
Ці пойдзе на дымныя дровы.
Ці ляжа трунай на купе,
Ці чула затуліць завею.

Варожыць час.
А дуброва расце.
Штогод
Голас ейны гусцее…

## Па дарозе назад

Раніца сонная.
Лес сівабровы.
Заспяганая памяць шашы.
Грэюцца,
Выкрасаючы іскры, падковы.
Палазы рыпяць
Па маёй душы.

Конь маленства маё
Вязе на санях.
У хрумсткага сена
Устрывожаны пах…

***

Перш чым ступіць на ганак,
Аб трыпутнік ступакі выцірае
І галінкай яблыні
Грукаецца ў шыбіну
Чэрвень,
Усё яшчэ поўны веры,
Што гаспадыня
Адчыніць дзверы…

***

Да нельга прывыкае
Льга.
Бясконцай хоча стаць
Чарга.
Плывуць сны смагі
Да Вады.
А час бяжыць куды
Худы і малады?

***

Змрок шукае
Апошні схоў.
Раніца
Свой голас гукае.
І чуваць,
Як з заспаных лістоў
Учарашні дождж
Уцякае…

***

Радзее змрок.
Цвярдзее крок.
Застыў курок.
Штыхамі
Сняць сябе сцізорыкі.
Позіркамі зоркі
Пераміргваюцца.
Маладзік
Язык высоўвае.
Перамір'е.
Часовае…

## Стог

Вечнасць
З памклівых гадоў
Звяршыла стог —
Годзе!
Яшчэ стагоддзе…

## Пытанне

А калі былі
Ксьціны ў ісьціны?..

***

І страх не адкажа,
Чым пахне смерць…

## З мінулага

І як ні звярэлі,
Як глоткі не дралі,
Але самагонку
Ў калгас не загналі…

## Лагічна

Усё жыццё,
Пакуль не злёг,
Ён працаваў на некралог…

## Спрадвеку

Рухае жыццё спрадвеку
Спрэчка.
Пакаленні
Замяняе час няспынна.
Бацька і дачка —
Як млын і рэчка.
Дзед і ўнучка —
Як дзядоўнік і шыпшына…

***

Жыццё — надзея.
Смерць — падзея.
Чаканне — уздых…

▶ ДУМКА

# ЭПОХА «ЯКБЫІЗМА»

*Алесь ГІБОК-ГІБКОЎСКІ*

**Новая эпоха нашай гісторыі прынесла з сабой не толькі новыя палітычныя і эканамічныя варункі, нязвыклыя, а то і экстрэмальныя, але пачала імкліва фарміраваць і новы культуралагічны кантэкст. Відавочна што сёння мы знаходзімся ў самым эпіцэнтры ягонага стварэння. А найперш гэта датычыць нашага моўнага асяродку, з ягонай суровай білінгвістычнай дадзенасцю. Але адсочваючы эвалюцыйныя працэсы ў станаўленні мовы і больш-менш выстаўляючы абарону на шляху галоўных вонкавых удараў, мы часам не зважаем на дробязі, якія, бы каведны вірус, разбураюць знутры.**

**Размова ідзе пра адзін, на першы погляд, банальны і даволі бяскрыўдны выраз, які, на маю думку, сёння стаў ледзь што не своеасаблівым сімвалам нашай эпохі.**




## Бар'ер беларусаў

Маецца на ўвазе словазлучэнне-паразіт «як бы», якое сёння стала вельмі папулярным на постсавецкай прасторы, у тым ліку і ў Беларусі. Згадваюцца шматлікія тэле- і радыё інтэрв'ю з рознай зорнай (дакладней, гламурнай) публікай, дзе гэтае «як бы» ўладна вядзе рэй сярод іншых часцінаў мовы. Ды і дзясяткі знаёмых сёння ёсць яго вялікімі прыхільнікам.

Сэнс «як бы» — дамінуючая пазіцыя няўпэўненасці і няпэўнасці — маўляў, я не магу нічога ні сцвярджаць, ні адмаўляць дакладна.. Трываласць і невынішчальнасць яго проста здзіўляюць. «Як бы» (па-расійску — «как бы») — сёння безумоўны лідэр сярод іншых слоў, словазлучэнняў і выразаў-паразітаў самага рознага кшталту, якіх на тэрыторыі былога СССР не браке. (Адно, да прыкладу, «на самом деле» чаго каштуе!)

Трэба адзначыць адразу, што ў нашага беларускамоўнага люду такіх слоўцаў значна менш, чым у рускамоўнага. Як менш і ўсялякага іншага слоўнага смецця і бруду. Відаць, яшчэ працуе нейкі імунны бар'ер ад такой хваробы. Прыкладаў таму шмат. Неадпойчы ад беларускамоўных сяброў даводзілася чуць, што калі карціць як след мацюкнуцца, то на роднай мове гэта проста не атрымліваецца. Даводзіцца тэрмінова «пераключаць рубільнік» на «великий и могучий». Хутчэй за ўсё у межах нашай мовы для брутальнай лаянкі-мацяршчыны нават няма свайго арганічнага месца. Ну а тое, што многія носьбіты роднай мовы сёння выкарыстоўваюць «для разрадкі» — тавар відавочна экспартны. Ды нават да банальнай грубасці наша мова не вельмі прыдатная. Ну не кладзецца такая экспрэсія на нашыя мяккія, дабразычлівыя слоўцы!

А што ёсць насамрэч згаданыя мацяршчына, лаянка, грубасць, злосць? Па меркаванні расійскага філосафа В.Рознава гэта адны з самых выразных праяваў інфернальнага ў чалавеку, бо менавіта слова часцей за ўсё папярэднічае нашым учынкам. Словам, наш моўны імунны бар'ер найперш блакіруе інфернальнае, а значыць, на фоне іншых нашая мова заўсёды была адметнай сваёй моцнай жыццядайнай і стваральнай энергетыкай — адным з самых вялікіх багаццяў, што перадаліся нам у спадчыну.

## Лекаванне словам

У гэтым звязку згадаўся колішні аповед майго бацькі пра маю бабулю Кацярыну, якую мне Бог не даў пабачыць — яна зышла з жыцця за некалькі месяцаў да майго нараджэння. (Цяжка, дарэчы, вымераць тыя страты, якія мы нясём, размінаючыся ў лёсе са сваімі крэўнымі бабулямі і дзядулямі, не атрымліваючы потым вельмі важкую ў непарыўным жыццёвым кругазвароце-эстафеце іх спадчынную любоў.) Дык вось на яе пахаванне сабралася ўся навакольная акруга. За што ж была такая пашана звычайнай вясковай бабулі?

Рэч у тым, што бабуля Кацярына лекавала мясцовы люд ад многіх балячак пры дамапозе розных настояў з зёлак, якія сама збірала і гатавала, але найперш словам. Як згадваў бацька, у бабулі быў ціхі, прыязны і мяккі голас, якім людзі проста заслухоўваліся. Мой дзядуля Фёдар — чалавек грэнадзёрскага росту, грубаваты і нестрыманы — імгненна ніякавеў перад гэтай маленькай расточкам і заўсёды спакойнай жанчынай. Ды і не толькі ён! Бабуля магла ў момант «прытармазіць» самых скандальных землякоў. Яна ўмела супакойваць людзей, падтрымліваць у цяжкія хвіліны — была гэткім невялічкім сонейкам для іх, за што і любіла яе ўся акруга.

Думаю, што галоўны сакрэт лекавання маёй бабулі заключаўся якраз у жыццядайнай энергетыцы яе слова. Зразумела, нашага, беларускага, з унікальнейшым, па сведчанні бацькі і радні, лексічным і сінтаксічным запасам, напоўненым спаконвечнай мудрасцю і духоўнасцю.

Хіба магла такая вось мова быць «нераспрацаванай» ці «штучнай» — «створанай кучкай пісьменнікаў», як пачуў я неяк на адной з духоўных вечарын. Давялося выступіць і абараняць сваё, і ўжо пасля першых сваіх словаў я адчуў дружную падтрымку залы, запоўненай праваслаўнымі беларусамі. Веравызнанне зусім не зрабіла іх людзьмі без родуплемені. Пасля вечарыны ўвесь антыбеларускі імпэт чалавека (пісьменніка-гісторыка, як ён сябе прэзентаваў), што бэсціў нашую мову, нейк адразу скукожыўся. Чалавек ён аказаўся неблагі, проста без стрыжня ў душы. Я нездарма спыняюся на ім, бо такі тып беларуса, ці дакладней, тутэйшага (які ж усёткі быў маштаб таленту ў нашага Купалы!), мае самае непасрэднае дачыненне да тэмы гэтага артыкула.

Што да маёй бабулі Кацярыны (Царства ёй Нябеснае!), то вельмі спадзяюся, што стваральная энергетыка і душа яе мовы перадалася нам — яе нашчадкам.

## У звязцы з Антысістэмай

Па вялікім рахунку, «як бы» сёння сімвалізуе сабой ні больш ні менш як духоўны лад жыцця, своеасаблівую філасофію пэўнай часткі соцыуму. Назавем яе ўмоўна «якбыізмам». Сэнс «як бы» напаверхні — няўзнак сціраецца мяжа паміж выказваннем і рэальнасцю, выяўляецца няўпэўненасць, а галоўнае, нявызначанасць і няпэўнасць меркавання.

Пачынаецца з прасцейшага: «Як бы зраблю гэта...» ці «Як бы прыйду заўтра...». Тут яшчэ функцыянальная напэўнасць, эмацыйны тып характара — сёння залежна ад настрою я зраблю так, а заўтра захачу інакш... Але ўжо выразна дэкларуецца невысокі ўзровень адказнасці за ўсе свае ўчынкі.

А далей — па нарастаючай: «Як бы люблю...» — гэта ўжо мадэль адносінаў да людзей, характарызуе пэўныя душэўныя якасці. Пазіцыя для карыстальніка зручная, бо дазваляе размываць адказнасць за блізкіх.

Ну і кульмінацыя: «Як бы жыву...». Носьбіт гэтай пазіцыі нібы дэкларуе: «Што вы ад мяне хочаце, чаго прычапіліся? Я ж не тут і не там?». Нешта знаёмае? Так, гэта тыповая свядомасць класічнага постмадэрна. Гэткае балансаванне на мяжы цемры і святла, несвядомага і розуму. Вынік часта прадказальны: губляецца шчыльны кантакт з жыццём і чалавек становіцца спажывай Антысістэмы — сілы супрацьлеглай Жыццю.

Экспансія «як бы» характарызуе, дарэчы, і драматычную расколіну нашых беларускіх эліт і расколіну ў душах многіх людзей. Да прыкладу, ёсць іх відавочнае памкненне многіх да веры — пра што сведчаць у выходныя дні паўнюткія рэлігійныя храмы. З іншага — ліхаманкавая прага як мага хутчэй прыхапіць, пасмакаваць усе матэрыяльныя радасці жыцця. І г.д., і т.п.

Прастора для згаданага «як бы» неабмежаваная — многія ў нас «як бы» веруючыя ці «як бы» атэісты, «як бы» праведныя ці «як бы» грэшныя, «як бы» ў шлюбе ці «як бы» самотныя, «як бы» беларусы, «як бы» рускія і г.д. Такіх прыкладаў безліч. А ў выніку і насамрэч людзі «як бы» жывуць на гэтым свеце, што рана ці позна прыводзіць і да канкрэтнага духоўнага выбару.

## Фігура ўмаўчання

І ўсё ж чаму нават трывалыя імунныя бар'еры нашай мовы не сталіся перашкодай для гэтага «як бы»? Чаму яно так укаранілася, прычым, заўважым, больш глыбока, чым у мове расійскай. Чаму знакавая ахоўная сістэма, якая вякамі беспамылкова аналізуючы па прынцыпе «свой — чужы», не спрацавала, спакойна прыняўшы гэты небяспечны вірус за «свайго»?

Адказ зноў жа ў нашай традыцыйнай ментальнасці. Відавочна, што ў нашай мове адбіліся найбольш яркія нацыянальныя рысы беларусаў (спагадлівасць, цярпімасць і, канечне ж, памяркоўнасць). І тая ж, славутая прымаўка «Сем разоў адмер — адзін раз адрэж» — для беларуса, мякка кажучы, ніколі не была канчатковым імператывам. Лёс, вякамі выпрабоўваючы яго на трываласць, навучыў «адмяраць» са значна большым запасам. Тым выжыў, адмяраючы шматкроць, нават у дробязях выяўляючы асцярожнасць і педантызм. Ну а калі смяротная небяспека набліжалася, то ў ход ішоў яшчэ адзін ключавы імператыў: «Хавайся ў бульбу!».

Колькі ж разоў у гісторыі было разрабавана і вынішчана ўсё нажытое дзядамі-прадзедамі, колькі пакаленняў былі абезгалоўлены і абяскроўлены амаль дашчэнту! Але атрымаўшы чарговы ўдар, ізноў знаходзілі ў сабе сілы пачаць усё спачатку. Прычым не толькі выжывалі фізічна, але і (вялікае дзіва!) маглі пасля такога яшчэ нешта захаваць і зберагчы ў духоўным плане і перадаць нашчадкам. Мала хто з народаў у гісторыі можа «пахваліцца» такой ёмкай гістарычнай «калекцыяй» катаклізмаў, зладжаных чалавечымі рукамі. Зрэшты, і такой вось — як мы — жывучасцю.

Як вынік, узважваючы шматкроць кожны свой будучы крок, беларусы-ліцьвіны прывыкалі да пэўнага, скажам так, жыццёвага стылю. У сітуацыях выбару дамінуючай стала заўсёдная няўпэўненасць і няпэўнасць. І ў многіх выпадках, дзе была апаратыўна патрэбная канкрэтная ацэнка, беларус звыкла імкнуўся яе пазбегнуць. Таму і выходзіла, што часта ён нешта «як бы» рабіў, а часам і «як бы» жыў, каб толькі, не дай Бог, не парушыць крохкі, але ўсё ж — «статус кво». І калі «як бы» і не выкарыстоўвалася раней нашымі продкамі дэ-юрэ, то дэ-факта дамінавала даўно. А значыць, многія стагоддзі, хоць і ў якасці фігуры ўмаўчання, было своеасаблівым сімвалам ментальнасці. Гэта і падмеціў Янка Купала напачатку ХХ стагоддзя, вывеўшы ў сваіх «Тутэйшых» менавіта ж сапраўднага «якбыіста». Разлад у душах пачынаўся з няўпэўненасці ў самых банальных сітуацыях, а потым прыводзіў і да размывання паняцця дабра і зла. «Пасіўнасць, зміранасць і абыякаваць поўнасцю падпарадкавалі сабе натуру тутэйшага», — піша напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя даследчык В. Каваленка. Але Янка Купала, які глыбока адчуваў нашую нацыянальную драму, хоць і высмейваў пазіцыю такога тыпу людзей, схільных да здрады свайму, спаконвечнаму, разам з тым быў моцна заклапочаны іх лёсам. Бо прадчуваў, што іх на нашай зямлі шмат і што драма «тутэйшасці» будзе актуальная і для будучых пакаленняў.

## У барацьбе з ліхам

Такім чынам, «якбыізм» сёння — рэч даволі рэальная ў нашым асяродку. «Як бы» сёння — гэта ўжо не лінгвістычная з'ява, а своеасаблівы сімвал нашай эпохі. Эпохі адметнай тым, што зноў не на жарт разгарэлася жорсткая барацьба Жыцця з Антысістэмай, якая сёння, атрымаўшы каласальныя тэхналагічныя інфармацыйныя магчымасці (самую небяспечную і ўсюдыісную зброю), усё больш выразна дае пра сябе знаць, у тым ліку і ў нашай краіне. Яе праявы ў нас не толькі ў страшным Чарнобылі, трагічных «Нямізе» і «Кастрычніцкай», але і ў нашых душах. Згаданы «якбыізм» няўхільна расхіствае іх трываласць, паціху выводзячы на ўзровень свядомасці «постмадэрна» ўсю нацыю. І якім бы чынам гэты «якбыізм» сябе сам не пазіцыянаваў (калі ўвогуле пра яго можна так казаць!), такая справа сёння на руку Антысістэме.

Нашыя пастаянныя нявызначанасць, няпэўнасць і, як вынік, неразборлівасць, прымушаюць паўторым, пастаянна балансаваць на мяжы дабра і зла. Зручная, на першы погляд, пазіцыя — смяротна небяспечная! Бо ўсё тое, што садзейнічае парушэнню ладу ў душы асобнага чалавека, у выніку ўплывае і на гарманічнасць і цэльнасць грамадства, энтасу, дзяржавы. А значыць, аб'ектыўна спрыяе сілам зла і вядзе да прорвы.

І насамрэч адсутнасць духоўнай, маральнай пэўнасці рана ці позна можа прывесці да адмаўлення ад адказнасці і за свой род-племя, і за ягоныя сукупныя духоўныя каштоўнасці. І гэта здараецца найперш праз наш персанальны духоўны выбар, а не як вынік уздзеяння славутага «калектыўнага бессвядомага» — чыста прыроднай статкавай мадэлі ўзаемадачыненняў. Носьбіты «якбыізму», канцэнтруючыся ў соцыуме, паступова ствараюць крытычную масу, якая можа радыкальна (не так як сёння!) памяняць вектар духоўнага развіцця. Таму вельмі ж сёння важна памятаць, што кожнае слова, сказанае намі, нават самае непрыкметнае — хоць і не верабей, але рэч таксама матэрыяльная. За якую абавязкова калісьці будзем адказваць.

Зрэшты, амаль усе гэта ведаюць, але упэўненыя, што адказваць будзе не ён, а нехта іншы...

ВЕРШЫ

# НОВАЯ ВЯСНА

Васіль ЗУЁНАК

## Тыцыян Табідзе

*Малітва не-грузіна*

*Такое гісторыі міражы*
*Не змыюць — навечна паўсталі*
*Двух геніяў Грузіі два крыжы*
*Ў двубоі: Табідзе і Сталін.*

*Адзін — паэт, другі — яго кат.*
*Малітва мая — пра другога:*
*Няўжо грузін грузіну не брат?!. —*
*Малю перад Грузіяй Бога:*

*— Я літасць тваю з разуменнем прыму,*
*Але, як Суд Страшны прыйдзе,*
*Усім даруй — не даруй яму:*
*За смерць Тыцыяна Табідзе.*

* * *

*У бярозы крона неўспадзеў*
*Пасмы апусціла жаўталіста.*
*Да жанчын ці пераспелых дзеў*
*Гэтак сівізна ідзе імгліста.*

*Трапяткі і горасны спалох*
*На душу асенне ападае…*
*А бярозу, знаць, ратуе Бог:*
*Тых трывог яна зусім не знае.*

*Бачыць яна новую вясну,*
*А таму й глядзіцца так прыгожа,*
*Што сваю — пры людзях — жаўцізну*
*Не хавае… Ці схаваць не можа?..*

## На восень…

*Ідзе паціху раніца,*
*І вёска не галёкае, —*
*Як быццаам азіраюцца*
*На лета недалёкае.*

*А лета — як схавалася:*
*Цікуе з ночы-ракаўкі,*
*Лісцём паабсыпалася*
*Ад ног да самай макаўкі.*

*Чарнее мякка зяблiва,*
*Пасевы сніць вясеннія.*
*Туман каханкам зваблівым*
*Муку на чмур прасейвае.*

*Праз поле, як па компасе,*
*Вядуць сляды ласіныя*
*Туды, дзе над стаўком асеў*
*П'янкі настой асінавы…*

## Доля

*Бяроза ў лесе, васілёк у полі*
*Хрышчоныя аднолькаваю доляй:*
*Завуць то пустазеллем іх, то смецццем,*
*А любяць, як любіць магчыма ў свеце.*

## Голас

*Жнейкі маладыя,*
*снапы залатыя, —*
*Дзе ты, палейка, дзе ты?*
*Толькі ў памяці*
*жніўная песня*
*заные, —*
*Нібы з іншай планеты…*

*Ці сярпы пагублялі,*
*ці натомлена абначавалі? —*
*Адгукніцеся, жнеі…*
*— Развялі песню з полем,*
*як з Начаю хвалю,*
*Эпох сухавеі…*



## Побач вечна…

*Побач вечна: вясна — голас клятвы святой,*
*І зіма — як здрады дыханне.*
*І шчаслівых не шмат на дарозе той:*
*Для расстанняў даецца каханне.*

*І вяртацца туды лёсам суджана ў снах —*
*Толькі сны паўтараюцца зноўку,*
*Застаюцца каханыя там, як вясна,*
*Для жыцця — прыходзяць сяброўкі.*

ВОДГУК

# ЖЫЦЦЁ І НАДЗЕЯ

Васіль ЗУЁНАК

**Гэтыя словы не раз падступаліся да нашай гамонкі — мяне, чытача, і новай паэтычнай кнігі Сяргея Законнікава «Шалёная Куля»: жыццё і надзея. Я паўтараў іх і адчуваў, што зноў і зноў вяртаюся да тых юнацкіх радкоў паэта — «Пакуль жыве мая бяроза», — радкоў зарукі, радкоў надзеі:**

*Жыві, бяроза!..*
*Светлым болем,*
*Шчаслівай радасцю звіні…*
*На гэтым свеце нас з табою*
*Адны*
*трымаюць карані…*

Радкі асабліва шчымлівыя для мяне апошнія два-тры гады. Бо і ў мяне ёсць бяроза, але над ёю злым насланнём завіс гнеў суседа: перашкаджае яму і кронаю, і каранямі сваімі… Дык вось і клікаў я ў хаўрусніку Сяргея Законнікава: «Жыві, бяроза!..»

Жыві, — бо ты ўжо не проста дрэва, ты ўжо сімвал жыцця. Ты — само жыццё. І цуд гэты зрабіла паэзія.

Жыццё і надзея, — гэта твае рэха, бяроза, якому наканавана лунаць над паэтычным словам Сяргея Законнікава:

*Жыццё!*
*Ты кульмінацыя скразная*
*Ад самага пачатку да канца, —*

паэма «Кульмінацыя» з яго кнігі «Сутнасць», — там трывога трывог: «груз ядзерны, хімічны і нейтронны», — як і ў трагічна-вядомай паэме «Чорная быль» з кнігі «Заклінанне»: «праўда адна — праўдай жыць» і «не хочацца класціся ў дол, не маючы ў сэрцы надзеі…», — там, на Чарнобыльскім крыжы, сышліся яны — жыццё і надзея…

Дзякуй жа табе, бяроза, што нагадала былыя старонкі.

Дзякуй і за сённяшнія: жыццё і надзея, — гэта твой голас прылінецеў рэхам і ў новую кнігу паэта.

Паклічам жыццё — і яно адгукнецца вершам «Крутыя дні», — прысвячаным выдатнаму пісьменніку Віктару Казько:

*Наш хлеб і слова не пазычаны*
*У тых, хто скваліна куш грабе.*
*Мы да жыцця не ў апазіцыі… —*
*хай знаюць, хай помняць тыя, чые*
*«пагоны цэнзараў і крытыкаў вісяць над кожнаю душой», каму «няўцям … ісціна няўмольная»:*
*Жыццё — таксама рэч крамольная…*
*Ды паспрабуй яго спыніць!..*

Не выйдзе, не атрымаецца! Бо ў жыцця — надзейны — ад слова надзея — саюзнік — праўда:

*Дні, толькі праўдай гадаваныя,*
*Пачуюць роднасці струну.*
*Праб'юцца сэрцы надарваныя*
*Праз цемрашальства круцізну!..*

Адгукнецца жыццё — а яно адгукаецца ўсім! — толькі кожнаму па-свойму, як сведчыць верш «Занятак». І няма больш горкага лёсу, чым страціць надзею…

*…найболей вінаваты*
*У тым,*
*Што долю гвалціць здзек,*
*Што праўду валакуць за краты, —*
*Звычайны просты чалавек…*

«Ах, гэты чалавек маленькі — спрадвечны вораг сам сабе…», чалавек, з якім «жыве занятак сталы»:

*Рабіць для монстраў п'едэсталы,*
*Каб потым іх адтуль скідаць…*

Агукнецца жыццё і лёсам іншым, што паўстае з паэмы «Per aspera ad astra», лёсам Барыса Кіта, сялянскі сын, ад беларускіх Карэлічаў узняўся да зор: ён, доктар філасофскіх навук у галіне матэматыкі, уганараваны званнем акадэміка Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі. У сцяну Капітолія замуравана «капсула часу» з імем Барыса Кіта, якую ўскрыюць праз 500 гадоў. Гэтым сімвалам ушаноўваюцца людзі, якія маюць асаблівыя заслугі перад Амерыкай. І паміж іх — «стоадсоткавы беларус»!..

Паэтычна разгортваючы штрыхі біяграфіі Барыса Кіта, Сяргей Законнікаў ад канкрэтных бытавых рэаліяў пракладвае сцяжынкі да высной маштабных, прасветленых афарыстычнасцю, — яны своеасаблівa (і рытмікай — падкрэслена) «падсумоўваюць» раздзелы паэмы.

Тут і праменьчыкі народнай маралі:




*За тое, што доўжыцца існасці свята,*
*Паклон табе, беларуская хата!..*
*За талент любіць па высокай мерцы*
*Дзякуй табе, беларускае сэрца!..*

Тут і засведчанасць характараў: дзе — дапытлівых стваральнікаў пошуку:

*За смеласць,*
*Якая ўдачу вершыць,*
*Паклон пачынальнікам…*
*Слава першым! —*

а дзе — спадручных допыту, стваральнікаў вышуку:

*Спіс чорны*
*Віжамі і зараз вядзецца,*
*Цкуюць за адданасць, за мову зацята.*
*Куды беларусу падацца, падзецца?*
*На роднай зямлі ён —*
*Persona non grata…*

А вось паэтычны тэкст інкруставаны мудрым выслоўем Барыса Кіта:

*Сам Бог пасабляе,*
*Водзіць руку.*
*На грыфелі космасу —*
*Лічбы і літары…*
*Ёсць сэнс глыбокі ў кароткім радку:*
*«Матэматыка вышэй за палітыку!»*

А самая стрыжнявая, галоўная думка — выснова высной паэмы — прадыктавана ўсё тым жа сэнсам: жыццё і надзея. Так, усё жыццё Барыса Кіта ўгрунтавана надзеяй, імя якой — Беларусь. Адзіная і вечная.

Жыццё гукае надзею ў самых розных варунках. І не толькі глабальных. Ёсць моманты ў жыцці зусім-зусім «не гучныя», а паэзія сваім магічным словам надае ім сілу лёсавызначальную. Ну, як скажам, вось гэты пальчык з аднайменнага верша:

*Прыклала свой пальчык да вуснаў:*
*«Маўчы…»,*
*Вяла па прыступках міласці ў нябёсы… —*

Хто скажа, што ў гэтым «Маўчы…» і ў пальчыку, прыкладзеным да вуснаў? — ці каб мама не пачула, ці каб з пацалункам не спяшаўся, ці тут і маўчаннем можна сказаць больш, чым словам?.. Аб гэтым знаюць толькі яны — двое. І ў гэтым — цуд, што акрыляе надзеяй праз усё жыццё:

*Бо пальчык —*
*Да шчасця ўказальны той перст —*
*На вуснах ляжыць*
*І не знікне ніколі…*

Як і вось гэтая святлінка:

*Белая сукеначка мільгнула*
*На начной сцяжыне ўскрай сяла, —*

з тым жа наканаваннем, што і ў «пальчыка»:

*Белая сукеначка ля гаю*
*Прамільгнула,*
*Як маё жыццё…*

Лірычная дакклівасць, пяшчота і цеплыня ахінае ў паэта ўсё існае на зямлі.

*Як добра тут,*
*Дзе схіленым калоссем*
*Зямля вітае*
*Добры час надзей!..*

І на адной хвалі з Караткевічаўскім «Павінна ж быць і ў зайца радасць перад халоднаю зімой» гучыць у Сяргея Законнікава:

*Мне даспадобы стойкасць вераб'я,*
*Яго прысутнасць у няпростым свеце…*

І па гэтых стасунках з дробнаю птушкай вымяраюцца іншыя велічыні, якіх кранаецца паэт душою і словам, беручы ў сведкі «святое хараство зямное волі»:

*Душа мая без стомы з ёю ў змове,*
*Каб занатоўваць тайну ў родным слове…*

З адным такім словам наўпрост лучыцца і таямніца назвы, пазначанай на вокладцы кнігі: «Шалёная Куля». Кожнаму, напэўна, за гэтымі словамі найперш уяўляецца тая, пра якую кажуць: «Шалёная куля пільнуе салдата». Але ёсць і яшчэ адзін сэнс. Куля — напаўзабыты сінонім Зямнога Шара. Гэтага самага, нашага, дзе «гвалт душы кволыя гне», дзе імкнецца правіць баль «дурных пустадомкаў ігрышча». Вось адкуль і вызначальнае пытанне паэта:

*«Куды ты нясешся на злом галавы,*
*Планета няўдзячных —*
*Шалёная Куля?»*

Але — жыццю застаецца надзея. І верш «Надзея» пэўным чынам абнадзейвае, нясе супакаенне: «Апошняю надзея памірае…» — аднак тут жа трывожна пытаецца: «А што, калі і сапраўды — памрэ?..»

Такая місія ў паэзіі: пытацца, пытацца, пытацца… Адказы шукаць чалавеку. Нагтое даецца яму жыццё, а разам з ім — надзея, — крэўныя, вечныя спадарожнікі. І супернікі…

НАЧЫРКІ

# СУЧАСНАСЦЬ І МАНА

◂ **Працяг.**
**Пачатак на стар. 1 (9).**

Сёння — пенсіянер, звольнены ў запас з правам нашэння вайсковай формы. Каб не ўпалохаць земляка, прыйшоў-такі на сустрэчу ў цывільным. Ён — са мсціслаўшчыны. Я — нарадзіўся паблізу Прапойску, які з усохла-лёгкай рукі Сталіна стаў Слаўгарадам.

Пагаварылі. Адстаўнік запрасіў мяне да сябе, і я не адмовіўся — дзён праз колькі сабраўся і наведаў яго.

Піша чалавек раман. Абклаўся беларускімі слоўнікамі. На пісьмовым стале — даволі зручная пішучая машынка, трафейная. Жыве адзін у прасторнай трохпакаёўцы (жонка памерла, дачка прыходзіць і гатуе абед). З акна спальні відзён скверык Янкі Купалы. І мне падумалася: «А ці не ў зяленеве гэтай пашанотна-чароўнай выспы, прыснулы на лаўцы адстаўнік, раптам ачнуўся ад таго, што на яго плячук даверліва скокнула хвастатае дзіва — тая самая вавёрка, якую бачыў я адноічы ў суцэмку каля фантана з хлопчыкам і жабкамі — піла ваду. Зверана ўскалыхнула кволую брынь пачуццяў у душы ветэрана — і сненні пайшлі... Ды якія!»



перад імі, што ён сёння — самы выбітны празаік, піша лепей і за таго, і за гэтага. І я сказаў яму: «Шаноўны! Калі б выдаў тую сваю кніжку, ухваленую падбрэхічамі, дзе на кожнай старонцы не абыходзілася без пошлага любоцця ды п'янак, то цябе аніколі не ўзялі б на працу ў апарат ЦК, і не выдаў бы пасля свой двухтомнік на блаце, і сёння не было б чым пахваляцца».

Здаецца, зноў шкрабянуў паўкласіка за жывое, каб зразумеў, што дачасна закапыліў нос — трэба і далей плугаваць на ўсю моц свайго таленту.

Карацей, выводзіць разгубленага творцу з задужана-ленай бясплённасці пажадана неўтароп, удумна. Не ўдаецца добрай парадай раскатурхаць, што ж, можна ўз'ярэпіць калючым доціпам — зачытаць ці то моўны агрэх (Пятрук апрануў штаны), ці наўпрост назваць глухім на думку (спрацоўвае!). І як толькі ў вачах ганарліўца, быццам у таго быка падчас карыды, пачынае нагортвацца гнеў — уцякай. Былі выпадкі, калі амбітныя пачаткоўцы пускалі ў ход кулакі, каб хоць гэтак сцвердзіць сябе.

Нават таленавіты аўтар часам затойвае крыўду, хоць бы й за тое, што нехта-нейкі ведае яго некалішнія агрэхі росту. Вось і лучае быць на ўзроўні, не папускаецца. І няхай даказвае, што ён не абы-хто. Няхай хвалюецца, артачыцца.

Зрэшты, вышэй згаданы шчупак-паўкласік, бачу, як ухапіў тады нажыўку на творчы рост, заглынуў напоўніцу, з кручком, дык і сёння ўсё яшчэ пружыніцца, цягне стрункі пахлісень у глыб варушка-млявага роіла доннай вады.

Мне па сэрцу яго руплівасць.

Аж во як — жартую! У даваенне наўрад каб да жартаў было пры сустрэчы з чэкістам-нкусаўцам, дарма што і земляком. І не толькі жартую — ужо цвёрда веру ў тое, што моўныя гены й сапраўды ёсць. А ў дадатак яшчэ і радуюся: да нашае творчай суполкі далучыўся (акурат з вядзьмарскай пячуры вылез на белы свет) беларускамоўны аўтар, хоць і не малады, аднак жа порах у парахаўніцы сухім трымае.

Вырачэнцы-здрайцы з матчынай моваю развітваюцца самахоць, ужо шчаслівыя тым, што, па іх разуменні, заадно пазбаўлюцца і ўдаўнёнага пакутна-няпэўнага стану нібы другаснасці сваёй, а дакладней — той збаёднай ролі «меншага» брата, якім бы засёды хацелі бачыць беларуса і расейскія ультра-нацыяналы, і так званая рэвалюцыйная шуядзь замежных гайсуноў — аматараў да звыклых — хлебам не кармі! — паказальна-вулічных шэсцяў з апрыкла-замусоленымі харугвамі ды бравурнымі ўзгаласамі набіўшага аскоміну слова свабода.

## Вывесці з бясплённасці

Ёсць як бы лянівыя таленты, а хутчэй — заэнайкі, платва-верхаводка: абы паказацца на вочы, вільнуць хвастом... І ўсё ж, можна прымусіць і гэткіх «плывуноў» заглыбіцца ў творчы віракрут. Дапамагае часам тое, што напачатку ляніўца-сузіральніка трэба нечым добра дапячы, узлаваць.

Калі шчыра, дык мне ўсё ж удалося таму-сяму, акурат смаргонскаму мядзведзю, падсмаліць пяткі. Адзін такі «выхаванец», сёння недзе ўжо блізкі да паўкласіка, якому некалі давялося сваю першую кніжку (я ўхваліў усяго тры апавяданні) пералапачваць занава, падпіўшы на фуршэце пасля прыёму ў СП чарговай партыі маладых творцаў, пахваляўся

## Сучаснасць і мана

Варта нават похапкам зазірнуць у чарнавы варыянт падручніка роднай гісторыі — і адразу відаць: мінулае — трывалы падмурак сённяшняму дню; яно не толькі высвечвае пралікі й памылкі нашых продкаў, але і выразна акрэслівае наступнікам новыя перспектывы.

Ведаць сапраўдную гісторыю роднага краю кожны з нас, беларусаў, абавязаны. І ў гэтым пакуль што ў першую чаргу можа дапамагчы — і дапамагае! — мастацкая літаратура, бо сама гісторыя як навука даўно скампраметаваная і мусіць пісацца занава. Яе шматлікія псеўдадаследчыкі займаліся адно ўвекавечваннем спадчыны скарасспелых палітыкаў.

Шмат якія «трубадуры», лёгкія на пад'ём, не-не, дый сёння ўзносяць горн над сабою — злаўчаюцца пратрубіць так, каб звярнуць на сябе ўвагу прыўладнай эліты і такім чынам патрапіць у шэраговы авангард правафланговых. Згадаем хоць бы й гарбачоўскую перабудову. Дападным сённяшнім ідэолагам не лішне было б зразумець галоўнае: колішнія прамарксісцкія «куміры» бадай назаўсёды канулі ў нябыт, а вось былыя вязні яжоўска-берыеўскіх лагераў смерці, рупліва аднОўленыя ў сваіх правах, сталі зноў паўнапраўнымі й роўнымі сярод роўных.

Сёння, зрэшты, знайшлі свайго чытача і тыя раманы, аповесці, апавяданні, паэмы й вершы, навуковыя працы, што ляжалі не толькі ў «спецхронах», але і ў шуфлядах пісьмовых сталоў знарок зацененых аўтараў, якія былі проста няўручнымі, як бы непатрэбнымі падчас брэжнеўска-суслаўскага самаўладдзя.

Пісьменніку нішто не павінна замінаць. Ні добры выдавец, ні дрэнны. Не бяруць у друк, адмовілі — ёсць на тое скрыня рабочага стала. Парада маладым: пісьмовыя сталы набывайце вялікія, з мноствам адсекаў і шуфлядаў — спатрэбяцца. Рукапісы не толькі не гараць, але маюць звычай нейкім чынам і ў друк трапляць.

Гісторыя — брычка на рысорах: на калдобінах мякка падскоквае, і начальніку ў ёй сядзець зручна і ўтульна, закалыхвае. Так было, так і ёсць. Паства пяшкуе. Пастыры едуць. І, канешне, ужо не ў брычках, а ў шыкоўных лімузінах. Час вымагае. Савецкая гісторыя пісалася пераважна прыўладнікамі. І абавязкова — пад некага: пад Леніна-Сталіна, пад Хрушчова, пад Брэжнева, пад Гарбачова, Ельцына...

Так было раней, пры кіраўнічых монстрах інтэрнацыяналізму. Не хацелася б, каб тое ж самае і сёння паўтаралася — пры ўладзе нацыянал-дэмакратаў ці якой там яшчэ, хай і нявызначанай пакуль, з наваслеп запаволеным рухам наперад.

Як ні дзіўна, гісторыя працягвае хварэць на сухоты — з яе лёгкіх не сыходзяць чорныя пухіры хлусні й падтасовак.

## Размова былых паліцаяў

*Ніколі яшчэ ў свеце не было людзей, якіх бы так любілі й так ненавідзелі, як любяць і ненавідзяць бальшавікоў.*
***Максім Горкі.***

— Беларуса цяжка зламаць — ён, бы дубчык: і гнецца, і ў адскоку б'еццa. З габрэямі прасцей было — за хобат і павалок. Зяму Коўзу, які ў грамадзянскую камісарам быў, пасля — шаўцом, і добрыя боты бацьку майму змастачыў, убачыў я ў растрэльнай калоне і мусіў выратаваць. Хоць і бальшавік, але ж — няхай, думаю, жыве. Аддзяліў яго ад астатніх, каб адвесці ўбок. Пачатаваў канвойнага цыгарэтай і сказаў, што з гэтым ахламонам сам разбяруся — спачатку з дзясятак шампалоў урэжу, а тады й кокну. Значыць, завёў Зяму ў лес, тоўхнуў у спіну: «Бяжы! А я стрэлю, каб рэха данесла, што забіў цябе». Дык ён — чуеш? — павярнуўся і як плюхне мне ў вочы харкавіннем!

— Не ўрубіўся — палічыў, што напраўду застрэліш... І ты яго адпусціў, канешне. Даравяў плявок?

— Я пяць куль у яго ўсадзіў!.. Руку прастрэліў, нагу, вуха, па яйцах садануў. Курчыцца бальшавічок ад болю, а не просіцца, каб пашкадзіў.

— Так зругваўся?.. Я не змог бы.

— Апошняй куляю прадзіравіў лабацінy, дабіў. Стаю. І шкада мне яго, і за плявок ад злосці аж у падскок кідае. Мусіў усё ж закапаць, каб вароны вочы не выдзяўбалі. Я заўсёды салдацкую лапатку насіў на поясе, зручная. Калі што — залёг, акапаўся і вядзі бой. Ну, і тут, значыць, шах-шах па-хуткаму, труп — у ямку, прысыпаў пяском, шыгалля нагарнуў. Так што, я за сабою слядоў не пакідаў.

— А я — нікога не забіў, ніводнай хаты нідзе не спаліў, а мне ўпаялі за паліцэйства дванаццаць гадоў. Бач, цябе на дзесяць асудзілі.

— Дык жа ніхто пра Зяму не ведаў. Тых габрэяў завялі ў Ямішча і знішчылі. Нават не абшукалі. Хто ж думаў, што ў іх лахманах золата ўшыта. Гэта пасля сталі дагала распранаць...

— Слухаю цябе і сваім вушам не веру: ты мне вось узяў і адкрыўся. З чаго б такое?

— Бо аднаго поля ягады. У-у, каб пра ўсё, што мы тады вычваралі, ды было вядома суддзям — нас бы, такіх вось бобікаў, як я ды ты, на горкай асіне мала павесіць. Я і сёння вінаваты, без спасылак на даўнасць... А калі папраўдзе, то мяне ўзвінціў учорашні выступака.

— Я не быў у клубе, у Гомель ездзіў.

— Пісьменнік... Землячок заявіўся!

— Ну-ну, цікава.

— І во што ён сказаў: партызаны, значыць, і паліцаі змагаліся за вольную ад бальшавікоў Беларусь. Таму іх трэба ўраўняць у правах. Выходзіць, нам з табой сёння можна медалі ўручаць.

— Во аж як?!.

— Я ў перапынку пагаварыў з зямелем. «Іванавіч, — кажу, — з тваім дзядзькам Нічыпарам, былым настаўнікам, мы ў тайзе нейкі час у адным бараку жылі...» Пачуў ён пра дзядзьку, расчуліўся, слёзы пусціў. Стаў прасіць мяне: «Вы мне падрабязна раскажыце, як ваявалі з бальшавізмам, як усё на самай справе было — напішу раман. Сёння — не ўчора, час памяняўся».

— Ух ты! Пісака з заскокамі. Але ж, ці разумее ён, што, калі б немцы перамаглі, то ў былых партызанаў такой волі, як у нас цяпер, і блізка не было б. Дарма сёння Гітлера са Сталінам раўняюць.

— Дзядзька яго, Нічыпар, служыў у пастарунку пісарам — аўсваісы выпісваў, пратаколы допытаў вёў. Відаць жа, ублагаў немчуру як след, за што і быў пазбаўлены волі на пятнаццаць гадоў. Зарабіў ад савецкай улады пахлешчы, чымся мы. Ён, праўда, доўга не працягнуў — памёр, не вытрымаў сібірскіх маразоў ды фізічнай працы. Інтэлігенцік. Колькі разоў яму траплялa маім напарнікам быць. Помню, пілуем лістоўніцу, а ў яго ад напругі аж вочы на лоб выскокваюць, так чалавеку цяжка.

— І што ж ты плямяшу яго сказаў?

— Параіў, каб прайшоўся да Ямішча і пабачыў, як там бадай штолета корпаюцца падлеткі — шукаюць у раскопах габрэйскае золата.

— А знаеш — знаходзяць!.. Унук завушніцы прынёс і два пярсцёнкі. Праўда, я здаў іх у міліцыю. Сталі ганяць падшыванцаў. Унучок мой — о-о! — дужа пакрыўдзіўся на мяне — аскірзаецца, слова не дае сказаць. Бацькава папруга пагуляла-такі па яго распешчанай гузцы — выў, як звер, кусаўся. Такі вось аскалёбак, калі што-якое — куды заўгодна ўступіць, у любую хеўру, абы яго паманілі й забабілі чым.

— Нічога страшнага ў гэтым не бачу — гатовы кантрактнік: за грошы на злом галавы пойдзе. Во будзе армія!

## Суседкі

— Божа-божа, я так глядзела за ім!.. Сарочкі мыла як не штодня, паласкала ў крынічнай вадзе. Французскімі духамі кропіла, калі прасавала... Арамат!

— Ты хочаш і мне нараіць, каб і я гэтак жа мудохалася, сціраючы Грышку свайму парткі засюканыя?

— Ды не, суседачка, не. Гэта ж, не магу адна камень з душы зрушыць... Песта мой, анёлак, ужо тыдзень як сыйшоў з дому. Зняхаўся з пігаліцай. І дзе — у бальніцы, калі з грыжай ляжаў. Глянуўся той самай дакторцы, якая аперацыю рабіла. Туйбеня на маладое пацягнула. Заявіў: «Не пярэч і не плач, я ўжо не вярнуся». А мне, знаеш, і няма чым крыць: бяздзетная, аборт паўліяў. Што ж бы ў акушэрню паказацца, а я, каб агалоска не пайшла, вуна, ажно ў Доўгію папёрлася, да Цімунізі. Яна й праварснула матку, рубец там... Цяпер во — хоць локці кусай. Думалася, год-два пацешымся, палюбуемся адно адным, а ўжо тады й дзяцьмі зоймемся.

— Ды няхай іх, абыдвух, пад лёд зацягне — і сэрцаеда твайго, і яго палюбоўніцу!

— Не кажы так, суседачка, грэх... Во кінешся заўтра на кірмаш праз рэчку напрамкі — ты ж лянівая, на мост кружна бегаць, а лёд — шах, асядзе пад табой, і захурхоліш на дно за свой язык дасужы.

## Абсяг харасства

Мастацтва якраз у тых абсягах і жыве, дзе затрачана шмат часу на пошук і ўкладзена добрая доля працы духоўнай і ўсяго таго, што багата наша ўяўленне — гэтая мітусліва-няўлоўная птушка, што змалку лунае ў нашай памяці й позыўна кліча ў пазаразальна-чароўны свет харасства.

Мастацтва — дружалюбны саюз розуму, сумлення і працы, плюс апантанасць таленту і пачуццё меры.

ВЯНОК

# ПАЛЕСКІ МАТЫЛЬ

**Сканаў яшчэ адзін беларускі паэт. Іван Лагвіновіч. Больш як дзесяць гадоў эпісталярна-тэлефоннага знаёмства дае мне права казаць пра яго самога і яго паэтычны плён без асаблівай суб'ектыўнай пагрэшнасці. Хоць бачыліся мы (мімаходзь) толькі аднойчы. Такая геаграфічная аддаленасць кампенсавалася нязмушанымі літаратурнымі стасункамі. Да таго ж, бацькаўшчына Івана Ліпавіча (Ганцаўшчына) зусім непадалёк маёй радзімы (Клеччыны). Можна сказаць, што ўмоўна нас раздзялялі толькі дзесяць гадоў розніцы ва ўзросце ды густая сцяна Машукоўскага лесу. Але землякія акалічнасці пэўным чынам і збліжалі — знаёмым жыццёвым побытам, дыялектам і фальклорам, а таксама адметным народным мыслярствам і своеасаблівай метафорыкай.**



Іван Лагвіновіч адну палову са сваіх сямідзесяці пражытых гадоў правёў у цёмных штольнях Данбаса, а другую — у творчым паўзмроку савецкай кватэры, мала чым адрознай ад тых шахцёрскіх штольняў... Вясковы па нараджэнні, выхаваны ў традыцыйным нацыянальным духу, ён выгадаваў у сабе натхнёную творчую натуру. Пісаў са школы (меў няпоўную сярэднюю адукацыю і прафтэхвучылішча), на самым пачатку 1960-х пачаў друкавацца ў газеце «Чырвоная змена». Шмат часу аддаваў самаадукацыі: засвойваў літаратурныя азы, выпрацоўваў уласны стыль, спасцігаў класічныя і навейшыя мастацкія ўзоры беларускай і сусветнай паэзіі. Пры гэтым застаючыся самабытным. Друкаваўся ў мясцовых калектыўных зборніках.

Настальгія па Айчыне сталася для яго неадольнай пакутай. З часу перабудовы прыцягвала рамантычнае святло яе маладой, няведама кім раскілзанай, незалежнасці ды шчарбаты ганак незабыўнага і па-свойму шчаслівага паваеннага дзяцінства... І ў 1991 годдзе ён перабіраецца на жыхарства ў Баранавічы. Але не паспеў наш суверэнны Янка адсапціся з дарогі на бацькоўскіх кажухах, як святло патушылі і тут...

О, гэты спрадвечны беларускі вырак, што робіць з нас свядомых духоўных ізгояў пасярод аблогаў роднай Айчыны!.. Таму, заціўшыся ў самай глыбіні свайго непакорнага сэрца, мы робімся заклятымі барацьбітамі за сваю чалавечую самасць наперакор усяму беламу свету...

Менавіта адтуль — з сэрца, загартаванага на пякельным агні спрадвечнай любові — нашы бацькі і маці, Пракорі і Паэты, геніі і графаманы, аратыя і царазабойцы, вынаходнікі і валацугі, мецэнаты і жабракі, на якіх трымаецца наша нацыянальная неўміручасць...

*Трубадуры, дзьміце ў трубы,*
*марш Свабоды выдзімайце!*
*Цішыня пакоры — згуба.*
*Памятайце: вы — на варце!*
*Абуджайце край знямелы*
*ад зямлі да паднябесся.*
*Хай над бел-чырвона-белым*
*сцягам*
*акрыяе песня...*

Сёння, напрадвесні, калі ўсё ў прыродзе цягнецца да сонца, а з-пад зямлі вонкі выходзяць парасткі жыцця, неймаверна цяжка думаць і пісаць пра смерць чалавека. Тым больш яшчэ не надта старога. Хіба што прызванне яго — Паэт — схіляе да падобнай магчымасці і нават непазбежнасці такога сыходу (бо сапраўдныя творцы зазвычай недаўгавечныя).

Іван Ліпавіч Лагвіновіч (16.01.1940 — 29.03.2011) ведаў і прадчуваў свой хуткі сыход. Духоўна і душэўна рыхтаваўся сустрэць яго годна і мужна. Цяжкая падземная праца ў данбаскіх шахтах адклалася яшчэ ў маладосці на яго здароўі. Аднак наперакор хваробе ён быў добрасумленным і шчырым хрысціянінам (уніятам па веравызнанні, пакінуў шмат адметных твораў на рэлігійную тэму). Маючы, па нашых мерках, неблагую шахцёрскую пенсію, шмат каму з людзей дапамагаў матэрыяльна, асабліва сваім баранавіцкім калегам у святой справе нацыянальнага адраджэння. Падпісваўся ці не на ўсе беларускамоўныя літаратурныя выданні. Быў простым, бясхітрасным, бескарыслівым чалавекам у любых жыццёвых варунках. Ціхая спагадлівасць да людскога свету была дамінантнай у яго нялёгкім жыцці.

Ёсць паэты і пісьменнікі, літаратурныя тэксты якіх чытаеш толькі пры адпаведным настроі душы, як бы «дыхаючы» ва ўнісон іх творчасці... Праўда, падобнае азарэнне здараецца не так часта, каб пра тое гаварыць абагулена, бо і сама літаратура, як адзін з відаў мастацтва — хай сабе й на ўзроўні любові ці толькі часовага захаплення — справа абсалютна індывідуальная. Іван Лагвіновіч, усведамляючы сябе як паэта і маючы ўяўленне пра свой талент, ставіўся да ўласнага прызвання як да замольвання грахоў перад Усявышнім, які надзяліў яго правам голасу і слова. Не пожадам ухвалы і славы, а магчымасцю духоўнага ачышчэння праз пакуты творчага азарэння была акрэсленая ім яго ўласная місія на гэтай зямлі. На жаль, такія (непаказныя на публіку) таленты рэдка калі заўважаюцца, і часам бывае, што літаратурны працэс змывае іх сваім цячэннем, як вясновы паводак падмывае і цягне за сабой адзінокае дрэва са схілу нетрывалага тарфянага берагу... Дзякаваць Богу, з Іванам Лагвіновічам да такой бяды не дайшло. Лепшае з напісанага ім не асела мутным ілам на дно літаратурнага русла. Выдаў ён пяць вершаваных зборнікаў («Разлукі выраёвыя», «Піліпаўка», «Далёкае і блізкае», «Ляда юдолі» і «Палыновыя кветкі»), яго творы былі змешчаны і ў шырокавядомай важкай анталогіі беларускай паэзіі XX стагоддзя «Краса і сіла». (Рыхтуецца да друку пасмяротная кніжка «Элегія палескага матыля».)

Яго паэтычны плён заўважны кожнаму неабыякаваму чытацкаму воку, чуйны кожнай уважнай душы сваім незнарочыстым натуральным гучаннем. Да таго, дзякуючы сваёй паэтычнай непадробнасці і асабістай лірычнай самотлівасці, некаторыя яго вершы маюць адметны класічна-хрэстаматыйны характар. Яго творы, традыцыйныя ў мысленні і стрымана-пачуццёвыя ў метафорыцы, заўжды адмыслова ўкладзеныя ў рознамерныя кідка-запамінальныя формы. Пошук гармоніі надае яго творам давер у і разумення.

Мне ўжо даводзілася пісаць пра яго творчасць. І вось сёння наноў перачытаў тыя тэксты і лепшыя вершы паэта... Шчымлівым болем працяла думка: Госпадзе, а яшчэ ж учора... Так-так, было жывое ліставанне, тэлефонныя глыбокія, эмацыйна-прыглушаныя размовы, паразуменне з паўслова, спадзевы на сустрэчу... Калі адыходзяць такія людзі, як ён, пачынаеш адчуваць сябе неяк бездапаможна і сіратліва, прынамсі, у літаратуры. Таму мой жаль і шкадаванне непамысныя...

Прабач, Іване, хай Бог пазнае цябе Там і прывеціць. І хай будзе пухам праху тваіму радзімная зямля на могілках у Малкавічах, у месцы, якое завецца тваімі землякамі так паэтычна і прыгожа — Красунь...

**Леанід ГАЛУБОВІЧ**

# ЧЫСТАЯ ЛЮБОЎ

**Іван ЛАГВІНОВІЧ**

## Малітва беларуса

*Святы Божа, святы моцны,*
*святы несмяротны!*
*Пакажы нам шлях збавення –*
*годны, незваротны.*

*Абаронца справядлівы*
*і суддзя праўдзівы –*
*бездакорны, незаменны,*
*на ўвесь свет адзіны!*

*Ты — найпершы й найапошні,*
*Божа ўсюдыісны!*
*Бачыш нашага бязладдзя*
*выступы-крывізны.*

*Знаеш нашых змрочных думак*
*хібы і заганы,*
*як вакол няшчасцяў-бедаў*
*ходзім мы кругамі.*

*Заблудзіліся ў грахоўных*
*лабірынтах цемры:*
*кветку-папараць шукалі*
*ў зарасніках церняў.*

*Прымушалі нас маліцца*
*ідалам вар'яцкім,*
*зняважалі, выганялі*
*з цэркваў уніяцкіх.*

*Міласэрны, добры Божа!*
*Дай надзею — грэшным,*
*выведзі з палону здзекаў,*
*ацалі, суцеш нас;*

*бо Ты ведаеш, якія*
*мы панеслі страты*
*на шляху да лепшай долі,*
*да святла і праўды.*

*Уладару ўсемагутны!*
*Будзь заўсёды з намі,*
*памажы на землях продкаў*
*стаць гаспадарамі.*

*Навучы на роднай мове*
*гаварыць і слухаць.*
*у імя Айца, і Сына,*
*і Святога Духа.*
*Амін.*

***

*Спачатку я ў кватэры*
*прыбяруся:*
*памыю «пасівелую» падлогу,*
*павыціраю пыл і павуцінне,*
*стол засцялю абрусам светлым.*

*Затым умыюся і сам*
*з сунічным пахкім мылам,*
*адзену беласнежную кашулю*
*і лепшы свой, святочны гарнітур.*

*Стварыўшы знак крыжа перад*
*сабою,*
*прачулую малітву прачытаю,*
*спагадлівага Бога папрашу,*
*каб даў натхнення.*

*І з чыстым сэрцам,*
*чыстымі рукамі*
*вазьму я чысты ліст паперы,*
*за чысты стол пісьмовы сяду*
*ў пакоі чыстым*
*і запішу лірычны верш*
*пра чыстую любоў*
*да Беларусі.*

***

*Шчырых аднадумцаў-аднаверцаў,*
*Крытыкаў-дарадцаў не стае…*
*Чарнавыя варыянты вершаў*
*«даспяваць» пакіну на стале*
*І пайду на водар медуніцы,*
*Покуль дзіўны кветнік не завяў.*
*Там сярэбранае дно ў крыніцы,*
*Залатое горла ў салаўя.*
*Пеюна таго Гадулька слухаў,*
*Сахарчук з тае крыніцы піў…*
*Прэч з вачэй маіх назола-скруха!*
*Не марудзь, дарогу саступі.*

***

*Над сціплай вясковай хатай,*
*Над гордым сталічным гмахам,*
*Над папараццю і мятай,*
*Над зверам лясным і птахам —*
*Бурштынавы звон.*
*Адкуль ён?*
*На неба зірнуў і ўспомніў:*
*Мікола Купрэеў кульбай*
*Пастукаў у бубен поўні.*

## Пісьмёны

*Бярозы над крушняй*
*Раскінулі кроны*
*Люляць калыскова*
*Птушыныя звоны.*

*Пергамент кары*
*Ў завірухах дублёны,*
*І час-летапісец*
*Пакінуў пісьмёны —*

*Прымальныя для*
*Карыстання законы,*
*Прыемныя для*
*Вымаўлення імёны.*

*Цэнзурай на друк*
*Не было забароны*
*Ні з боку салоўкі,*
*Ні з боку вароны.*

***

*Яе чакалі на Парнасе*
*Прызнанне, слава і хвала.*
*Аднак у іх не адбылася*
*Сустрэча: дзеўка запіла…*

*Пераважаваная штодзённай*
*Псеўдадухоўнаю іржой,*
*Пайшла за марай ілюзорнай,*
*Перасварыўшыся з душой.*

*Ад дабрабыту да галечы*
*Адлегласць змерала яна.*
*І я купіў ёй пры сустрэчы*
*(Была няўцямнай з бадуна)*
*Бутэльку таннага віна,*
*І ўскінуў шалік свой на плечы...*

## Туга

*Затопленыя берагі,*
*размыты ўсе мае дарогі...*
*Я сёння п'ю віно тугі*
*і ем счарсцвелы хлеб трывогі.*

*Бывай, прасторны вольны свет!*
*Бывайце, вежы на пагорках!*
*Пішу адчайны запавет:*
*дым Бацькаўшчыны стаў мне горкі.*

*Упала зорачка мая*
*на воды цёмныя патопу;*
*і з поля зроку знік маяк,*
*што асвятляў акно ў Еўропу.*

*Затопленыя берагі,*
*размыты ўсе мае дарогі...*
*Я сёння п'ю віно тугі*
*і ем счарсцвелы хлеб трывогі.*

## Дудар іграў

*Адгадуй валасы да пояса,*
*падзялі на тры часткі роўныя,*
*запляці парой сенакоснаю*
*разам з промнямі сонца яснага*
*і касою той, што не клеплецца*
*і не вострыцца, бо не тупіцца,*
*пакасі на палетку ростані*
*пустазелле маёй журбы.*

***

*Зноў чую трубны голас з неба*
*і адчуваю цвердзь зямлі.*
*Збяры сяго-таго да хлеба,*
*віна расстайнага налі.*

*Пайду я...*
*Трэба слёзы ўцерці,*
*бо я спазнаў ужо з табой*
*каханне, большае за сэрца,*
*і большы за каханне боль.*

ВЕРШЫ

# РАДЗІННЫ САД

Алесь КАСКО



* * *

*Травою быў — а нехта ў небе сінім*
*сказаў: адчуй свой боль і стань мне сынам.*
*І я прайшоў шлях веры і зняверы,*
*парою грукаўся ў чужыя дзверы,*
*любіў, кахаў і зведаў смак самоты…*
*Але — што потым?*
*Я не прыму фальшывай пазалоты*
*на сэрцы і траве, што мне раднёю.*
*Мне ўсё радзей лавіць прамень над ёю,*
*часцей — сачыць за znічкавым палётам.*
*Але — што потым?*
*Былінку слова, каліва пяшчоты*
*пакіну вам, і гэта дасць мне сілы*
*змяёй не віцца ў кроку ад магілы*
*і ўдзячнасць прашаптаць нямоглым ротам.*
*Але — што потым?*
*Травінку пацалую без употы,*
*не ў гнеў Таму, чый кліч у небе сінім*
*пачуў аднойчы, каб назваца сынам.*
*І страціць сэнс адвечная турбота —*
*а потым што?..*
*Бясспрэчны і адзіны*
*адказ ёсць там, адкуль няма звароту.*

* * *

*Сваю — даснаваў я да спадчыннай долі,*
*а потым з крывёю яе адрываў*
*ад сэрца радкамі —*
*нічога не выказаў болей.*
*Я з кожнай магілай сябе крыжаваў,*
*звыкаўся з адвечнай людскою юдоллю*
*і жаль свой агучваў —*
*нічога не выказаў болей.*
*Ставала мне радасці: ветру і полю,*
*птушкам і вёснам не раз тураваў*
*сваім падгалоскам —*
*нічога не выказаў болей.*
*Я ў радасці плакаў, у болю трываў*
*і гневу свайго не трымаў у падполлі,*
*сябе я выказваў —*
*нічога не выказаў болей.*
*І музу быць лепшай, чым ёсць, не няволіў,*
*і сам ёй у рабства сябе не даваў.*
*Ці стаў я паэтам?*
*Нічога не выказаў болей,*
*чым тое, што ў лесе сваім прачытаў.*

## Недажын

*Як бы доўга ні жыць — не дажыць*
*да канца… Зноў і зноў паўстае перад намі*
*грыўка спелых жытоў — недажын,*
*што асыплецца ветрам, прыб'ецца*
*дажджамі.*

*От бы ўсё — ад зярнят да расы —*
*зберагчы і напоўніцу ўсім наталіцца!*
*Дакахаць, дапісаць… Папрасіць*
*даравання ва ўсіх, з паміраннем змірыцца.*

*Зручны быў бы няношаны ўбор,*
*і пачулі б анёлы, схіленыя нізка,*
*што гучыць літасціва не хор*
*адпявальны — то маці пяе над калыскай.*

*О, каб гэтак! Але да мяжы*
*часу меней нашмат, чым да зжатага жыта.*
*Можна загадзя ўпасці, не жыць…*
*Ды з таго і жывем, што жывем недажынам.*

* * *

*Падаюць яблыкі. Яблыкапад:*
*сіла зямлі пакідае мой сад.*
*Скочваннем звілістым ці стрымгалоў*
*яблык за яблыкам — з голля далоў.*
*Горкі, падгнілы або сакаўны —*
*паданак падае ў пыл, палыны…*

*Атарапеласцю — смутак двара:*
*яблыкам падаць яшчэ не пара;*
*ім налівацца было б самы раз —*
*не ля варот яшчэ яблычны спас.*

*Гнуцца галіны ў суседніх садах,*
*моцны, крамяны, мядовы там пах,*
*рала з антонамі цяжкімі прут*
*гордым атлантам трымае. А тут*
*падаюць яблыкі. Яблыкапад*
*губіць адзіны радзінны мой сад.*

*Вось-вось пачне шорстка падаць лісцё,*
*ліст абляціць — і застыне жыццё*
*не на зіму, ды і не на гады:*
*саду майму не вярнуцца сюды,*
*як не вярнуліся продкі мае…*
*Сад мой бязлюдны, час настае.*

*Голля, бы рук, не заломвае сад,*
*свеціць з паўзмроку ягоны пагляд*
*зрэнкамі яблык з-пад веяў-лісця:*
*жаль у ім ёсць, ды няма страхацця.*
*Зведаў пад бурамі ён, што і ў дрэў —*
*час толькі свой, хоць знянацку заспеў.*
*Дык і сыходзіць (і я разам з ім)*
*яблык за яблыкам — крокам глухім.*
*Ціхі, без лямансу яблыкапад…*
*Дзякуй за мудрасць, мой спадчынны сад.*

* * *

*Чым менш застаецца да роднага дому,*
*тым больш краявід адчужае знаёмы.*
*Яго пазнаеш па купчастых аблоках,*
*высокіх, як памяць, і чыстых, як вока.*
*Яны — міражы, што паўсталі з маленства,*
*а ўнізе — а ўнізе ўсё менш падабенства*
*з абрысамі мяккіх аблокаў-лятункаў:*
*як шмат тут груваcткіх,*
*няўклюдных малюнкаў.*

*Ці гэта разрыў між гадамі вялізны,*
*ці проста гляджу праз халодную прызму?*
*Ва ўзгорка бязлесага конусны выгляд,*
*канавы-трапецыі сціснулі выган,*
*дарога запала пад пліты-квадраты,*
*без колішніх дрэў вуглаватыя хаты*
*панура цікуюць кубічны аўтобус...*
*А ў школьным акне — яшчэ круглы ўсё глобус.*

* * *

*Свісне рак — і ўсё. І ўсё збудзецца!*
*Хто адвеку спаў, той абудзіцца,*
*блудны сын дамоў тут жа вернецца,*
*у вачах сляпцоў змрок развеецца.*
*Будзе так: бядняк есць напоўніцы,*
*вольным — воля свет, здольным — творыцца.*
*Дым з фабрычных труб пахне свежасцю,*
*кожны ў полі дуб — роўны з вежаю.*
*Хто піў моцнае — п'е маркоўнае,*
*і паўсюль усе — памяркоўныя.*
*Аж крывое-хіжак стане правільным,*
*і паміраецца Каін з Авелем…*
*— Дзе ж той рак, аднак? Ці не свішчацца?*
*— А табе, лайдак, лёгка пішацца?..*

## Змяіны кароль у 2010 годзе

***Як толькі хацелі сарваць з яго карону,***
***з усіх бакоў набегла незлічонае***
***мноства змей.***
***З падання***

*На зыходзе быў год, ды з ім разам не знік,*
*ледзь засведчыўся на небасхіле*
*спадзяваннеяў людскіх. Дапатопны*
*рэлікт*
*не ў пячоры засеў, не ў магіле.*

*У гадзіннік-куранты залез ліхадзей*
*і званіў стуль, і сыкаў пра тое,*
*што яму, наймудрэйшаму гаду, відней*
*недалёкае шчасце людское.*

*Слінай пырскаў, і аж да святое зары*
*пырскі тыя змяіліся плодна*
*ў шумавінні шампанскага, у мішуры,*
*у шыпенні бенгальскім халодным.*

*Быў паўсюль яго след; хлеб труціў*
*на стале,*
*колкім страхам сцякаў з мяккіх спінаў…*
*…І змыкаліся стрэлкі-нажніцы, але*
*прышчаміць не змаглі — хвост пакінуў.*

## Раўнавага

*1. Скінуў белы лебедзь*
*мне белае пяро,*
*скінуў белы бусел*
*мне белае пяро,*
*скінуў белы голуб*
*мне белае пяро…*
*Скінуў чорны воран*
*мне чорнае пяро —*
*аж тады ўзляцеў я.*

*2. Маю ўсяго па долі:*
*долю радасці —*
*долю болю,*
*долю веры —*
*долю зняверанасці,*
*долю памяці —*
*долю забыцця…*
*Хто мне скажа,*
*што — абяздолены?*

*3. Пакідаў тлум горада*
*ценем панурым.*
*Іду з улоння прыроды —*
*намармытваю песню:*
*ці з таго,*
*што спазнаўся з воляю,*
*ці з таго,*
*што да людзей вяртаюся…*

## Піліпаўская ноч

*Па дарозе да шашы*
*аніводнае душы.*
*Не адну прайдзі вярсту,*
*знойдзеш толькі пустату.*

*Знойдзеш толькі пыл, пясок*
*ды бяздушны воўчы змрок.*

*Вычысць памяць дабяла,*
*а ўсумнішся, ці была*
*хоць калісьці,*
*хоць спярша*
*і ў тваёй душы душа.*

*Дзесь у небе ёсць адна,*
*ды і тая не відна*
*ў цемры, бездані, цішы...*

*Спынішся наўскрай шашы.*
*«Хто там?» —*
*выгукнеш у змрок.*
*«Гэта я», — адкажа воўк.*

## Памяць

*Святлее снег, цямнее неба,*
*прамень і цень на гарызонце*
*змыкаюцца. Садзіцца сонца.*
*І гэта ўсё, што сёння трэба.*

*Зарука згадак — луста хлеба,*
*маўклівы стол, цярплівы чайнік.*
*Немітуслівa. Незвычайна.*
*І гэта ўсё, што сёння трэба.*

*Нібы няспешлівы малебен:*
*гадзіннік счытвае ўспаміны*
*пра нашы з сябрам пуцявіны.*
*І гэта ўсё, што сёння трэба.*

*Ён зрокся шляху… Як сагрэў бы*
*сяброў непамінальны вечар,*
*дзе ўсё было б, што трэба вечна,*
*а сёння — на часіну трэба!*

## Простая астралогія

*Шляхам Птушыным да Мілавіцы*
*спяшаецца Вознік — павек не даедзе.*
*Бачыш: перакуліліся адзін за адным*
*Воз Вялікі, а воддаль — Малы?..*

*Гэта і ўсё, што я здолеў сказаць*
*у думках табе ў тую ноч,*
*калі дзесьці далёка і ты*
*самотна ўзіралася ў зорнае неба.*

* * *

*Зорка з даўнасці… Хто ты: вітанне*
*ці прароцтва? Дакор або ветласць?*
*Ці ты ярка-нямое пытанне*
*вочы ў вочы: чым спраўдзіцца вечнасць?*

*Зноў і зноў неспатольную фразу*
*паўтараць — і не будзе залішне,*
*каб ісці па прыступках адказу,*
*які мае адзін Усявышні.*

*Ці дайду? Ці за крайняй прыступкай*
*шлях абернецца вынікам марным:*
*там — нічога, нат зоркі над пусткай,*
*зоркі з даўняе веры і мары?..*

## Фрагменты

*1. Вярнуўся ў кут продкаў*
*шукаць сваё сэрца —*
*сталымі гадамі жыву без яго*
*ці з сэрцам,*
*перасаджаным ад каменя.*

*Пад маімі нагамі*
*камянелі травінкі на чорным асфальце;*
*аб мяне разбіваліся птушкі,*
*пранізаныя сцюжаю*
*невядома калі ахалолых вачэй.*

*Я праходзіў скрозь абалонкі людскія*
*і не пытаўся імёнаў,*
*як ніхто і ў мяне не пытаўся,*
*адно тупа і глуха грукаліся*
*камень аб камень —*
*сэрца аб сэрца...*

*Граў я калісьці на ветры —*
*струны парваліся,*
*і я майстраваў свісцёлкі гліняныя*
*з выявамі абезгалоўленых пеўнікаў;*
*хлапчук, мой нашчадак, і той*
*не выдзьме з іх ані гуку.*

*Гэтулькі часу — як,*
*як я хадзіў адранцвелы?*
*Як піў ваду*
*студзенымі сухімі вуснамі*
*і як прамаўляў імі слова?*

*Чым я жыў,*
*чым жывіў адсутнае сэрца*
*ці сэрца,*
*перасаджанае ад каменя?..*

*2. Мне няцяжка шукаць:*
*пацяжэлыя яблыні*
*галіны кладуць мне на плечы,*
*і росы (буйныя, нібы антонаўкі)*
*скочваюцца па мне —*
*сцюдзёняць да невыноснасці,*
*абпальваюць да горычы.*

*І сонца прыходзіць з-за блізкага лесу,*
*ключы аддае прамяністыя*
*ад хаты з рукамі самкнёнымі,*
*ад клуні, дзе ўгнездзілася цеплыня*
*на кожнай жардзінцы,*
*на кожнай сянніцы;*
*дзе ўночы жывуць толькі ластаўкі,*
*а ўдзень — кажаны...*

*Мне няцяжка шукаць:*
*дзве касы — мая паржавелая*
*і вострасрэбная бацькава —*
*самі скасілі быллё ў агародзе,*
*каб убачыць я здолеў сляды,*
*якія пасеяла маці на градках апошніх,*
*і на дзічцы — ката здзічэлага,*
*і сабаку, што сам*
*засіліўся на ланцугу на плоце...*

*Мне няцяжка шукаць:*
*расхрыстаны весніцы,*
*нябёсы расхрыстаны —*
*і расхрыстаны грудзі*
*для сэрца.*

АГЛЯД

# «ПРЫ ЦЬМЯНЫМ ЗЗЯННІ ЗОРНАЙ ЖЫРАНДОЛІ»

ЛеГАЛ

**У Берасці выйшаў трэці нумар літаратурнага альманаха «Жырандоля», прыўрочаны да 30-годдзя абласной філіі Саюза беларускіх пісьменнікаў. Традыцыя, запачаткаваная незабыўнай Нінай Мацяш, працягваецца яе сябрамі і калегамі. Цяперашні старшыня пісьменніцкай філіі Іван Мельнічук у прадмове да выдання піша:**

«З любоўю і павагай хілілася Яе сэрца да сяброў па творчасці, Ім Яна заўсёды гатова была прыйсці на дапамогу, не шкадуючы ўласнага часу... Нямала сілы і часу аддала яна, каб на працягу трох месяцаў сабраць, скампанаваць, адрэдагаваць і выдаць першы за паўвека ў вобласці літаратурны альманах «Жырандоля»...»

Я сам добра памятаю не толькі падрыхтоўку, але і ўвасабленне самой ідэі альманаха, бо актыўна ліставаўся з Нінай Іосіфаўнай. Вось знайшоў нашу электронную перапіску той пары. Падаю вытрымкі з яе лістоў у храналагічным парадку:

«...фінансаваньне альманаха (не сурочыць бы!), здаецца, выдабуду: папярэднія перамовы абнадзейваюць. І рэдагаваньне тэкстаў ідзе нармалёва, бо дасылаюць шмат, ёсьць з чаго выбіраць. І патроху, цяжка, але не бяз пэўнага посьпеху, перакладаю найбольш упадабаныя вершы ўкраінкі Аляксандры Кавалёвай з Харкава.» (6 лютага 2008);

«...а ці ня мог бы Ты даць свой артыкул пра мову Гадулькі ў наш альманах? Было б вельмі дарэчы. Па-першае, прозы ў нас няшмат, дый тая пасрэдная, як на мой густ. Па-другое, крытычных артыкулаў зусім няма, хіба Каско дашле свае развагі пра творчасьць Засіма, якому сёлета споўнілася б 100 гадоў. Па-трэцяе, Твaё моўнае дасьледаваньне мала таго, што было б унікальным матар'ялам, яно паслугавала б яшчэ й дзеля ўдасканальваньня пісьменьніцкага майстэрства, як я разумею і як мне бачыцца тое. Калі згода, дык перашлі мне, калі ласка, без асаблівай прамаруды. Ужо шчыра дзякую! Сама ж я штодня, да галавакруту, калупаюся ў чужых нешэдэўральных тэкстах — рыхтую ў альманах. Ён разьдзімаецца, як дзіцячы балёнік: у сьпісе ўжо ажно 53 аўтары — нябожчыкі і жывыя!.. Я ўжо цiпэнію, як у нас кажуць, ад жаху: і ў гумовага ж балёніка межы ёсьць! Хлопцы направа-налева раздаюць запрашэньні сваім знаёмцам, а тыя не губляюцца і не марудзяць, грузяць ды грузяць мяне, ды ўсё больш рускамоўныя. І луснула мая першапачатковая задума — выявіць гэтым альманахам аблічча перадусім нашай філіі, яе праўдзейшых сяброў ды рэкамендаваных у СБП... Пакуль збіраю ўсё да купы, а там відно будзе, што рабіць. Без крыўды ў мой бок, пэўна, не абыдзецца.» (16 лютага 2008);

«Праца над альманахам ідзе да завяршэньня. Няма толькі яшчэ тэкстаў Дашынай, Дэбішаў і допісаў пра Сахарчука з Гадулькам. (...) Вершаў шмат, паэзіі ня густа. Найбольш уразьліва прамаўляюць Лагіновіч ды Каско, моцна — Пракаповіч, ёсьць яшчэ некалькі цікавых аўтараў. Ва ўсякім разе, я спадзяюся, што любы — і абазнаны, і шараговы — чытач хоць нешта ды знойдзе суадпаведна свайму літаратурна-эстэтычнаму густу. Прынамсі, хочацца, каб так яно й было.» (10 сакавіка 2008); «...Альманах (дыск) сёньня передала ў «Кнігазбор». Засталася «дробязь»: знайсьці адпаведную суму грошай, якая, насупор абяцанкам, пакуль наўвідная...» (19 сакавіка 2008);




«А на стале ў мяне ўжо й карэктура «Жырандолі». Хлопцы сабралі грошы, бібліятэка выкупіць 200 асобнікаў (наклад 300), і альманах неўзабаве прыйдзе ў сьвет. Твае развагі пра назву, магчыма, слушныя (дарэчы, а як бы Ты абназовіў?), але і я нядатная на прыдумкі назоваў, і астатнія нічога лепшага не прапанавалі, апроч «Дзядзінца», які быў, ды «Берасьцейскага вогнішча», якое існуе як серыя. Мне вельмі падабаецца баранавіцкая «Сьвятліца», але ж... Няхай сьвецiць нашая — ад Паўлюка Багрыма — «Жырандоля», у якой ня толькі метафарычныя жаўрукі ды сьвечачкі, але й высокасьць сьвятла.» (30 сакавіка 2008);

«Дзякуй вялікі за цёплы водгук пра «Жырандолю», вельмі-вельмі прыемна было ад Твайго слоўка яшчэ да таго, як сама ўзяла ў рукі сваё «дзіцятка». Яно ўжо і ў маёй хаце. Сапраўды, файна выдаў Вінярскі. Усё, праўда, мы самі папярэдне зрыхтавалі — і вокладку, і ўсё астатняе. Але й «Кнігазбор» пастараўся, дзякуй ім усім. Цяпер рассылаю-перадаю сябрам. Акурат заехаў Амяльчук, забраў належнае берасьцейцам. Засталася перыферыя — Пінск, Лунінец, Баранавічы і г.д. Радуюся найперш сама: зрабіла сябрам велікодную радасьць! Дзякуй Табе і за інфармацыю ў ЛіМе.» (19 красавіка 2008);

«Я выдатна разумею, што ў «Жырандолі» без пахібак і з боку складальніка ды рэдактара не абыйшлося, бо й не магло абыйсьціся, усё-ткі гэта першая мая такая праца. Таму, калі ў Цябе складзецца нешта, буду толькі ўдзячная за ўсе зычлівыя заўвагі. Хоць, у прынцыпе, асабіста мне й не патрэбна нейкая публічная рэклама з нагоды гэтага выданьня. Мне даволі бачыць, адчуваць радасьць сяброў, удзячных за анталагічную выяву іхніх творчых шматгатунковых пёраў.» (1 траўня 2008)

Перачытаў і наноў захапіўся сэрца: які светлы талент адышоў ад нас!.. Суцяшае, што застаўся і цепліць нашыя сэрцы яе багаты мастацкі плён. Сёння ў нас столькі згрызотаў міжсабойных, што іншым разам рукі апускаюцца. Здаецца, вунь колькі нагоды для карпатлівай і бескарыслівай працы — і творчай, і фізічнай — у нашай нацыянальна і духоўна знямоглай Айчыне, а тут дзіву даешся, адкуль у людзей (у тым ліку і літаратараў) гэтулькі негатыўнага прагматызму і некантралюемага пожаду да грошай, славы і ўлады... На жаль, усё менш бяссрэбранікаў і творчых пакутнікаў застаецца на нашай літаратурнай ніве. З аднаго боку нехта гэтым усцешаны: а колькі ж можна лапцямі ваду хлябаць. Бо з іхняга пункту погляду, вядома, лепш мёд піць пры царскім ці замежным заможным двары, чым захлынацца ўласнай крывёй ад несусветнай зболенасці. Кожнаму — сваё (часовае), а Богу — богава (вечнае). А так як талент ад Бога, то перад заўтрашнім днём у нас не павінна быць страху. Пакуль скамарохі цешацца, самотныя ўзвышаюцца...

Гэтак і з Нінай было. Таму не раз будзем вяртацца да яе вымогаў, таленту і даробку. Яна яшчэ пачынала збіраць матэрыялы і для другога нумара «Жырандолі», але ўжо выхаду яго не дачакала. Стамілася, ссамотнілася і ўзвысілася да недасяжнасці...

І вось сёлета мала-памалу ў свет выйшаў трэці нумар літаратурнага альманаха. Укладальнікам «Жырандолі» пазначаны Аляксей Філатаў, а рэдагавалі яго на чале з Лявонам Валасюком Мікола Сянкевіч, Іван Арабейка, Алесь Каско і Мікола Папека. Пагадзіцеся, неардынарная кампанія. Здатная на любую рызыку дзеля дасягнення выніку. Таму, відаць, выданне атрымалася даволі пухлае (амаль 19 уліковых аркушаў), стракатае, і таму не асабліва вытанчанае. На першы план, думаю, выйшла: хоць бы каго не забыць і як бы каго не пакрыўдзіць (аднак, з аб'ектыўных ці суб'ектыўных прычын некалькі яркіх асобаў у альманаху ўсё ж адсутнічаюць, да прыкладу, С. Прылуцкі і Я. Дашына). Што, вядома, не скрэслівае ў цэлым важкасці і значнасці выдання. Ды і сама ганаровая кампанія самакрытычна і нават з цёплай іроніяй паставілася да магчымых жорсткіх папрокаў збоку будучых рэцэнзентаў, бо ўзяла ды й выдрукавала прысвячэнне паэта Івана Арабейкі самому ўкладальніку альманаха:

### Аляксею Філатаву

*Каб быў бы лепшым белы свет,*
*А ў душах — мір і свята,*
*Нягодных правіць Філарэт,*
*А графаманаў-недарэк,*
*Вядомых, класікаў — Філатаў.*

Той, хто ў курсе мясцовай літаратурнай кухні, той зразумее і ацэніць. Дарэчы даўно я ўжо не чытаў добрых вершаў І. Арабейкі ў друку. І вось у «Жырандолі» нарэшце адвеў душу. А то, Бог ведама, дзе запрапаў чалавек. У сваім артыкуле пра паэта Мікола Сянкевіч піша: ««Не, я не ўмёр, я ўглыб сябе зашыўся», — адказвае аўтар тым, хто паспяшаўся забыць яго імя. Ён не згубіўся і цяпер вяртаецца да актыўнай творчасці». Веру. Хоць бы зважаючы на такія афарыстычныя радкі:

*Гісторыю штудзіруючы ўпарта,*
*У рэшце рэшт — адно, што я сумекаў:*
*Ад Каіна — Батыі, Банапарты,*
*Ад Авеля — Францыскі і Дамейкі.*

Яшчэ адзін, калісь мной скрытыкаваны, паэт — Алесь Корнеў з Баранавіч таксама нечакана парадаваў даволі адметнымі радкамі:

*Мае гады — тамы бібліятэкі.*
*Выданні перачытваю старыя,*
*Ды хутка іх закрыю, як павекі...*
*Няўжо хто-небудзь іх калі адкрые?*
*А не... Ну што ж... Не запярэчу долі*
*І ў іншым свеце з тымі, што ўжо зніклі,*
*Пры цьмяным ззянні зорнай жырандолі*
*Перачытаю зноў тамы рэліквій.*

Праўда не магу не прывесці і ў гэтым выпадку прыклад «зваротнай літаратурнай сувязі». У раздзеле «Усміхнемся!» Ян Мураўскі (не ведаю, чый гэта псеўданім) выдрукаваў філігранную пародыю на не лепшыя радкі таго ж А. Корнева. Працытую, бо трымцiць падзяліцца, а заадно трохі падняць настрой чытачу-флегматыку:

### Але каб...

*«Да баб не аслаб, але каб...»*
*(Алесь Корнеў)*

*Магутны я, нібыта баабаб.*
*Працую, што той вавілонскі раб*
*У дзве, а часам нават болей змены.*
*Ну і да баб пакуль што не аслаб,*
*Баюся толькі, каб*
*Не выйшаў ляп,*
*Бо ёсць сярод спакусніц і гіены,*
*Што пакідаюць нам праблемы гігіены.*
*Вось не нарвацца на такіх хаця б!*

Нярэдка сустракаюцца ў альманаху і сапраўдныя ўзоры паэзіі чыстай красы. Запамінаюцца, чапляюць душу і розум нізкі вершаў С. Варонік, А. Белага, Дз. Рыбака, У. Глазава, І. Сцяцко, І. Мельнічука ды іншых. Прыцягвае ўвагу жывая мемуарная проза М. Мішанчука. Адметныя натуральным каларытам жыцця і літаратурным стылем кароткія тэксты А. Трафімчыка. Пачытаць ёсць што, ды і проста пагартаць і пазнаёміцца з літаратурна адоранымі людзьмі берасцейшчыны цікава. Вядома, колькасць пішучых не вызначае мастацкай якасці літаратуры, але ствараe «тусоўку», у асяроддзі якой голас кожнага асобнага пісьменніка мае хоць нейкі калегіяльны ці прыяцельскі водгук. Як вось і ў гэтым гуртавым выданні «Жырандолі». Плячом да пляча, глядзіш, — і выстаім у сённяшнім глыбокім грамадскім супрацьстаянні, і слова наша беларускае надалей захаваем, і мастацтва з культурай нацыянальнай нашчадкам сваім перадамо... Берасцейшчына заўжды ўпарта выстойвала ў такіх зацятых супрацівах і ў рэшце рэшт як магла адстойвала сваю беларускую годнасць.

А што да высокіх парыванняў душы і духу, то тут не кожнаму дадзена. Кожны тут — сам-насам перад яго вялікасцю Словам. Як гэта адмыслова выявілася ў адным з выдатных вершаў Алеся Каско:

*Сягне радок у сон твой душны*
*і змусіць сэрца затрымцець,*
*і ўзбудзіць кроў, і горла здушыць,*
*але — не дужа, не насмерць.*

*Дарма пачнеш вышукваць словы,*
*душу і розум тармасіць:*
*верш незалежны, выпадковы*
*сябе не дасць уваскрасіць.*

Пэўна — так, але напішуцца новыя.

Напрыканцы дадам некалькі сухіх лічбаў. У трэцім альманаху «Жырандоля» больш за 70 аўтараў, біяграфічныя дадзеныя якіх займаюць 17 старонак выдання. Сярод іх — 70 адсоткаў складаюць паэты. Па сутнасці ўсяго адзін крытычны артыкул. Няма сур'ёзнай прозы (хоць бы кароткай аповесці). Затое ёсць пераклады з украінскай мовы і займальныя творы для дзяцей. Геаграфія берасцейшчыны ахоплена шырока, прадстаўлены аўтары амаль з кожнага рэгіёна вобласці. Такая напрацоўка абнадзейвае перспектывай чарговага чацвёртага нумара альманаха.

Думаю, што першы і другі нумары «Жырандолі» былі ўсё ж па-мастацку больш насычанымі і ярчэйшымі, прыцягвалі да сябе ўвагу творамі выбітных аўтараў, тады як трэці вылучаецца колькасным адзінствам і, не заўсёды спраўджанымі, літаратурнымі пошукамі. Безумоўна, нешта выпадзе ў асадак. Але і без пэўных літаратурных адкрыццяў і мастацкага набытку мясцовы прыхільнік беларускага краснага пісьменства не застанецца.

І гэта яшчэ раз гаворыць пра перспектыўную жыццядзейнасць нацыянальнага творчага духу — беларускай мовы і літаратуры.

▸ ВЕРШАЛЁС

# ФРЭСКІ ПАМЯЦІ

Лявон ВАЛАСЮК

*Дзеду Івану і бабулі Ефрасінні прысвячаюцца*

*...ткаць будзем палотны
з чырвонай палоскай...*

*1.
Ранак халодны — аскепкі зімы.
Дотык рукі немаўляці.
Першыя гукі маленства — як сны...
Побач — шчаслівая маці.*

*2.
Дзед над калыскай,
Высокі, сівы...
Корміць салодкім
Унука з рукі.*

*3.
Асалода натопленай грубкі.
Пах смалістага дрэва.
Снег за сцяною пругкі.
І маладзік
Пазірае ў шыбіны
Смела. Чуткі.*

*4.
Пыл над дарогаю летняй
Сухі і бязважка-шэры.
У двары
Водар п'янкога сена.*

*5.
Чароўныя словы:
Маці дома...
Лашчыць душу
Матчына мова...*

*6.
Аркуш паперы.
З тонкіх прамых ліній
Да сонца вядзе дарога.
Аловак мой сіні
Рысачкай
Над парогам...*

*7.
Поплаў зялёным морам.
...Так моцна пякло да абеду.
Слухаю ўважліва лета:
У небе жаўрукова песня.*

*8.
Голас латунных званкоў —
Як успамін маленства.
Старая школа,
У свежай фарбе сцены...
Выразна гучыць
Настаўніцы мова.*

*9.
Вучымся чытаць,
Вучымся лічыць кружочкі.
Кожнае слова — мова.
Маці стаіць побач...
Ласкава
Ўсміхаецца горад.*

*10.
Бачу ў сне маці.
Голас ляціць і — ціша...
Быццам мяне калыша
Зранку ў калысцы бабуля...*

*11.
Твары сяброў-суседзяў.
Насупраць косы
Дзяўчынкі Алены...
Колерам майго дзяцінства
Малюю ў сшытку
Ліст жоўты кляновы.*

*12.
Бераг ракі шырокай,
Камень за вёскай высокі —*



*Знакі на ім невядомыя
Лёс вызначаюць
Суровы...*

*13.
Цішыня ночы.
Пах веснавога неба.
Мне так закарцела
Сапраўднага
Мастака пабачыць,
Нібы
Бабулінага з'есці хлеба...*

*14.
Задумлівы
Погляд дзявочы,
Звон
Бліскучай шпагі.
(Тры крокі да подзвігу
І адвагі...)*

*15.
Спякота
На нашай зямлі
Шматпакутнай...
Сэрца трапеча,
Бы сцяг
Пад ветрам...
У прадчуванні смагі.*

*16.
Новыя думкі, сумненні...
Вершы, усюды вершы...
Марозныя зімы без снегу...
Чакаю цягнік з дзедам —
На Новы год —
Семдзесят першы.*

*17.
Зімовы прывід мрояў...
Увесну — вясельныя песні...
Апошні званок — як першы.
І не схаваць вершы...
І горад
Становіцца цесны...*

*18.
Невядомае мне пачуццё:
Пакідаю бацькоўскі дом.
За цягніком калыхнецца
Хусцінка маёй маці...*

*19.
Чорныя боты і ночы:
Не разгледзець неба...
Я мару хутчэй сагрэцца
Сярод бацькоўскага поля!*

*20.
Фарбы, алоўкі... Паперы
Нязвыклае белае поле...
Поле, у якім твары
Глядзяць скрозь мароз
Болем...*

*21.
Вочы твае чыстыя
З водблескам неба
Высокага...
Постаць твая гнуткая,
Цела —
З водарам сена...*

*22.
Утульны час
У цёплай кватэры...
Мароз і снег
На вуліцы — звон...
Аркуш вялікі
Белай паперы —
Шыбінамі
З двух акон.*

*23.
Шукаю адбітак
Зімовай пары:
Ліловыя цені
Ля белай гары
Звіняць успамінам,
Бы сколатым льдом...
Мая там радзіма,
Бацькоўскі мой дом.*

*24.
Спазнаўшы шчасце маладосці,
Сівым вярнуўся ў родны дом.
Трава буяла ў агародзе,
Ніхто не стрэў мяне, ніхто...*

*25.
Апантанасць
Ружовым усходам
Сярод поля, лугу, лесу...
Пахі траў пад расою —
Касою
Сакавіты водар збіваю...*

*26.
На белым полі даўніны
Чырвонай фарбай перамены...
Пад спелым сонцам
Мары, сны...*

*27.
Дотыкі рук, каханне...
Словы шаноўных дам...
Лёс мне паслаў спатканне,
Вызначыў час і храм...*

*28.
Не ўлюбёнец лёсу...
Лічба ўзросту Хрыста...
Думкі — нібы калёсы
На целе старога маста.*

*29.
Незабыўныя твары
Родных і блізкіх людзей...
У завеі губляюцца мары
Сярод нечаканых падзей...*

*30.
Цяжар сыноўняй долі...
Ноч сярод белага дня.
Зранку мяло ў полі,
Вечарам — ля крыжа.*

*31.
Адбіткі неба
На вільготным шкле...
Малюнак сціплы —
Па вадзе пальцам...
Шукаю выйсце
У іншы час...*

*32.
Два чорныя сонцы
Паўсталі на блакіце.
Замест вясёлкі ў небе,
Валошак у жыце...
Вы, мае родныя,
У зямліцы ляжыце...*

*33.
Бяда адна не ходзіць:
Следам ідзе другая.
Зямлю веснавую валочыць,
Ахвяру сабе выбірае...*

*34.
Адчуванне страты
Ў анямелай хаце...*

*35.
Сцежку прабіў
Да студні,
Снег змятаю
З парога...
Мала зрабіў
Ці многа?*

*36.
Трывожная навісла ціша
Прадвесцем веснавых падзей...
На зломе часу
Птушка кліча
Віць гнёзды
У віры надзей.*

*37.
Зранку дзень марозны.
Выстаўляй, бабуля, кросны!
Ткаць будзем палотны
З чырвонай палоскай.*

*38.
На календары лічбы
Склаліся роўна так,
Нібыта час завіснуў,
Нібы спыніўся ля нас...
Зранку шукаю твары
Родных маіх, сяброў...
Лісты перагортваю...
Мары
Пільнуе ліцвінская кроў.*

*39.
Будні — нібыта святы.
Сёстры са мной і браты.*

*40.
Чаканне ранку
У цемры ночы...*

*41.
Светлая зорка ў небе —
Сонца маё залатое.
Дрэва ў радзімай глебе,
Матчына слова святое.
Мова — святло ў цемры,
Голас у дзікай пустыні.*

*Мова — наша святыня.*

*42.
Народзіны і вяселлі...
Ранак усміхаецца сонцам.
Птушкі вяртаюцца ў гнёзды
Да цёплай пары вясенняй...*

*43.
На жоўтых
Старых фотаздымках
З дзяцінства знаёмыя твары...
Гукае праз вясну вёска,
У абдымках трымае горад.*

*44.
З зімы марознай, снежнай,
Прыемна ўваходзіць у вясну:
Першае цяпло,
Як першае каханне...
Наперадзе —
Новае адчуванне...*

РАДКОЎІ

# МАЎЧАННЕ

Сяргей РУБЛЕЎСКІ



* * *

Перад жыццём і пасля жыцця яно такое самае — сцятае, як зярнятка, глыбокае, як каменьчык.

* * *

У маўчанні — пачатак пачаткаў, у ім і канчатковае зацвярдзенне лёсу.

* * *

Пачатак пачатку быў перад выбухам, які расхінуў убакі галактыкі, а таксама — перад тваім сцішаным енкам, калі ты заплюшчыла вочы і прыхінулася да мяне так цесненька...

* * *

Маўчанне драбіцца на шолах лісцінак, шэпт травінак, шаргаценне паветра між імклівых кропляў дажджу, на крыкі разбуджаных уначы дзетак.

* * *

Маўчанне таму заўсёды мае сэнс, што прымерана да вечнага.

* * *

Змаўчаў яму — і прытуліў у сваёй душы крыўду. Прыкрым падалося адвечнае: маўчы, будзь хітрым...

* * *

Падбухторваў яе на любошчы, а яна маўчала...

* * *

Бацькі больш маўклівыя, чым маці, дык дзеці, калі іх агарне старасць, не могуць успомніць, чым завінаваціліся перад сваімі татулькамі.

* * *

У маўклівасці прыроды — ейная адпаведнасць чалавечай душы.

* * *

Валадар маўчыць грозна, хітрун — прытоена, разумнік — нечакана і нецярпліва, дурань — змушана, ты, мая краска, — шчаслівá.

* * *

Пра што ты маўчыш, мой сябра-пісьменнік?

* * *

У маўчанні ад нясцерпнага болю — вырачэнне жыцця.

* * *

Кловун маўчыць ад смеху.

* * *

Старац маўчыць на ўвесь Божы свет, у думках паўтараючы за нас Ісусаву малітву.

* * *

Не крычы ў сне, не будзі мяне ў сне, каб і мне не снілася тое ж самае.

* * *

Рыбіна, выцягнутая ў лодку, крычыць пра сваю мэнку маўчаннем, а рыбак не звяртае на гэта ўвагі, не хоча ўспамінаць, як задыхаўся ў цёмнай вадзе падчас надта глыбока ныпца.

* * *

Калі перафразіраваць вызначэнне Ньютанам прасторы, дык атрымаецца, што маўчанне — пустое прыпірышча маючых спраўдзіцца надзей, спадзяванняў, каханняў, народзінаў... А смертухна як між імі ўціскаецца?..

* * *

Мае суайчыннікі лепш за ўсіх маўчаць па-беларуску, асабліва тыя, што выракліся ды анямелі.

* * *

Зліліся ў адно нашыя маўчанні, і я падумаў: няўжо гэта і ёсць вечнасць кахання.

* * *

Калі я адзін гайдаюся ў сваёй гумавай чавёнцы на рачной плыні ці сяджу ў начной цішыні за пісьмовым сталом у бацькоўскай хаце, дык амаль упэўнены ў залежнасці шчасця ад маўчання. Наўпрост.

* * *

Толькі ў жалобнай мінуце зліваюцца ў адно тысячы маўчанняў.

* * *

Маўчанне — у сярэдзіне мяне, як у сярэдзіне зярнятка і як у сярэдзіне каменя.

* * *

Мой аднагодак Калюсь на ўроку ў пачатковай школе, не ведаючы адказу, зацята маўчаў на заахвочванні настаўніцы, датуль зацята, пакуль з вачэй ці то ад крыўды, ці то ад жалю не пачыналі выкочвацца, як гарошыны, буйныя слёзкі. Мусіць, вось так на споведзі маўчаць зусім няўцямныя грэшнікі...

* * *

Нямко не можа навучыцца маўчаць і пакутуе ад немагчымасці дзяліцца з іншымі гэтым Божым дарункам.

* * *

Прыдумалі, што пагодлівым вечарам, асабліва перад дажджом, аціхае, нямее прырода да апошняга шолаху... Насамрэч, мы проста не чуем, як паўзе павучок, як, седзячы на ўгрэўнай драўлянай сцяне, складваюць ды зноў раскладваюць крыльцы цьмяныя мятлікі.

* * *

«Змоўкні, кажу табе!»

Хто ж змоўкне, калі так кажуць.

* * *

Яго білі на допыце, а ён маўчаў сваю праўду... Енк і крыкі зусім не перапынялі гэтае маўчанне.

* * *

Воўчая яма маўчання — хітрая затоенасць ворагаў у сутарэннях ночы.

* * *

Колькі доўгіх гадоў маўчаў і маўчаў Аркадзь Моркаўка, баючыся не патрапіць лемехам свайго нязмушанага слова ў сацыяльную баразёнку, а ўсім сваім лёсам, наадварот, патрапіць у малатарню сталінскіх рэпрэсій. Маўчаў, маўчаў і праз гэта ледзьве не стаў класікам беларускага маўчання.

Ціха, чуеце:

*Камень песьняй неўмiручай стане,*
*Песьня стане зоркай залатою…*

І зноў цішыня, зноў маўчанне.

* * *

На даляглядзе маўчання ўзыходзіць зіхоткае сонца адлюлянай у спракавечным сне думкі. Каго яно сагрэе?

* * *

Пень маўчыць таму, што страшна ўспомніць, якая была над ім гаманлівая, кашлатая, непадольная ў сваёй зваблівасці вышыня.

* * *

Не магу даўмець, што азначае крык перад маўчаннем. Толькі бачыцца маланка чаіцы над прадоннем ціхага мора.

* * *

Яны лепш за ўсіх расслухаюць маё неўсвядомленае маўчанне, мой сон: матуля — калі нахіліцца нада мной, каханая — калі прытуліцца да мяне...

* * *

Я задыхаюся ад нястачы літар, як ад нястачы паветра. Іх ператрасілі на рэшаце, і як прыкрыя лішкі ў прадонне адляцелі ўсе кропкі ад «ё» ды «і», а тыльда, кранальнае ўзвершша нескладовага «ў», адвалілася ў незваротнасць адчаю. І я замоўк, і здалося, больш ніколі не разгарну і не падоўжу гэты рукапіс. Дык забаяўся маўчання, як маленькае дзіцятка баіцца захаду сонца.

* * *

Толькі тады адчую, як гарчыць маўчанне, калі не захочацца пісаць нават па-беларуску.

---

ВЕРШЫ

# ЧОРНЫЯ СПІСЫ

Аляксей ГАНЧУК



*Глеба худзее на жніўных загонах.*
*Шыюцца вёскі ў дрымотныя сны.*
*Нас усё больш у чырвоных пагонах.*
*Хто вам сказаў, што жывем без вайны!*
*Цэзій і стронцый у целе, на ўзлессі.*
*Звоняць трызвонна ў званіцах званы.*
*Свежых магіл больш і больш на Палессі.*
*Хто вам сказаў, што жывем без вайны?!*
*Хворыя духам мармычуць пад плотам.*
*Гінуць найлепшыя ў краі сыны.*
*Дзеці ў прытулках, падлеткі за дротам.*
*Хто вам сказаў, што жывем без вайны?!*

## Чорныя спісы

*Ёсць белыя людзі,*
*ёсць чорныя спісы.*
*Адкуль жа ў тых спісах*
*мадонны ўзяліся?*
*Чым грэшныя сталі*
*на роднай зямліцы?*
*Жывуць, як і ўсе,*
*прагнуць вольна маліцца*
*За самых святых*
*і за наша святое —*
*За матчыну праўду,*
*за шчасце людское.*
*Прывусніца йду*
*я да Дзевы Марыі*
*За тых, каго білі,*
*каго замарылі…*
*Шматкроп'е,*
*бо дыхае ў твар небяспечнасць.*
*А кропкі расставіць*
*блакітная вечнасць.*
*І белыя спісы*
*маланкай сляпучай*
*Абпаленых душаў*
*крануцца балюча.*

* * *

*Пракуроры і суддзі зацята,*
*Кожны крок кантралююць мой,*
*Вучаць жыць без віны вінавата*
*І душу хочуць бачыць нямой.*
*Ролю гэту ахвотна, за гонар*
*Бессаромна бяруць на сябе*
*«Генерал», і смаркач у пагонах,*
*І п'янтос, што нахабна сапе.*
*Павучаюць пляткаркі і тыя,*
*Хто Радзіму маю абакраў,*
*У каго ўжо кішэні пустыя*
*І ў каго на сняданак ікра.*
*Вашы словы зляталю на вецер,*
*Не трымаюцца злосцю ў грудзях.*
*Толькі Бог — і ніхто ў гэтым свеце —*
*Для мяне пракурор і суддзя.*



# ГУКАННЕ ПРАЎДЫ

Мікалай АЛЯКСАНДРАЎ

## Гуканне

*А што ты робіш тут, Алёна,*
*Спяваючы доўгую песню,*
*У лясочку ля юнага клёна?*
*— Гукаю Весну…*

*А што ты тут робіш, Алесе,*
*На лузе ля сенажаці,*
*Дзе п'юць жаўрукі паднябессе?*
*— Гукаю Маці…*

*А што ты тут робіш, Галіна,*
*У полі, дзе марыць глеба*
*Пра шпаркія струны ліўня?*
*— Гукаю Неба…*

*А што ты тут робіш, Антосе,*
*Ў бары, дзе драўляная мова*
*Стамілася ў безгалоссі?*
*— Гукаю Слова…*

*А што ты тут робіш, Рыгорка,*
*На ўзгорку ля млына старога,*
*Дзе ўсходзіць Максімава зорка?*
*— Гукаю Бога…*

*А што ты тут робіш, Кастусе,*
*Адрынуўшы горкую здраду,*
*На вежы званоў Беларусі?*
*— Гукаю Праўду…*

## Вяселле

*Гой ды з дзедава завулка*
*распляскалася вяселле!*
*Ты гуляй, мая рачулка,*
*гамані, хмяльное зелле!*

*Прыгажуня-вішня*
*Сёння замуж выйшла.*

*Будзем таньчыць мы да скону*
*дня, пакуль зара не згасне.*
*Выйдзі ў круг, дачка Лявона,*
*ды ў зямлю абцасам ляснi!*

*Прыгажуня-вішня*
*Сёння замуж выйшла.*

*Зноў хустэчкі, як вавёркі.*
*таньчаць з чобатамі ў згодзе.*
*Хай міргаюць з неба зоркі,*
*як сяброўкі ў карагодзе!*

*Прыгажуня-вішня*
*Сёння замуж выйшла.*

*Гэта добрае вяселле*
*разгулялася у вёсцы!*
*Можа, заўтра на пахмелле*
*паднясе нам чарку хтосьці?*

*Прыгажуня-вішня*
*Сёння замуж выйшла.*

## Гімн Праўдзе

*Ой, ляцелі гусі*
*За раку Няпраўду*
*к роднай Беларусі*
*адшукаці Праўду.*

*А яна стамілася*
*недзе ў раздарожжы,*
*ў тэрані згубілася…*
*Памажы нам, Божа!*

*Дай знайсці, Прыбужжа,*
*беражок зялёны,*
*дзе буяе ружа*
*каралевы Боны.*
*А у полі гоман*
*ды дурныя весці.*
*Хопіць, бацька Нёман,*
*смецце крыўды несці!*

*Нас ужо не спыняць*
*ніякія краты.*
*Палаводдзем Прыпяць*
*Патрабуе Праўды!*

*У журбе ды скрусе*
*ў ліўні зоркапада*
*я табе малюся,*
*светлая Праўда,*
*матчына Праўда,*
*чыстая мая…*

РЭЦЭНЗІЯ

# «ЯК МОГ, ТАК СПЯВАЎ І ЖЫЎ…»

## ПРА ЗБОРНІК ПАЭЗІІ АЛЕСЯ ДЗІТРЫХА «ІЗМАРАГД» (МІНСК: «КАЎЧЭГ», 2010)

Мікола МІШЧАНЧУК

**Днямі зноў перагледзеў «даведнік» (менавіта так назваў сваю выніковую кнігу Аляксей Гардзіцкі) «Беларускія пісьменнікі», выдадзены ў 1994 годзе.**



І раней зацікаўлены (хочацца нават сказаць «захоплены») яго дыялогамі, інтэрв'ю, гутаркамі пра літаратуру, змешчанымі ў шэрагу кніжак, выгукнуў на поўным сур'ёзе: «Аляксей Кузьміч, гэта — подзьвіг!». Ён усміхнуўся, махнуў правай рукой (такая звычка за ім назіралася) і, нібы саромячыся, сказаў: «Ды што ты, Мікола»…

Выдадзены сапраўдным энтузіястам слоўнік пераглядаў у каторы раз. І вока, і розум зачапіліся за неаспрэчны факт: з названых у слоўніку творцаў прыгожага, можа, 2/3 — паэты. Знаныя (прызнаныя, годна ацэненыя, узведзеныя на п'едэстал гонару і пашаны) і незнаныя, якіх нам яшчэ адкрываць ды адкрываць чытачу. Маладзейшыя (магчыма — большасць) скажуць: «А навошта іх, забытых і забітых, адкрываць? Няхай спакойна адпачываюць!». Чакаюць сваіх даследчыкаў і Янка Бобрык — удзельнік абароны колішняга Ленінграда, і Змітро Віталін — чалавек, які цудам выбраўся, як і Змітрок Астапенка, з сталінскай «апекі» і загінуў без вестак, магчыма, на фронце; і Уладзімір Клішэвіч — эмігрант, які склаў голаў на чужыне ў 1978 г., пакінуўшы нам запавет пра шанаванне Радзімы, бо «іншаземныя маякі // Тваю ноч не асвецяць»; і Розка Алесь, пра якога добрае, «светлае» слова сказаў некалі мэтр нашай літаратуры Сяргей Грахоўскі; і Хадыка Уладзімір, сведкай смерці якога ў далёкай Сібіры быў Станіслаў Пятровіч Шушкевіч, — быў раструшчаны глыбай у кар'еры. Што гаварыць пра аддаленых постацях, калі і бліжэйшыя да нас па часе — Ігар Хадановіч (быў забіты злачынцамі ў 1966 г., дня не дажыў да поўных 26 гадоў), Анатоль Сербантовіч (не стала ва ўзросце 29 гадоў) ды іншыя засталіся па-за нашай увагай…

Да чаго я вяду размову? — Каб мы былі больш уважлівыя да таго, што мелі і маем. Каб ніводная выдадзеная ў нашы нялёгкія дні кніжка не заставалася па-за ўвагай крытыкі: хай гэта будзе крытыка на раённым і абласным, калі не на рэспубліканскім, узроўнях. Але яна павінна быць.

Відаць, мой клопат і мой роздум над праблемай захавання (і выхавання!) памяці, адстойвання сваёй далучанасці не толькі да «малога», але і «вялікага» часу (формула М. Бахціна) быў клопатам і роздумам аўтара першай кнігі паэзіі Алеся Дзітрыха (сапр. Алесь Бразгуноў) «Ізмарагд», калі пісаліся наступныя радкі верша «Беларускія паэты», які адкрывае ці не лепшы раздзел зборніка, з эпіграфам-прысвячэннем «Памяці ахвяр 29.X. 1937 г.»:

*Як цяжка паміраць паміж*
*нялюбых твараў,*
*Калі няма каму даверыць*
*светлых мараў,*
*Калі душа ў крыві канае*
*бракам сілы,*
*Мальбуючы «Жыві!»*
*над прорваю магілы!*

Радкі атрымаліся кранальныя. Зрок «чапляецца» за вобразы-дамінанты, што ўтвараюць не толькі сэнсавыя «вузлы», але і працуюць на трагедыйны змест, «працуюць» якраз на тую ідэю памяці, пра якую мы згадвалі вышэй: «нялюбыя твары» — «светлыя мары» — «душа ў крыві» — «прорва магілы». Калі не памыляюся, Аляксандр Блок некалі пісаў, што ён спачатку вызначае для сябе сэнсавыя націскныя вобразы, а пасля «нацягвае» на іх слоўны матэрыял. Так і тут: у заключных чатырох радках годна завяршаецца перажыванне аўтара з прычыны таго, што адбылося з таленавітымі, намі забытымі ці не да канца пазнанымі аўтарамі. Вобразы «трагічнай афарбоўкі» літаральна «паглынулі» вобраз святочнага настрою — «светлыя мары». А ў папярэдніх двух катрэнах змрочныя і светлыя вобразы знаходзіліся ў іншай прапорцыі — апошніх было больш: «блакіты неба», «зніч-агонь любові братняй», «ласкава клічуць зоркі», «родныя пагоркі» — «душа ад болю разарвецца», «паміраць не ля свайго парога». Нязмушана, як бы сама сабою, у вершы «вырастае» паралель — святло і змрок, радасць і боль. Гэтая нязмушанасць (а лепш — непрымусовасць) руху лірычнага пачуцця характэрная для многіх твораў Алеся Дзітрыха. Таму не толькі ствараецца ўражанне, але натуральна вынікае са зместу паэзіі аўтара, які пры ўсіх спробах эксперыменту (са словам, з вобразамдэталлю, у галіне жанраў) шукае сябе ў межах рэалістычнага тыпу творчасці, адштурхоўваецца ад традыцый беларускай і сусветнай класікі. Яе сляды (багдановічаўскія, коласаўскія, а можа і цютчаўскія) адчувальныя ў вершы «Песняру». Пры ўсім адрозненні знешнім (вершаваны памер, сучасная лексіка) верш Алеся Дзітрыха па сваім пафасе, элегічным настроі, непрыняцці трагедыйных абставінаў (больш агульных, абстрактна-філасофскіх у паэта-сучасніка) вельмі блізкі да аднайменнага верша класіка нацыянальнай літаратуры. Але пра «пераспеў» праспяванага ў дадзеным выпадку не можа быць гаворкі — у вершы аўтара зборніка «Ізмарагд» адбываецца пераразмеркаванне аб'ектнага і суб'ектнага пачаткаў: на першым плане аказваецца другі. Больш таго, «творчае ego», як адзначаецца ў даведцы пра аўтара кніжкі, больш суб'ектывізаванае, больш вызначанае, чым у вершы Максіма Кніжніка, больш засяроджанае на другім аспекце праблемы «мастак і свет» — не толькі на агульнафіласофскім, «творча-лабараторным», але і псіхалагічным: паэт павінен спасцігнуць «уласны дух», «няпраўду-праўду» піць «да дна», не жаліцца Богу і не патрабаваць «сабе цішы». Толькі выканане гэтых наканаванняў, лічыць паэт, нараджае сапраўднага песняра. Верш заканчваецца лагічнай высновай — празрыстай, незавуаляванай і разам з тым — не дыдактычнай:

*Не жалься Богу, што знявераны,*
*не патрабуй сабе цішы.*
*А не — жыві свой век адмераны*
*і вершаў болей не пішы.*

Звернем увагу на «звычайнасць», «размоўнасць», «празаізм» двух заключных радкоў, якія самі сабой і згладжваюць ментарскі дыдактызм, уласцівы многім пачынаючым паэтам. Усё сказана звычайнай фразай: «і вершаў болей не пішы».

У паэзіі, асабліва ў лірыцы, непамерна звужаны тэматычныя абсягі. «Вечныя тэмы» кахання і нянавісці, праўды і маны, любові да радзімы малой і вялікай, памкненняў душы, маральных паводзінаў непакоілі і непакояць пакаленні многіх і многіх стагоддзяў. Пераадолець іх магічную сілу немагчыма. У іх коле і развіноўваюцца ўсе таленты, гняздуюцца думкі і пачуцці мастакоў слова. Таму не лагічна цешыць сябе навацыйнасцю «трактоўкі» адвечных ісцін — выяўляць самаНадзейнасць, ставіць сваё ego над ego папярэднікаў. Алесь Дзітрых, відаць, гэта разумее, а таму не імкнецца ўзняцца над спадчынай папярэднікаў. Голас яго гучыць не на ўзвышанай (часта ненатуральнай), а на сціпланай ноце. Як у многіх элегійных паэтаў — у таго ж Максіма Багдановіча, Аркадзя Моркаўкі, Аркадзя Куляшова перыяду «Новай кнігі» і «Хуткасці», Максіма Танка — аўтара зборніка «Errata». Шэраг аўтараў можна памножыць. Аднак бліжэй за ўсіх (ўядома, тыпалагічна) лірыка кахання Дзітрыха да лірыкі кахання Яўгенія Баратынскага. Ды, бадай, і характары абодвух аўтараў, і іх тэмпераменты (калі меркаваць па агульным пафасе творчасці таго і другога) таксама вельмі падобныя. Угэтым можна пераканацца, параўноўваючы вобразны свет, рытмікаінтанацыйную структуру вершаў Я. Баратынскага «Дакор» і нашага паэта «Рахунак». Акрамя гэтага, верш «Рахунак» «перазвоньваецца» са знакамітай элегіяй «Прызнанне» Я. Баратынскага, ухваленай А. Пушкіным. Сітуацыя ў трох вершах аднолькавая: развітанне з каханай. У абодвух паэтаў баліць душа. Абодва пераадольваюць сябе, прымаюць суровае рашэнне: адмовіцца ад пяшчотаў былой каханай, глядзяць «на радасць сумна» (Я. Баратынскі), лічаць, што каханая «дарма прыцягвае пяшчотай» (А. Дзітрых). Супадае і вершаваны памер «Дакору» і «Рахунку» — чатырохстопны ямб.

Вучыцца ў класікаў не сорамна. Прызнаваць сябе пераемнікам закладзеных імі традыцый — таксама не грэх. Грэх, калі іх не заўважаеш і нават адмаўляеш. Калі выдаеш за геніяльнасць фармальны («камерны», «кулуарны», ледзь не для сябе самога) эксперымент. Алесь Дзітрых, як і многія сучасныя «неанеарэалісты», эксперымент не адмаўляе, але і не злоўжывае ім. Прыкметы яго ляжаць на паверхні, бачацца няўзброеным вокам. Да ліку іх можна аднесці, да прыкладу, эксперымент з мінівобразнасцю, з тропамі. Яны падчас нагадваюць імажыністаў: «карабельныя» (паводле С. Ясеніна), незвычайна яскравыя, нечаканыя, арыгінальныя. Іх не вельмі многа, але яны — з'ява прыкметная, а як у вершы «Было так весела мне ўчора…», дык і дамінантныя:

*Было так весела мне ўчора,*
*а сёння — горка…*
*Світанак выкаціўся з мора,*
*а ноч вавёркай*
*шмыгнула ў лес і хвост схавала*
*паміж гушчараў.*
*…………………*
*выходзіць лета грацыёзна,*
*плыве па росах,*
*сцякае сонечна і слёзна*
*па соснах босых.*

Другая прыкмета эксперыментальных пошукаў паэта вынікае з высокаснасці яго філалагічнай адукацыі, з пошукаў слова, словаформы, новастворанага словазлучэння, фразеалагізмаў, рэдкіх ці зусім не ўжываных да яго. Да падобных набыткаў можна аднесці тропы («Надзея — паранены звер», «сонечны дым», «хай музыка за намі ўслед блукае», «першародны жах, // маёй душы-планеты спадарожнік», «мяккі ранак», «незаўважны час // распусціць свой парасон», інш.), наватворы («дзівасвет», «чужаволя», «спрацівіцца моцы», «беласнежаньскія хмары», «здумение», «спрасон // на небе сонейка ўсміхнецца»), народныя выразы і выслоўі («Сыты не просіць хлеба», «Не жалься Богу», «Калі ў каханні ўсё да ладу», «не спаганіў душы сваёй гвалтам»).

Трэцюю прыкмету наватарства паэзіі Алеся Дзітрыха можна пазначыць як аўтарскія пошукі ў розных жанрах і жанравых разнавіднасцях, імкненне да іх трансфармацыі і мадыфікацыі. Думаецца, што асабліва ўдала аўтар «Ізмарагда» «абыходзіцца» з пасланнямі-прысвячэннямі і замалёўкамі пра мінулае, ператвараючы іх у філасофскія роздумы, элегіі-оды (памежная жанравая разнавіднасць). Найбольш выразна гэты напрамак пошукаў выявіўся ў раздзелах зборніка «Раўдоніца», «Места», «Дыямент», «Шатландская сюіта». Вершы-прысвячэнні і пасланні ў гэтых раздзелах маюць канкрэтных адрасатаў: Ул. Караткевіч, Адам Мальдзіс, Генадзь Кісялёў, Ала Ходан, Вітаўт Кіпель, Зора Кіпель, Вячаслаў Чамярыцкі, Любоў Ляўшун, інш. Адрасатамі асобных твораў з'яўляюцца, як некалі ў М. Багдановіча, гарады, пабудовы, жывыя істоты (раздзелы «Места» і «Дыямент»). Прысвячэнні, пасланні, гістарычныя замалёўкі Алеся Дзітрыха, пазбаўленыя сухой інфарматыўнасці, «насычаны» яскравай мінівобразнасцю («Лёгкіх крылаў барочны ўзмах // праразае сувой арганны, // і канае былога птах // над бажніцай святое Ганны» — «Вільня»), часцей за ўсё ўяўляюць сабою філасофскія медытацыі, прасякнутыя роздумам над сутнасцю жыцця і смерці, вечнага і часовага, памяці і забыцця. Неяк нязмушана лаканічнае апісанне ператвараецца ў лірычнае перажыванне, а тое — у сардэчнае разважанне. Узорам гэтага можна лічыць сэнсава ёмісты, лаканічны верш пра волю-няволю, пра заціснутасць чалавечых душ у клеткі-турмы. Па-сутнасці, гэта твор пра чалавечае Я, што растваралася ў Мы ў замкнёнай, абмежаванай прасторы:

*М е с т а. Тысячы целаў*
*абліваюцца потам,*
*закаваныя ў латы*
*згрызот і турботаў.*

*М е с т а. Тысячы думак,*
*мільёны сумненняў*
*у разумных галовах*
*стракатых адценняў.*

*М е с т а. Тысячы душаў*
*рвуцца з клетак на волю;*
*ды не вырвацца ім*
*з гэтых турмаў ніколі.*

Зборнік вершаў заканчваецца «(Не)чужой песняй» (назва заключнага раздзела) у перакладзе — «Смерць або Воля» — пра чачэнскі народ, горды, непакорлівы, для якога «без волі — смерць», і як бы «перазвоньваецца» з галоўнай высновай кнігі Янкі Сіпакова «Веча славянскіх балад», у якой на прыкладзе славянскіх народаў раскрываецца матыў свабоды, волі, без якіх сапраўднае жыццё немагчымае.

Такі атрымаўся першы зборнік вершаў, ды з адзнакамі немалога жыццёвага вопыту, адсутнасці «максімалізму», я сказаў бы, «выбуховасці» мыслення. Словам, зборнік А. Дзітрыха — даволі ўдалая спроба пераасэнсавання матываў класічнай (пазітыўна настроенай) літаратуры на новым узроўні, пераважна з захаваннем канонаў рэалістычнага тыпу творчасці. «Ізмарагд» — гэта шчыры расповед пра шлях паэта ад усведамлення ўласнай унутранай свабоды да разумення волі як грамадскай неабходнасці.

ПЕРАКЛАД

# ПЕРАКУЛЕНАЯ КВАРТА

Сяргей ЯСЕНІН

*Гавораць кветкі мне — бывай,*
*Схіляючыся бы ў паклоне,*
*Прарочаць: больш не запалоніць*
*Яе краса і родны край.*

*Каханая, я ў сцюжах быў —*
*Не толькі бачыў кветкі мая,*
*І вось магільны цень журбы*
*Як ласку новую прымаю.*

*Якраз таму, што я спасціг*
*Жыццё, ідучы з усмешкай міма, —*
*Кажу на кожны новы міг,*
*Што ўсё паўторыцца, магчыма.*

*Хтось іншы прыйдзе не з тугой,*
*Туга ранейшага ўваскрэсне…*
*Пакінутай і дарагой*
*Складзе той іншы лепей песню.*

*І, можа, ў кветкавай вясне*
*Каханая з каханым новым*
*Успомніць з песняю мяне*
*Як непаўторны квет вясновы.*

* * *

*Ну, цалуй мяне, цалуй,*
*Хоць і да крыві, да болю.*
*Не ў ладу з халоднай воляй*
*Сэрца жар, — цалуй, мілуй.*

*Перакуленая кварта*
*Між вясёлых не для нас.*
*Зразумець, сяброўка, варта:*
*На зямлі жывем мы раз.*

*Вокам кінь без лішніх слоў ты,*
*Паглядзі: ў імгле сырой*
*Месяц, быццам воран жоўты,*
*Ўецца, кружыць над зямлёй.*

*Ну, цалуй жа! Так хачу я.*
*Тлен крадзецца ў мае дні.*
*Смерць маю, напэўна, чуе*
*Той, хто ўецца ў вышыні.*

*Завядаючая сіла!*
*Паміраць дык паміраць!*
*А да скону губы мілай*
*Я хацеў бы цалаваць.*

*Каб у шолаху чаромхі*
*Ды пад песню салаўя*
*Не баялася нітрохі*
*Паўтарацца: «Я твая».*

*Блік святла б над поўнай квартай*
*Лёгкай пенай не пагас —*
*Пі, спявай, тужыць не варта,*
*Хоць жывем на свеце раз!*

* * *

*Можа, позна, можа, надта рана,*
*Зведаўшы вірлівы гэты свет,*
*Стаў падобны я на Дон-Жуана,*
*Як сапраўдны ветраны паэт.*

*Што са мной? Куды цяпер брыду я?*
*Кожны дзень я новым ласкам рад.*
*З кожным днём сябе ўсё менш шкадую,*
*Не зміраўшыся з гаркотай здрад.*

*Я хацеў, каб сэрца не зачахла*
*У пачуццях простых, халастых,*
*Што ж шукаю у жанчын вачах я —*
*Легкадумных, здрадліва-пустых?*

*Дай, мая пагарда, мне цярпенне,*
*Я табе заўжды быў не чужы.*
*Чуецца халоднае кіпенне,*
*Сіні шэлест бэзу на душы.*

*На душы зары вячэрняй злата,*
*І ўсё чую тое ж праз туман —*
*За пачуццяў волю ёсць расплата,*
*Дык прымай жа выклік, Дон-Жуан!*

*І спакойна выклік я прымаю,*
*Мне як бы ўсё роўна, чым жыву,*
*У завеях бачу квецень мая*
*І каханнем лёгкі флірт заву.*

*Час так лёгка змог мяне абкрасці,*
*І таму я новым ласкам рад,*
*Усміхалася каб вечна шчасце,*
*Не зважаючы на процьму страт.*

## Пісьмо да матулі

*Ты жывая, любая матуля?*
*Я жывы. Паклон табе, паклон!*
*Хай тваю хацінаачку атуліць*
*Вечарова-зорнае святло.*

*Пішуць мне, што, тоячы трывогу,*
*Затужыла дужа без мяне,*
*Што ты часта ходзіш на дарогу*
*У старым злінялым шушуне.*

*І табе нярэдка ноччу цёмнай*
*Толькі драма бачыцца адна:*
*Быццам хтосьці ў бойцы у карчомнай*
*Фінку мне пад сэрца увагнаў.*

*Супакойся, родная! Нічога.*
*Мітургу старайся ўтаймаваць.*
*Не такі ўжо горкі я п'янчуга,*
*Каб, з табой не стрэўшыся, сканаць.*

*Не растраціла душа пяшчоты,*
*Мрою я ў найсветлым пачуцці,*
*Каб хутчэй з бунтоўнае маркоты*
*Да хаціны нізенькай прыйсці.*

*Я вярнуся, калі белым стане*
*Па-вясноваму квяцісты сад.*
*Толькі ты мяне ўжо на світанні*
*Не будзі, як шмат гадоў назад.*

*Не будзі ўсяго, што знікла з марай,*
*Не хвалюй, што збыцца не не змагло, —*
*Давялося выпіць страты чару*
*Надта рана, рана зведаць зло.*

*І не навучай маліцца Богу.*
*Адцвіло мінулае, як цвет.*
*Ты адна мне радасць і падмога,*
*Ты адна — мой невымоўны свет.*

*Дык забудзься на сваю трывогу,*
*Не сумуй занадта аба мне.*
*Не хадзі так часта на дарогу*
*Ў выцвілым старэнькім шушуне.*

* * *

*Я спытаўся весела ў мянялы,*
*Што дае за паўтумана па рублю,*
*Як сказаць мне для прыўкраснай Лалы*
*Мовай персаў ласкава «люблю»?*

*Я спытаўся ціхенька ў мянялы,*
*Мо цішэй ад Ванскіх струмянёў,*
*Як назваць мне для прыўкраснай Лалы*
*«Пацалунак», слова з пекных слоў?*

*І яшчэ спытаўся я ў мянялы —*
*Боязь прыхаваў у сэрцы я —*
*Як сказаць мне для прыўкраснай Лалы,*
*Як сказаць мне, што яна «мая»?*

*Адказаў ён з дзіўнаю яснотай:*
*Пра каханне што там і казаць,*
*Уздыхаюць пра каханне ўпотай,*
*Вочы, быццам яханты, гараць.*

*Пацалунка хто не разумее!*
*Пацалунку назву хто дае!*
*Пацалунак свежай ружай вее,*
*На губах пялёсткам растае.*

*Ад мілосці не бяруць зарукі,*
*Ведаюць з ёй радасць і бяду.*



*«Ты — мая», — так скажуць толькі рукі,*
*Што зрывалі чорную чадру.*

* * *

*Я не быў ніколі на Басфоры.*
*Што аб ім табе нагаварыць?*
*Я ў вачах тваіх убачыў мора,*
*Што блакітам пышна так гарыць.*

*У Багдад не йшоў я з караванам,*
*Не вазіў я шоўк туды і хну.*
*Да мяне схіліся гожым станам,*
*На каленях дай я адпачну.*

*А ці зноўку, колькі ні прасі я,*
*Успрыняць не хочаш ты, мой цвет,*
*Што ў далёкім імені — Расія —*
*Я прызнаны, слынны я паэт.*

*У мяне ў душы гучыць тальянка,*
*А пры поўні чую брэх сабак.*
*Хіба ты не хочаш, персіянка,*
*Ў сіні край мой завітаць няўзнак?*

*Я сюды прыехаў не з дакукі —*
*Ты мяне, нябачная, вяла.*
*Лебядзінымі здаліся рукі —*
*Абвівалі з лёгкасцю крыла.*

*Я шукаю ў лёсе ўжо спакою,*
*І хоць не кляну пражытых дзён,*
*Раскажы што-небудзь мне такое*
*Пра свой край, які вясёлы ён.*

*Заглушы ў душы тугу тальянкі,*
*Свежых чар павевам варажы,*
*Каб па вуснах дальняй расіянкі*
*Не ўздыхаў крадком і не тужыў.*

*І хаця не быў я на Басфоры,*
*Пра яго змагу нагаварыць,*
*Калі воч тваіх блакітных мора*
*Гэткім пышным полымем гарыць.*

* * *

*Гай залаты адгаманіў лістамі,*
*Бяроз вясёлым голасам такім,*
*І жураўлі самотна пралятаюць,*
*Ды не сумуюць болей ні аб кім.*

*Па кім тужыць? Тут кожны падарожны —*
*Прыйшоў, пайшоў, навек пакінуў дом.*
*Мо канапляннік трызніць тут па кожным*
*Пад поўняю шырокай над стаўком.*

*Стаю адзін сярод раўніны голай,*
*А жураўлі плывуць па небе ў даль.*
*Я аб юнацтве думаю вясёлым,*
*Ды ў прошласці нічога мне не жаль.*

*Не жаль гадоў загубленых, прыўкрасных,*
*Не ведаю, што дадзена сустрэць…*
*Гарыць агонь рабіны непагасна,*
*Нікога ж ён не здолее сагрэць.*

*Не абгараць рабінавыя гронкі,*
*Трава ад жаўцізны не прападзе.*
*Як дрэва ціха ліст раняе вонкі,*
*Так я раняю словы кожны дзень.*

*І калі жорсткі час, як штось пустое,*
*Зграбе ў адзін камяк іх, што ж, няхай…*
*Скажыце так… Што мовай залатою*
*Адгаманіў пяшчотна светлы гай.*

* * *

*Багна ды балоты,*
*Неба сіні ўбор.*
*Хвойнай пазалотай*
*Чуйна звоніць бор.*

*Ценькаюць сініцы*
*Ў гушчы дрэў, кустоў.*
*Цёмным елкам сніцца*
*Гамана касцоў.*

*Па лугах са скрыпам*
*Цягнецца абоз.*
*Сукаватай ліпай*
*Пахне ад калёс.*

*Слухаюць ракіты*
*Ветравы прыбой.*
*Край ты мой забыты,*
*Край ты родны мой!..*

* * *

*Скрыпкай цыганскаю плача завея.*
*Бліснулі суха ільдзінкі з-пад веяў.*

*Мілая дзеўчына з сінім паглядам.*
*Злосная ўсмешка, а я табе рады.*

*Прорву між нас твой пагляд паглыбляе —*
*Зведаў усё я, а ты маладая.*

*Юным уцеха, а мне адно памяць*
*Снежную ноччу ў шумную замяць.*

*Я не залашчаны скрыпкай мяцеліц.*
*Мне твая ўсмешка сэрца мяцеліць.*

## Хуліган

*Дожджык мокрымі мётламі чысціць*
*Вербняковы памёт па лугах.*
*Плюйся, вецер, бярэмкамі лісця, —*
*Я такі ж, як і ты, хуліган.*

*Я люблю, калі сінія гушчы,*
*Быццам з цяжкай хадою валы,*
*Жыватамі адвечнае пушчы*
*Па каленках мараюць ствалы.*

*Вось ён, статак мой цёмна-рыжы!*
*Хто ж бы лепей апець яго мог?*
*Бачу, бачу, сутонне як ліжа*
*Сляды чалавечых ног.*

*Русь драўляная, Русь мая ты!*
*Я адзіны вяшчальнік твой.*
*Сум звярыных радкоў маіх мятай*
*Я карміў і карміў рэзядой.*

*Месяц з неба быццам сыйшоў*
*Малака ўзяць, бяроза, твайго.*
*А магільнік рукамі крыжоў*
*Задушыць быццам хоча каго!*

*Жуда чорная ёсць тут і там,*
*Зло зладзейскае прэ ў наш сад.*
*Толькі сам я разбойнік і хам,*
*Па крыві я сцяпны канакрад.*

*Бачыў хто, уначы як кіпіць*
*Закіпелых чаромхаў рацъ?*
*Ноччу мне б у стэпе, што спіць,*
*З кісцянём дзе-небудзь стаяць.*

*Ах, завяў галавы маёй куст!*
*Вечны песняў палон у жыцці —*
*З чуццяў катаргі я не ўцяку,*
*Буду жорны паэм круціць.*

*Ды не бойся, вецер-вар'ят,*
*Плюй спакойна лісцём па лугах.*
*Хай з мянушкай «паэт» буду я,*
*Я ж і ў песнях, як ты, хуліган.*

**Пераклаў Васіль Жуковіч**

ДЗЁННІК

# ДЗЕВЯНОСТА ТРЭЦІ

## «ЗАНАТОЎКІ ДЛЯ СЯБЕ», ЗРОБЛЕНЫЯ Ў ЧАС ПАСЯДЖЭННЯЎ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ



Ніл ГІЛЕВІЧ

**9 лістапада.**

Просьба нашай Камісіі ўключыць у Парадак дня пытанне аб архівах і бібліятэках адхілена. Абодва законапраекты не прайшлі: двойчы ставілі на галасаванне — і двойчы родненькія дэпутаты правалілі. Ні архівы, ні бібліятэкі іх не хвалююць. Дробязь! Хаця на абмеркаванне гэтых законапраектаў у першым чытанні хапіла б дзесяці хвілін. Так людзі выказалі свае адносіны да культуры наогул. Удалося ўставіць у Парадак дня пытанне аб зарплаце настаўнікам і педагогам.

Дэп. Пазняк: «Першым трэба ставіць пытанне аб адстаўцы Урада!». І вельмі рэзка асудзіў Урад, які давёў краіну да цяперашняга становішча.

Дэп. Ізмайлава (ваяўнічая бабулька!): зусім не па тэме Парадку дня пачала крычаць аб пагрозе дзяржаве з боку апазіцыі і БНФ. Гэтую небяспеку ўбачыла яна і ў інтэрв'ю Сярэдзіча з Шушкевічам.

(За два рады перада мной сядзіць дэпутат «ад інвалідаў» і ўвесь час паварочвае галаву, каб кінуць кеплівую рэпліку Гермянчуку, а ўхмылка дурненька-дурнейшая. Можа, і добры чалавек, і заслужаны ветэран, але... Ён ведае адно, што трэба перш за ўсё ўчыняць абструкцыю «дэмакратам». Крычы, стукай і грукай нагой аб падлогу, рукамі па стале. Навыбіралі такіх законатворцаў, навыбіралі!.. А для чаго? Недарэчна гэта было зроблена, недарэчна.

**11 лістапада.**

Дэп. Гілевіч: «Дазвольце сказаць пра адно ўражанне, якое мяне вельмі засмучае. Мнагавата гаворыцца тут таго, што не дапамагае адказаць на пытанне: як, якімі шляхамі выйсці з глыбокага крызісу, як не дапусціць, каб здарылася самае горшае — каб абрабаваныя, ашуканыя няшчасныя сумленныя людзі не пачалі паміраць ад голаду і холаду». «Дарэчы, у вуснах многіх нашых грамадзян словы «суверэнітэт», «незалежнасць» сталі словамі зняважліва-абразлівымі, гучаць, як лаянка. Няшчасце на галаву звалілася — суверэнітэт! Жылі-жылі — і раптам на табе! Суверэнітэт!..»

**16 лістапада.**

**Абмеркаванне дакладаў С. С. Шушкевіча і В. Ф. Кебіча.**

Дэп. Заблоцкі У. М. Нам патрэбен нейтралітэт па ўзору Швецыі. У любых абставінах — нейтралітэт! Ні ў якім разе не ўтвараць агульную рублёвую зону з Расіяй. Рашуча супроць здачы суверэнітэта і незалежнасці! Прапанаваў выбраць старшынёй Урада... Марыніча. (У зале — шум і посмехі — не прынялі).

Дэп. Новік У.У. «Сёння Расія ў руках ліберальнай буржуазіі, а заўтра?» Трэба было на другі дзень пасля ўвядзення расійскага рубля нам у Беларусі ўводзіць свой, беларускі. Вярхоўны Савет і Савет Міністраў не зрабілі гэтага. Задзейнічалі хапугі. Трэба помніць пра геапалітычныя інтарэсы Расіі ў Беларусі. Паглядзіце: набіраюць сілу дзялкі-кампрадоры! Я заклікаю і ВС і СМ да разумнай згоды. Урад, дай праграму выйсця са становішча! ВС адказвае за дзейнасць Урада, і калі той не так дзейнічае — дык у адстаўку!

Дэп. Садоўскі П. В. Колькі будзе цягнуцца пераходны перыяд з агульным рублём, агульнай рублёвай зонай? Павінна быць камісія, якая б выпрацавала праграму выратавання эканомікі. Гэта зробіць абноўлены Урад — толькі абноўлены! Далей П. В. робіць бліскучы аналіз, куды пайшлі грошыкі і адкуль іх узяць. (Куды ўцяклі капіталы?).

Дэп. Сукач М. Д. Узнікла патавая сітуацыя — з-за канфрантацыі ВС і СМ. Няма агульнай стратэгіі — вось бяда! Чаму ў нас павінна быць горш, калі маюцца ўсе ўмовы, каб было лепш? Адкажыце, хто вінаваты? Вячаслаў Францавіч, ніколі не хітрыце! Я — за ўласную беларускую валюту! Але — не за ізаляцыю!.. Вячаслаў Францавіч, вы кажаце: мы не дапусцім развалу сельскай гаспадаркі. Ды яна ж ужо развалена! Калгас ужо не корміць, а фермер тым больш не можа карміць, бо не мае падтрымкі. Нам ёсць чым гандляваць з усім светам, а не залежаць ад Расіі! (Ой, як разумна гаворыць!) І яшчэ: трэба пакончыць з хаосам у мясцовых уладах! Скараціць начальнікаў усіх рангаў (скароціцца шафёры, бензін, сакратаркі!).

Дэп. Чакушоў У. М. Нашто нам рабіць самазвалы і столькі трактароў, не маючы сваёй матэрыяльнай базы (вугалю, руды)? Знізілі экспарт, прадаём за бясцэнак. Перавагі клірынга відавочныя, але мы не ўмеем ім карыстацца.

Дэп. Турак А. М. Чаша цярпення перапоўнена. Хаваем ад людскіх вачэй бяздзейнасць. (Слухаюць, як і папярэдняга, кепска!) Яўны здзек з вытворцаў! «Беспредел» ва ўзаемаразліках з краінамі СНД.

Дэп. Андрэйчанка У. П. У сельскай гаспадарцы мы дайшлі да небяспечнай рысы. Усе калгасы сталі аднолькава беднымі. У жніўні працуем у полі па 6–7 гадзін — удумайцеся! «Не будзе вёскі — не будзе і рэспублікі!» (!!!) Пастаўлялі ў Расію 300 тысяч тон мяса, зараз — 40 тысяч тон. Павярнуць бюджэт на сельскую гаспадарку! Непарытэт цэн — галоўная прычына гібелі сельскай гаспадаркі! Сёння крэдытаванне сяла — ніякае. Трэба даць вёсцы ільготныя крэдыты! Разлік за здадзеную сельскую прадукцыю праводзіцца несвоечасова, а грошы абясцэньваюцца.

Дэп. Цялежнікаў У. І. Ні адно рашэнне Вярхоўнага Савета не давялі да канца — за ўсе тры гады. Мы спадзяваліся на палітычны цуд, а ён не адбыўся. Але яшчэ многія ў яго вераць. І эканамічнага цуда не будзе. Адказнасць на нас. Трэба правесці структурныя змены ў Савеце Міністраў.

Дэп. Цярэшка І.І. Аб рабоце Нацыянальнага банка: яго палітыка прывяла да вялікіх страт у народнай гаспадарцы, да іншых страт. (Рэпліка з залы: «Усё ў руках Савета Міністраў, а не банка!».) Прапаную падпарадкаваць Нацыянальны банк Прэзідыуму Вярхоўнага Савета. (Ну і прапанова!).

Дэп. Навумчык С. І. дае ацэнкі дакладам Шушкевіча і Кебіча. «Вы, Вячаслаў Францавіч, чатыры гады ўзначальваеце Урад — і што зрабілі? Зарплата — 26 адсоткаў «спажывецкага кошыка». Пазыка — ужо каля двух мільярдаў даляраў. Хто разлічыцца? Наступныя пакаленні народа? Савет Міністраў займаецца не эканомікай, а палітыкай і палітыканствам. Прапаную стварыць пераходны кааліцыйны Урад. З гэтым мы, апазіцыя, і выйшлі на Сесію.

Дэп. Трусаў А. А. Згодніцкая палітыка Шушкевіча карысці народу не дала. Паглядзіце на харомы сучасных буржуяў вакол Мінска і іншых гарадоў — хто жыве і будзе жыць у іх? Урад даў прастору жулікам, злодзеям. Зняў мытню з аднаго боку. Мае прапановы: першая, трэба стварыць кааліцыйны Урад, другая, скараціць колькасць міністраў (і яшчэ восем прапаноў!).

Дэп. Жыдзіляеў І. І. Так і не зразумеў з дакладу Кебіча, ці бачыць Урад крызіс эканомікі. І ў Шушкевіча мала канкрэтных прапаноў.

Дэп. Карпенка Г. Дз. У дакладах няма аналізу крызісу ўлады на ўсіх узроўнях. Ідзе працэс палітычнага развалу дзяржавы. Перад намі два шляхі выйсця: дрэнны і зусім дрэнны. (Абмалёўвае гэтыя шляхі.) Галоўная задача — выратаванне насельніцтва ад голаду і холаду. (Малайчына!)

Дэп. Какоўка В. Ф. Спасылаецца на сваю нацыянальную валюту ў Казахстане і Узбекістане. Прыводзіць прыклад Германіі пасля вайны: стабільнасць валюты (грошай) і цэн. Гэта галоўнае права чалавека — стабільнасць. Асноўнай задачай сёння бачу змену прэм'ера.

Дэп. Жук А. М. Крытыкуй — каб самому дарвацца да ўлады, — і ўсё! Многія так і робяць. Аб справах у Аграпроме скажу так: горш, чым дзе б ні было!

Дэп. Лукашэнка А. Р. (Крытыкуе даклад Шушкевіча, але — не пераканаўча, абы прычапіцца. Нічога канструктыўнага не сказаў. Агульнае ўражанне — дэмагогія і папулізм). «А дзе, Станіслаў Станіслававіч, былі вы? З вамі з гэтага крызісу мы не выйдзем! Прапаную вызваліць ад пасад і Шушкевіча, і Кебіча». (Шушкевіч тут жа даў водпаведзь.)

Дэп. Каўбаска М. І. Вельмі ўпаўнена — за сваю беларускую валюту як за сімвал незалежнасці. (Малайчына, Каўбаска, не чакаў!)

Дэп. Камай А. С. Корань усіх бед зусім не там, куды паказвае Шушкевіч. А ў Віскулях! У рыначнай стыхіі, якая можа запанаваць у рэспубліцы! У дакладах Шушкевіча і Кебіча няма эканамічных разлікаў. Шушкевіч хай выконвае волю Вярхоўнага Савета! У сельскай гаспадарцы патрэбна мэтавая дзяржаўная праграма па вытворчасці прадукцыі (мяса і малака).

Дэп. Грынёў М. Ф. Рэзка крытыкуе Шушкевіча і тых, хто супроць агульнарублёвай зоны. «Давайце гандляваць! Працуем на склад, а трэба везці ў Расію! Я — за незалежнасць, але гэта трэба рабіць паступова, разумна, узважана, а не з ходу!» (??? Што гэта значыць?) Рожкі-ножкі засталіся ад абяцанняў. Помнік паставяць Кебічу і Чарнамырдзіну за падпісанне пагадненняў аб далучэнні... да Расіі.

Дэп. Крыжаноўскі М. К. Хваліць даклад Шушкевіча; Кебіч прачытаў той самы даклад, што і шмат разоў раней. Урад не ажыццяўляе законы. (У зале шумяць.) Б'е наменклатуршчыкаў за катэджы: цэмент бяруць па 70 рублёў мяшок, шпалеры — па 3,5 рубля метр. «Гарызонт» праеў крэдыт на 20 млн. марак, а выраб тэлевізараў знізіўся на 140 тысяч. (Сапраўды, дзіўна! Дзе ж плён ад крэдыту?) Жудасныя страты БелАЗа!..

Дэп. Грыб М. І. У дакладах прагучала сур'ёзная крытыка і самакрытыка. Расійскія тавары складуць нашым моцную канкурэнцыю. Не забываць і аспекты палітычныя! Павінен быць рэальны падзел уладаў і паўнамоцтваў.

Дэп. Жукоўскі М. Дз. У дакладах бачанне выйсця ёсць, задача ў тым, каб аб'яднаць намаганні. У свеце 170 рыначных дзяржаў, а працвітаюць з іх — 20-30. А чаму? Рыначныя адносіны павінны быць рэгуляраваныя! Трэба сыходзіць з тых пазіцый, на якіх былі, калі звалілася на нас незалежнасць Беларусі. Сродкаў аднаго бюджэту не хопіць на сацыяльна незабяспечаных. Гуманітарная дапамога часта паступае абы-каму, а не ў дзяржаўны фонд.

Дэп. Спігласаў А. Ф. Эканоміка не церпіць эксперыментаў. Нам абавязкова патрэбная свая валюта! Трэба мяняць склад Урада, і ёсць кім замяняць у самім Урадзе.

Дэп. Баршчэўскі Л. П. З агульнай рублёвай зонай страцім і ўнутраны рынак — канчаткова! Задача Урада — прагназаваць, што будзе. Урад ставіць на палітычную карту, і нас ужо не ўспрымаюць як самастойную, незалежную краіну. Неабходна зрабіць поўныя замены ва Урадзе! Вячаслаў Францавіч, падайце ў адстаўку — і я складу свой дэпутацкі мандат і не буду выбірацца на чарговых выбарах!

У вуснах многіх нашых грамадзян словы «суверэнітэт», «незалежнасць» сталі словамі зняважліва-абразлівымі, гучаць, як лаянка...

Дэп. Пязняк З. С. Віна Кебіча — у разбурэнні эканомікі і многага іншага. Прычына — у палітычных пазіцыях Кебіча. Ён — за адраджэнне СССР, за ліквідацыю незалежнай Рэспублікі Беларусь, за ператварэнне Беларусі ў эканамічнае падмаскоўе. Самая вялікая шкода, нанесеная Урадам, — паліўны голад. У Балтыі — свая валюта, і таму — зусім іншае становішча. (Дае Кебічу і ў хвост і ў грыву!) «Што гэта за скамароства? Адкуль гэта глупства? Апрача дзяржаўнага самазабойства — Кебіч не бачыць выйсця. Ён не бачыць і не разумее, як выйсці з крызіснага становішча.

Дэп. Данілевіч І. М. Нагадвае пра гучную заяву Урада «легчы пад паравоз» — калі спатрэбіцца. «Буду гаварыць пра сельскую гаспадарку. Кожны дакладчык лічыць, што праўда ў яго. А я не бачу праўды ні ў аднаго, ні ў другога. Усходнія немцы не ліквідавалі сельгаскалектывы. Усякая стратэгія пачынаецца з земляробства. Я, кіраўнік аграфірмы, прадаў усю прадукцыю — і стаў у шэсць разоў бядней. Што ж гэта? Скажыце: калі пяройдзем на сусветныя цэны? Тады вёска выжыве. Ні адна сельская гаспадарка ў свеце не жыве без датацыі. Як дажыць да 1-га студзеня — не знаю. Лічу: тое, што зрабіў Нацыянальны банк, гэта — дыверсія супроць сяла. СМ павінен прадугледзець сродкі на вёску, на сельскую гаспадарку. Лён і бабовыя — наша золата, а не бульба і не мяса.

Дэп. Грыбанаў У. М. Чакалі высноў ад Шушкевіча. Але — не было: ні аб рэформах, ні аб адстаўцы. Як ісці да мэты — адказу не пачулі ў дакладах. Трэба хірургічнае ўмяшанне! Са скальпелем!

**17 лістапада.**

**Працяг абмеркавання дакладаў Шушкевіча С. С. і Кебіча В. Ф.**

Дэп. Булахаў Дз. П. Здрада нацыянальным інтарэсам — голы суверэнітэт, што ў галовах у нацыянал-радыкалаў. Трэба наводзіць парадак у структурах улады — у рамках Канстытуцыі. 1. Давайце падпішам пагадненні! 2. Абновім склад Урада! 3. Прымем новую Канстытуцыю! 4. Нам трэба моцная ўлада! («Сильная власть!» Што мае на ўвазе? Дыктатара?)

Дэп. Даўгалёў В. Б. Прапановы Шушкевіча і Кебіча, як выйсці з крызісу, — прынцыпова разыходзяцца. Далей прыводзіць жахлівыя лічбы (сапраўды: жах!). Міністэрства абароны стала камерцыйным. 500 тысяч гектараў лясоў, што ў веданні ваенных, — распрадаюцца. (Жах!) У кішэні сабе кладуць мільёны. (Жах!). Глыбокі крызіс праваахоўнай сістэмы. Горш няма куды. Прэм'ер адводзіць кожны раз убок ад галоўнага якой-небудзь прыдумкай. Урад не здольны ўзначаліць работу па выхаду з крызісу — трэба ставіць пытанне аб яго адстаўцы!

Дэп. Кучынскі Е. Ф. Крытыкуе Вярхоўны Савет за знешнепалітычную дзейнасць. За неажыццяўленне пагадненняў, падпісаных у Віскулях. «Скажыце: чаму ніводнай пастановы аб паездках у краіны СНД? Вузкі круг людзей дыктуе волю нам — усяму Вярхоўнаму Савету. Прапаную: 1. Зняць Шушкевіча з пасады старшыні ВС. 2. Прагаласаваць давер старшыні Нацбанка. 3. Трэба новая каманда, якая павядзе дзяржаву. (З каго, з якіх сіл каманда?).

Дэп. Сечка Л. Н. Сітуацыя з банкавай справай у нас — нікуды не вартая. Патрэбна паэтапная рэарганізацыя кіраўнічых структур.



Нельга недаацэньваць момант, які мы зараз перажываем — бо ён можа аказацца лёсавызначальным, ён можа стаць пачаткам канца...

Дэп. Кулакоў У. П. Што ў краіне такое становішча — вінаватыя і Урад і Вярхоўны Савет. Ніхто за нас нашы праблемы не вырашыць. Я — за эканамічны саюз з Расіяй, за рублёвую зону. Але — гэта залежыць не толькі ад РБ. Беларусь — зборачны цэх, залежны ад Расіі і іншых краін. Прапаную: 1. Правесці глыбокую структурную перабудову народнай гаспадаркі! 2. Трэба іншая падатковая сістэма. 3. Рацыянальна выкарыстоўваць рэсурсы! Напрыклад, лес: мы яго гонім за мяжу неапрацаваным, а трэба гнаць мэблю. Навісла небяспека над ільнаводствам. 4. Нельга траціць рынак збыту сельгаспрадукцыі. У нас ідзе няспынны рост цэн. Але ж гэта — не рынак! Рынак — канкурэнцыя тавараў!

Дэп. Гаркун У. Г. Што і як рабіць далей? Якія рэальныя шляхі на заўтра? — Ратыфікаваць пагадненне з Расіяй! Розніца ў цэнах прывяла да поўнага банкруцтва многіх-многіх гаспадарак. Выйсце адно — у цэнавай палітыцы. Чым больш калгас вырабляе мяса і малака — тым больш стратна для яго! Што гэта? Бутэлька кефіру — 40 рублёў, бутэлька мінералкі — 330! Што гэта ТАКОЕ? Карэнным чынам змяніць крэдытную палітыку! Няма доўгатэрміновых крэдытаў для сельскай гаспадаркі. Што гэта? Дзе такое ёсць у свеце? (Божа праміл! Сапраўды: што гэта? Што гэта?)

Дэп. Сасноў А. В. Толькі эканамічныя рэформы змогуць вычаратаваць краіну! Хай і ў саюзе з Расіяй і іншымі дзяржавамі — але рэформы! І рэнтабельныя прадпрыемствы чакае крах, калі не абнаўляць фонды. Даць рэнтабельным прадпрыемствам замацавацца на рынку! Бо — адкуль будзе бюджэт? Урад абяцае... ужо тры гады! А Вярхоўны Савет верыць яму! І цалвярджае кожную новую праграму. Адносіны Урада да недзяржаўнага сектару — абыякавыя, няма падтрымкі. Можа, усё ж адправім Урад у адстаўку? (Які малайчына Сасноў, які малайчына!).

Дэп. Беленькі Ю. А. Прычына развалу фінансавага становішча Беларусі — поўная некампетэнтнасць Ураду ў фінансава-валютных справах. Ён прымае незаконныя пастановы. Банк іх не выконвае. Ствараецца фіктыўны капітал. (Во! Во малайчына!). Што дасць аб'яднанне грашовых сістэм? Будзе страшны ўдар па сельскай гаспадарцы. Нацыянальны банк не дапаможа ёй.

Дэп. Пракаповіч П. П. Што мы сабе думаем? Маем 150 мільярдаў доўгу Расіі за газ — і чакаем, пакуль нас адключаць? Чаму Вярхоўны Савет не кантралюе выкананне Законаў і Пастаноў? Напрыклад, аб прыярытэтах сяла? Паставілі б пытанне — і вызвалілі ад пасады, калі Багданкевіч не слухае! КДБ — у вас! Кантрольная палата — у вас!

Дэп. Гермянчук І. І. Лепш сёння адправіць Кебіча пакаваць чамаданы! Бо праз месяц-другі ўсё адно пойдзе! (У зале шумяць, стукаюць, ляпаюць.) Заяўляюць: «Рэспубліка папала ў крызіс!». Як быццам — сама сабой! Ніякага даверу Ураду няма і не будзе! Абяцалі, абяцалі і зноў абяцаюць! І што? У рабочы час член Прэзідыума Вярхоўнага Савета едзе на свой катэдж. Гэта не дробязь, гэта нахабства! Жонку Кебіча злавілі за руку: тры мільёны бюджэтных даляраў! І што? Журналіста — у суд!

Дэп. Голубеў В. Ф. Хто будзе несці адказнасць за невыкананне Праграм? Чаму вы, Станіслаў Станіслававіч, не паставілі пытанне аб бяздзейнасці Урада? Не трэба, сп. Кебіч, уводзіць валюту сваю прымусова! Расійскі Урад будуе Расію. Кебіч не разумее гэта, ці не хоча разумець. Наконт структуры Урада скажу: у нас над міністрамі стаяць упраўленні і кіруюць міністэрствамі. Наконт знешняй палітыкі: станцыю Гадуцішкі аддалі Літве. Без рашэння Вярхоўнага Савета! Кебіч аддаў! Сам! (Ох, і зашумелі-закруціліся ў зале.)

Дэп. Герасіменка А. М. Заклікаю падтрымаць ідэю стварэння Вышэйшага Савета па эканоміцы. 1. Рэфармаваць банкавую сістэму. Усе банкі передаць Ураду! 2. Падатковая палітыка павінна стымуляваць прадпрыемствы, а не быць фіскальнай. Затым цытуе нейкі зварот аб падтрымцы эканамічнага саюза і рублёвай зоны. Прадпрыемствы вінаваты гораду Мінску 75 мільярдаў рублёў (Жах! Што ж адбываецца?) Рэкамендуе не захапляцца чэкамі, думаць пра сацыяльную абарону грамадзян! І пра бюджэт!

Дэп. Сямдзянава Г. Г. Чэргі па хлеб такія, што — у адстаўку ўвесь кабінет Урада! Яго грахі не пералічыць!

Дэп. Унучка Р. І. БНФ і ПКБ (Партыя камуністаў) самкнуліся ў сваёй дзейнасці. Мала шукаем крыніцы энергіі. Ядзерную трэба развіваць! Каб не загубіць эканоміку — трэба ўзяць крэдыт на 450-500 мільёнаў даляраў. Вёску заспакойваем, ашукваем — як і раней. Вытворчасць прадукцыі сельскагаспадарчай стала нявыгаднай. Стала нявыгадна ў вёсцы жыць.

Дэп. Антончык С. А. Гваздае карпаратыўныя партыйна-дзяржаўныя групы, якія рабуюць народ і краіну. (Ой гваздае!) Гваздае — як прайдзісветаў. (А як доказна!) Урад дазваляе ім займацца прыхватызацыяй! У гэтых умовах — толькі адстаўка Урада! Заклікае народ да забастовак, да бунту, на вуліцу! (Такога з трыбуны ВС яшчэ не гучала!.. Сапраўдны рабоча-пралетарскі лідэр! Брава, Антончык!)

Дэп. Качан М. А. Унучка — былы першы сакратар РК КПСС, сёння ён — жоўта-карычневы. Я абвяргаю ўсе яго абвінавачванні. Далей — драпежысь БНФ, прамовы Пазьняка, Гермянчука, Голубева. А галоўнае — у адстаўку Шушкевіча! У гэтых мэтах патрабуе арганізаваць ліст выбаршчыкаў. І зноў і зноў — пра Віскулі.

Дэп. Аламліеў В. П. Мы ўхіліліся ад рашэння эканамічных праблем. Цытуе Лінга: «Калі паперадзе эканомікі ідзе палітыка — будзе крах! Не будзе — ужо ёсць. (Робіць доказны аналіз гэтага.) Што ў такім хаосе, як у нас, можна зрабіць? Адны (Заламай, Казлоў) — за СНД, другія — супроць, за дэнансацыю дагавора. Кебіч даўно заслугоўвае адстаўкі!

Дэп. Марыніч М. В. Заклікаў падтымаць і Кебіча і Шушкевіча. Даверыцца ім — і няхай працуюць!

**18 лістапада.**

Дэп. Гілевіч Н. С. Тут была заява, што пытанне аб незалежнасці хочуць абмяркоўваць адно дэпутаты з апазіцыі — члены БНФ ды Грамады. Я не належу ні да БНФ. ні да Грамады, ні да якой-небудзь іншай партыі. Не належу і не збіраюся належаць. Але я належу да народа, які тут жыў, жыве і будзе жыць і які заслугоўвае лепшае долі, чым тая, якую меў у стагоддзях, калі з яго воляй ніхто не лічыўся, да народу, які мае права, Богам данае права, быць і пачувацца гаспадаром на гэтай зямлі, на сваёй роднай зямлі — іншай у яго няма. І таму зразумець маю трывогу ў гэтую хвіліну, думаю, няцяжка. Нельга недаацэньваць момант, які мы зараз перажываем — бо ён можа аказацца лёсавызначальным, ён можа стаць пачаткам канца — канца таго, да чаго мы так доўга ішлі — да суверэннасці, да незалежнасці. І што ж прымушае многіх з нас, сыны і дочкі Беларусі, так легкадумна ставіцца да лёсу сваёй Бацькаўшчыны?



ПАЛІЦА

# СВЯТЛО ДАРОГІ

**Змешчаныя тут бліц-анонсы — на кнігі беларускіх літаратараў, якія жывуць і працуюць на Берасцейшчыне. І пішуць — плённа і прыгожа. І маюць толькі адно нараканне: напісанае і надрукаванае не заўсёды можа дайсці ў кнігарні і бібліятэкі беларускай сталіцы…**

**Николай АЛЕКСАНДРОВ. Долгий путь в Китеж. — Брест: ОАО «Брестская типография», 2009. — 440 с.**




Кніга выглядае выніковай, спавядальнай, рэтраспектыўнай. У ёй — і вершы, і мастацкія дзённікі, і глыбокая проза. Гэта душэўная аўтабіяграфія аўтара, яго «зваротныя» перажыванні, вандроўкі па часе і жыцці. А таксама — прачулыя ўспаміны, падобныя на «дайверскае апусканне да руінаў затопленага горада». (Пісьменнік нарадзіўся ў паўночнай валагодскай вёсцы, якая была затопленая падчас пабудовы воднай сістэмы Волга-Балта.) Вандроўка неўтаймоўнай душы скрозь гады да самага ранняга лёсавага вытока выявілася і ў структуры кнігі — у «адваротнай» храналагічнай падачы вершаў і мемуарнай прозы.

**Мікалай АЛЯХНОВІЧ. Святло дарогі: вершы. — Брэст: «Альтэрнатыва», 2010. — 98 с.**




Надзвычай светлая, шчырая і лірычная кніжка. Аўтар спеўна перажывае і свае думкі, і пачуцці. На шырокім мальберце — і летнія дарогі, і высокае неба, і прыгожы вечар, і начлежны агонь, і Ясельда, і восеньскі продум, і верасовы сон, і — безумоўна ж — «Паклон вясне». «На свеце ўсё мае сваю дарогу, — адзначае ў прадмоўнай анатацыі аўтар, — асвечаную і асветленую радасцю жыцця». Аб тым — і яго паэтычны спеў, калярова асветлены ў кнізе фотаздымкамі А.Жукоўскага.

**Александр АНТИКЯН, Сергей ЦЫПЛЮК. У каждого своя дорога: Повести и рассказы. — Брест: ОАО «Брестская типография», 2010. — 124 с.**




Кніга — нячасты ў сучаснай беларускай практыцы плён аўтарскай супрацы. Тэксты — чытэльныя, некаторыя — з дэтэктыўнымі сюжэтамі (як аповесць «Неуловимый Гарик»). «Сгущение сумерек» — сямейная драма, у цэнтры якой — вобраз «тыповай» жанчыны, ейная любоў і здрада мужа, а ў выніку пакутны выбар: дабрабыт дзяцей ці горкая праўда. Галоўны герой аповесці «Осиное гнездо» — следчы Юрый Дзюжны, справядлівы і непадкупны капітан міліцыі. Справа аб наркотыках прыводзіць бескампраміснага міліцыянера да гібелі… Апавяданні кнігі — на традыцыйныя для беларускай рэчаіснасці тэмы: страта быццёвых арыенціраў і каштоўнасцяў, любоў і нянавісць, падман і здрады.

**Кастусь ЖМІНЬКО. Час палыноў і ранетаў. — Брэст: «Альтэрнатыва», 2011. — 144 с.**

У новы — адкрыты і шчыры сваёй энергетыкай — зборнік сталага вопытам і лёсам аўтара ўвайшлі вершы, у якіх вядзецца пяшчотная размова пра лёс роднага краю, пра гады незваротнай маладосці, пра клопаты сённяшняга дня. Вылучаюцца і вершы з сатырычным падтэкстам, досціпам і самаіроніяй. Як, да прыкладу, «Выйсце з крызісу»:

*Што нам крызісу баяцца!*
*Не журыся вельмі, браце.*
*Дулю мы яму пакажам:*
*Штонікі шчыльней падвяжам,*

*Набярэм мяшок мякіны,*
*Накапаем добрай гліны,*
*Шчэ таго-сяго далучым —*
*Атрымаем кіт ліпучы.*

*Шчыліны заканапацім —*
*Зажывём кратамі ў хаце.*




Асобны раздзел утвараюць пераклады вершаў украінскіх паэтаў — з суседняй Берасцейшчыне Валыні.

**Николай ИЛЬЮЧИК. У памяти в долгу: документальная повесть. — Минск, Издатель А.Н.Вараксин, 2010. — 92 с.**




Новая дакументальная вострасюжэтная аповесць — пра гісторыю аднаго помніка. Яе вастрыня — і ў знешніх падзеях нашых дзён, і ў далёкім цяпер 1941-м годзе, у маральным людскім выбары. Выбар і стаў «галоўнай спружынай» аўтарскага аповеду. А яшчэ — і яго роздумаў аб жорсткасці і дабрыні, раўнадушшы і суперажыванні. І яго адказаў на спрадвечныя пытанні: як зберагчы сваю душу, як пазбыцца страху, як ставіцца на не заўсёды «правільнай» улады…

**Сергій ЦЫПЛЮК. Берестейські сполохи: Повісті та оповідання. — Луцьк, ВАТ «Волинська обласна друкарня», 2010. — 248 с.**




Зборнік аповесцяў і апавяданняў берасцейскага аўтара шчодра прэзентуе яго творчасць украінскаму чытачу. Звычайныя героі кнігі — геолагі, шахцёры, будаўнікі, вязні — часта трапляюць у незвычайныя, нават экстрэмальныя сітуацыі. Іх шлях апісваецца з дакументальнай дакладнасцю — ад сцюдзёнай тундры праз тайгу, стэпы, горы і даліны Азіі, Еўропы да гарачай Іспаніі. А над усім — любоў да Бацькаўшчыны, навакольнага свету і людзей.

Кніга праілюстраваная малюнкамі, сюжэтнымі партрэтамі ды пейзажнымі фотаздымкамі. Прачулую прадмову да яе напісаў калега-берасцеец Аляксей Філатаў.

**Брест. На перекрестке дорог и эпох: 1019–2009 / авт. концепции и текста А. М. Суворов; фото А. М. Суворов [и др.]. — Брест: «Полиграфика», 2009. — 239 с.**




Энцыклапедычная і папулярызатарская кніга прысвечана Брэсту — аднаму з найстаражытнейшых гарадоў Беларусі, якому больш тысячы гадоў. Аглядны гістарычны нарыс апавядае пра падзеі розных эпох, якія пакінулі глыбокі след у лёсе Бярэсця-Брэста і яго жыхароў.

Кніга складаецца з некалькіх частак, якія адпавядаюць асноўным этапам развіцця горада.

**Там, дзе Грыўда і Шчара: літаратурны альманах. — Брэст: «Альтэрнатыва», 2011. — 200 с.**




Гэта першы літаратурны альманах Івацэвіччыны, радзімы Піліпа Пестрака і Яраслава Пархуты. Укладальнік кнігі — Валерый Гапееў. У яе ўвайшлі творы паэтаў і празаікаў Івацэвіччыны і тых, для каго гэтая зямля засталася роднай. Гэта: Пятро Валінскі, Анатоль Галушка, Валерый Гапееў, Алесь Зайка, Людміла Занько, Таццяна Куратнік, Сцяпан Кухарчук, Надзея Кухценя, Уладзімір Мароз, Юрась Нераток, Вольга Пагуда, Фёдар Палто, Віктар Радынь, Віктар Рэчыц, Анжэліка Шыманчык.

Кніга выдадзена пры падтрымцы рэдакцыі раённай газеты «Івацэвіцкі веснік».

Кіраўнік праекта «ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ» Алесь ПАШКЕВІЧ. Рэдактар Барыс САЧАНКА. Тэлефон для даведак: (8-017) 200-80-91.
Адрас электроннай пошты: sbp@tut.by

## 8 ТРАЎНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**08.05** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальных фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** У свеце матораў.
**10.15** «Культурныя людзі».
**10.45** Камедыйны серыял «Сваты-4» ( Украіна).
**12.10** «Балада пра салдата». Ваенная драма (СССР).
**13.55** Сінематэка.
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.20** Навіны рэгіёна.
**15.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**16.05** «Каханне і галубы». Народная камедыя (СССР).
**18.05** Суперлато.
**19.15** «Ведай нашых».
**19.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.45** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Урачысты сход і святочны канцэрт.
**23.35** «Свае». Драма (Расія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь (з субтытрамі).
**09.20** Камедыйны серыял «Мая выдатная няня», 2004 год.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** Фазэнда.
**11.50** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**12.20** Фільм «Ваенна-палявы раман».
**14.05** АНТ прадстаўляе: «Брэйн рынг».
**15.05** АНТ прадстаўляе: «Гарады-героі. Наварасійск».
**16.00** Нашы навіны (з субтытрамі).
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Давай ажэнімся!».
**17.25** АНТ прадстаўляе: «Эстрадны коктэйль».
**18.45** Прэм'ера. Фільм «Заградатрад».
**20.00** Контуры.
**21.05** Прэм'ера. Фільм «Заградатрад». Працяг.
**23.00** Ток-шоў «Кухня».
**23.3** Прэм'ера. Фільм «Ноч даўжынёю ў жыццё».

### СТВ

**06.05** Фільм «Маленькі Манхэтэн». ЗША, 2005 г.
**07.35** Фільм «Пра тых, каго памятаю і кахаю». СССР, 1973 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Салдаты. Дзембель непазбежны!» Серыял.
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Не забудзься… станцыя «Лугавая». СССР, 1966 г.
**15.30** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** Фільм «Блаславіце жанчыну». Расія, 2004 г.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Піцер FM». Расія, 2006 г.
**22.25** Фільм «Людзі добрыя». Расія, 2009 г.

### ЛАД

**07.30** Дабравест.
**07.55** Мір вашай хаце.
**08.10** Кінааповесць «Я родам з дзяцінства» («Беларусьфільм»).
**09.50** Медычныя таямніцы.
**10.35** Медычныя таямніцы +.
**10.50** Школа рамонту.
**12.00** Тэлебарометр.
**12.05** Нашы тэсты.
**12.40** Кінаспробы.
**13.05** «Правы чалавека».
**13.20** Гаспадар.
**13.50** Бухта капітанаў.
**14.30** Ваенная кінаэпапея «Вызваленне» (СССР-ГДР-Польшча).
**17.10** Хакей. Чэмпіянат свету. Матч другога раўнда. Прамая трансляцыя.
**19.30** Конкурс-віктарына «Дзеці новага пакалення».
**20.35** «Навіны надвор'я».
**21.10** Смешная часіна.
**21.45** Хакей. Чэмпіянат свету. Матч другога раўнда.
**23.45** Культасвет.

### РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.40** Фільм «Развітанне славянкі».
**09.15** Фільм «На вайне як на вайне».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.10** Прэм'ера. «З новай хатай!».
**12.25** Фільм «Вылет затрымоўваецца».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.50** «Гарады і Весі».
**15.50** Прэм'ера. «Віктар Някрасаў. Усё жыццё ў акопах».
**17.00** Фільм «Дарагі мой чалавек».
**19.00** Прэм'ера. «Жарты ў бок». Канцэрт. Частка 2-я.
**20.00** Весткі.
**20.25** Прэм'ера. Тэлесерыял «Ваенная выведка. Заходні фронт».
**00.20** Прэм'ера. «Добры вечар з Максімам».

### НТВ

**07.40** Дзіцячая раніца на НТБ-Беларусь.
**08.00** Сёння.
**08.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**08.45** «Іх норавы».
**09.25** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.50** «Баль на ўвесь свет».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** «Сеанс з Кашпіроўскім».
**13.45** Серыял «Каця».
**19.00** «Сёння».
**19.30** Прэм'ера. Серыял «Каця. Працяг».
**23.10** Прэм'ера. Ваенная драма «Макс Манус - чалавек вайны».
**01.15** «Футбольная ноч».

### EUROSPORT

**09.30** WTCC з... Часопіс.
**10.00** Мотаспорт. GP3. 1-я гонка. Стамбул (Турцыя).
**10.30** Мотаспорт. GP3. 2-я гонка. Стамбул (Турцыя).
**11.00** Веславанне. Кубак свету. Спрынт. Польшча.
**12.00** Тэніс. WTA. 1/2 Фіналу. Мадрыд (Іспанія).
**12.45** Супербайк. Часопіс.
**13.00** Супербайк. Кубак свету. Заезд 1-ы. Монца (Італія).
**14.00** Суперспорт. Кубак свету. Монца (Італія).
**15.15** Веласпорт. Чэмпіянат Італіі. 1-ы этап.
**16.00** Веласпорт. Чэмпіянат Італіі. 2-і этап.
**18.30** Супербайк. Кубак свету. Заезд 2-і. Монца (Італія).
**19.15** Мотаспорт. Часопіс.
**19.30** Тэніс. WTA. Фінал. Мадрыд (Іспанія).
**21.00** Бокс. Міжнародны паядынак. Новая Зеландыя.
**23.00** Веласпорт. Чэмпіянат Італіі. 2-і этап.
**00.00** Тэніс. WTA. Фінал. Мадрыд (Іспанія).
**01.15** Супербайк. Кубак свету. Заезд 2-і. Монца (Італія).
**02.00** Мотаспорт. Часопіс.

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**07.40** «Загадкі Мэрдака», дэтэктыўны серыял: 10 серыя.
**08.25** «Машына зменаў», тэлесерыял: 7 серыя.
**08.55** Калыханка для самых маленькіх.
**09.20** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**09.35** Вагон (сатырычна-забаўляльная праграма).
**09.45** Два на два (тэледыскусія): Уладзімір Мацкевіч і Леў Марголін.
**10.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Бывай, Ленін», 2009 г., Польчша.
**10.35** Форум (ток-шоу): «Дбаем аб сваім».
**11.20** «Падзенне жалезнай заслоны», дак. фільм, 2009 г., Германія: 5 серыя, «Расія».
**12.15** Еўропа сёння (тэлечасопіс каналу «Нямецкая хваля»).
**12.45** «Машына зменаў», тэлесерыял: 7 серыя.
**13.15** Калыханка для самых маленькіх.
**13.40** «Папіён», біяграфічная драма, 1973 г., ЗША.
**16.05** «Таямніца крэпасці шыфраў», тэлесерыял: 2 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 28 серыя.
**18.05** «CIA: таемныя войны (1947–1977)», 2008 г., Францыя: фільм 1, «Сакрэтныя аперацыі».
**19.00** «Старадаўнія інструменты Беларусі. Лютня», дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**19.15** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.40** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма).
**20.00** ПраСвет (інфармацыйна-публіцыстычная праграма).
**20.30** Басанож па свеце (спазнаваўчая праграма).
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт (інфармацыйна-аналітычная праграма).
**22.00** «Найгалоўнейшы бос», камедыя, 2006 г., Данія.
**23.35** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма).
**23.45** Тыдзень у «Аб'ектыве».


## Шаноўныя чытачы!

**На жаль газету «Новы час» не магчыма купіць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ОАО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый.
Віцебск: (8 029) 308 49 78, Юрый.
Масты: (8 029) 138 79 94, Дзмітрый.
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей,
(8 029) 178 31 68, Вольга

БЕЛПОЧТА ф. ПС 112

ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ______________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

## Паважаныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

Счет получателя 3012741108019 Лицевой счет Код 739
УНП* 190790926

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ________
Кассир Всего ________

## Для тых, хто прымае рашэнні!

НОВЫ ЧАС

www.novychas.org

ЦІКАВА

# ТЭРАРЫСТЫЧНЫЯ АКТЫ, ЯКІЯ ЗМЯНІЛІ ГІСТОРЫЮ

Андрэй РАСІНСКІ

**У сусветнай гісторыі нямала прыкладаў тэрарыстычных актаў, якія знеслі сотні жыццяў ні ў чым не вінаватых людзей. Усе яны так ці інакш паўплывалі на развіццё краін, урадаў і грамадства. Прапануем рэтраспектыву некаторых з іх, якія, на думку аўтара, змянілі гісторыю.**



## Мадрыд, 11 сакавіка 2004 года

11 сакавіка, у ранішнюю гадзіну пік, у чатырох мадрыдскіх электрычках на станцыях Аточа, Поза Дэль Цio і Санта Эўхенія выбухнулі 10 бомбаў. Яшчэ тры бомбы потым абясшкодзілі паліцэйскія. 192 чалавекі загінулі, 2050 былі паранены.

Тэракт адбыўся за тры дні да парламенцкіх выбараў. Урад Хасэ Марыя Аснара адразу абвінаваціў у выбухах баскскіх баевікоў з арганізацыі ЭТА. Але сепаратысты выканаць такую маштабную акцыю не маглі. За выбухамі стаялі ісламскія тэрарысты.

Правы ўрад Аснара цалкам падтрымаў дзеянні Вашынгтону, які ў 2003 годзе правёў вайну супраць Садама Хусейна. Такая палкая праамерыканская пазіцыя выклікала ў грамадстве крытыку, але, нягледзячы на гэта, на выбарах прадказвалі перамогу Народнай партыі. А калі б версія пра сепаратыстаў пацвердзілася, то гэта дадало Аснару яшчэ галасоў.

Выбухі змянілі палітычны ландшафт Іспаніі. Да ўлады прыйшлі сацыялісты. Іх лідар Хасэ Луіс Радрэгес Сапатэра сфармаваў аднапартыйны ўрад і адразу яго ўзначаліў (такой хуткасці не назіралася з часоў Франка).

Іспанскія войскі былі выведзены з Іраку за 15 дзён.

## ЗША, 11 верасня 2001 года

19 тэрарыстаў Аль-Каіды, падзяліўшыся на групы, захапілі чатыры пасажырскія самалёты. Два самалёты пратаранілі нью-ёркскія вежы-блізняты Сусветнага Гандлёвага цэнтру, ад чаго тыя загарэліся і абваліліся. Адзін самалёт урэзаўся ў Пентагон, а апошні, скіраваны на Капітолій, упаў на зямлю. Загінулі 2974 чалавекі, яшчэ 24 зніклі без вестак.

У выніку самага маштабнага тэрарыстычнага акту ў гісторыі, Злучаныя Штаты абвясцілі вайну Аль-Каідзе і зрынулі рэжым талібаў у Афганістане, якія далі прытулак тэрарыстам. Пад раздачу трапіў і Садам Хусейн, абвінавачаны ў стварэнні зброі масавага знішчэння.

У Афганістане і Іраку знаходзяцца міжнародныя вайсковыя кантынгенты на чале з ЗША.

## Расія, 1999 год

З 4 па 16 верасня ў Буйнакску, Маскве і Валгадонску былі падарваныя жылыя дамы. 307 чалавекаў загінулі, болей за 1700 былі параненыя.

Паводле расійскіх судовых прысудаў, тэракты былі арганізаваныя кіраўнікамі ўзброенага Ісламскага інстытуту «Каўказу» Эмірам аль-Хатабам і Доку Умаравым. Узрывы разглядаліся як акт застрашвання — пасля таго, як федэральныя войскі адбілі атаку чачэнскіх баевікоў на Дагестан.

Але 22 верасня ў Разані жыхары заўважылі невядомых, якія закладалі ў сутарэнне дому мяхі. Расійскія ўлады абвясцілі, што прадухілены тэрарыстычны акт, а ў мяхах выбухоўка. Але надалей было заяўлена, што схопленыя людзі — супрацоўнікі ФСБ, якія толькі праводзілі вучэнні, а замест выбухоўкі — цукар. Існуе версія, што расійскія спецслужбы «перанакіравалі» выбухоўку сепаратыстаў з ваенных аб'ектаў на мірныя, каб прыйсці да ўлады.

У выніку выбухаў рэйтынг малавядомага тады прэм'ера Пуціна, які заявіў, што тэрарыстаў будуць мачыць у сарціры, узляцеў да нябёсаў. Федэральныя войскі ўвайшлі ў Чачню — і яна была вернутая пад кантроль Масквы.

Выхадзец з КДБ Пуцін стаў прэзідэнтам. У Расію вярнуўся аўтарытарызм.

## Германія, 1933 год

27 лютага а 22 гадзіне берлінскія пажарныя выехалі да Рэйхстагу, які быў у агні. Толькі праз паўтары гадзіны пажар быў патушаны. У будынку быў затрыманы галандзец Марынус ван дэр Любэ, былы камуніст. Гітлер, які аператыўна прыбыў на відовішча, на прыступках Рэйхстагу — у кампаніі з Гебельсам, Герынгам і Францам фон Папенам — заявіў, што падпал здзейснілі камуністы, якія рыхтуюць дзяржаўны пераварот.

На наступны дзень быў выдадзены надзвычайны дэкрэт «Пра абарону народа і дзяржавы», які адмяняў свабоду асобы, сходаў, слову, друку, недатыкальнасць прыватнай уласнасці і тайну ліставання. Чатыры тысячы камуністаў, ліберальныя і сацыял-дэмакратычныя палітыкі, у тым ліку і дэпутаты парламенту, былі арыштаваныя. Камуністычная партыя была забароненая, а галасы, аддадзеныя ім на парламенцкіх выбарах 5 сакавіка, адышлі да нацыстаў. Спалены і абкарнаны Рэйхстаг даў Гітлеру неабмежаваную ўладу на 4 гады (неабмежаванасць гарантавана падоўжылася).

З судовым працэсам, які зрабілі адкрытым, у нацыстаў адбыўся пракол. Толькі ван дэр Любэ быў асуджаны на смерць, а балгарскія камуністы Танеў, Папоў і Дзімітраў былі апраўданыя. А Георгі Дзімітраў, які пасля вайны ачоліць камуністычную Балгарыю, скарыстаўся трыбунай, каб выкрыць нацыстаў.

Надалей фашысты выправілі «памылку», перадаўшы палітычныя справы ў Народную судовую палату. А ўвогуле, многіх саджалі без суда.

Уільям Шырэр распавядае, што нацысты чулі, як ван дэр Любэ нападпітку пахваляўся піраманскімі планамі. Нацысты скарысталі Любэ як нагоду; разам з ім у Рэйхстаг па падземным тунелі трапіў атрад штурмавікоў на чале з Карлам Эрнстам. Штурмавікі разлілі бензін ды падпалілі яго.

Правакацыя атрымалася.

Прысуд ван дэр Любэ быў адменены ў 2008 годзе.

## Рым, 64 год

У ноч з 18 на 19 ліпеня ў лаўках ля Вялікага цырку пачаўся пажар. Ён палаў шэсць дзён і сем начэй. Пажар спустошыў 11 з 14 кварталаў гораду; згарэла безліч жылых дамоў (чатыры кварталы дашчэнту), дамы старых палкаводцаў, храмы, у тым ліку пастаўленыя ў памяць гальскіх і пунічных войнаў. Колькасць ахвяраў невядомая.

Святоній распавядае, што Рым быў падпалены па загадзе імператара Нерона, якому не падабаліся старыя хаткі і крывыя завулкі: «Многія кансуляры лавілі ў сябе ў дварах ягоных слугаў з паходнямі і пакляй, але асцерагаліся іх чапаць». Сам імператар, які трызніў мастацтвам, як сёння трызняць хакеем, з Мецэнатавай вежы назіраў за полымем і ў тэатральных шатах дэкламаваў «Падзенне Троі».

Нават пасля пажару Нерон не забыў пра выгоду: абвясціўшы, што трупы будуць спаленыя за дзяржаўны кошт, ён не падпускаў людзей да рэшткаў маёмасці. Народ быў упэўнены, што вінаваты Нерон.

Але Тацыт лічыць, што рымскі кіраўнік не датычны да пажару. Ён забяспечыў пагарэльцаў харчаваннем. І аднавіў горад па сваім плане.

Затое адразу знайшліся казлы адпушчэння:

«І вось Нерон, каб прадухіліць чуткі, прышукаў вінаватых і аддаў на пакуты тых, хто сваімі мярзотамі наклікаў на сябе ўсеагульную нянавісць і каго натоўп называў хрысціянамі. Хрыста, ад каго пайшла гэтая назва, пакараў смерцю пры Тыберыі пракуратар Понцій Пілат; часова прыдушаныя, гэтыя згубныя забабоны зноў прарваліся вонкі, і не толькі ў Іудзеі, адкуль пайшла гэтая згуба, але і ў Рыме, куды адусюль сцякаецца ўсе найбольш гнюснае і ганебнае і дзе яно знаходзіць прыхільнікаў. Такім чынам, спачатку былі схопленыя тыя, хто адкрыта прызнаваў сябе прыналежнымі да гэтай секты, а потым па іх указаннях і вялікае мноства іншых, выкрытых не столькі ў злачынным падпале, колькі ў нянавісці да роду людскога. Мардаванне суправаджалася здзекамі, бо хрысціян апраналі ў скуры дзікіх звяроў, каб яны былі разарваныя да смерці сабакамі, крыжавалі, або асуджаных на смерць у агні падпальвалі з надыходам цемры для начнога асвятлення».

Нерон любіў садысцкія забавы. Паводле царкоўнага падання, пасля рымскага пажару былі закатаваныя апосталы Пётр і Павел.

Неўзабаве Нерон быў зрынуты, і ён з крыкамі: «Які акцёр памірае!» закалоўся.

Касцёл стаіць дасюль.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

«Не выключана, зрэшты, што Мінску, нават калі Беларусь атрымае крэдыт, усё адно давядзецца правесці дэвальвацыю. І наступствы яе цяпер цяжка прадказаць: беларускай эканоміцы напэўна стане лепш, але вось шокавая тэрапія, якая пагражае стратай долі прыбыткаў, звычайным беларусам будзе забяспечана. Выйсце ў Мінска, які кантралюе больш паловы беларускай эканомікі, тым часам, ёсць. І яно цалкам відавочнае — прыватызацыя. Гэта, зрэшты, супярэчыць палітычным устаноўкам мінскага істэблішменту. Акрамя таго, распродаж актываў пагражае сацыяльным пратэстамі, бо замежныя спонсары (можна не сумнявацца) паспрабуюць «аптымізаваць» працоўныя працэсы на выкупленых прадпрыемствах. Пакуль Лукашэнка нічога прадаваць не жадае, а толькі вышуквае нейкіх знешніх ворагаў, якія быццам завялі краіну ў крызіс і падштурхоўваюць яе да прыватызацыі. Беларускі прэзідэнт упэўнены, што Масква яго не падвядзе. Мабыць, толькі ён і ведае, навошта Расіі патрэбны такі партнёр.

**Лента.Ру (Расія)**

Беларускія палітыкі і эксперты перакананы, што следчыя спрабуюць знайсці падставы для пацверджання версій прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі пра сувязі беларускай апазіцыі з арганізатарамі і выканаўцамі тэракту. Таму нават калі падчас судовых працэсаў, якія пачынаюцца, віна апазіцыйных лідараў (ці некаторых з іх) не будзе ўсталявана, увязка апазіцыі з расследаваннем тэракту ў галовах шматлікіх беларускіх абывацеляў застанецца. Гэта, падобна, і трэба ўладам Беларусі.

**«Коммерсант-ъ» (Расія)**

«Трэба давесці, што яны дзейнічалі на загад унутранага ворага і атачэння варожых суседзяў: Польшчы, можа, Германіі, можа нават Расіі. Гэта дапаможа ўбіць у галовы, што Беларусь — крэпасць у аблозе, якую трэба бараніць коштам вялікага самаахвяравання, — кажа Анатоль Лябедзька, лідар апазіцыйнай АГП. — Гадамі рэжым пераконваў нас, што галоўнае — гэта поўны страўнік, поўная лядоўня і поўны кашалёк. І дзеля таго, каб стварыць ілюзію такога дабрабыту, выманьваў у суседзяў мільярдныя крэдыты, якія праядаліся. Цяпер улада будзе навязваць нам новыя прыярытэты — стабільнасць і бяспека. А ў аблажанай крэпасці можна абысціся без долараў або нават цукру».

**«Gazeta Wyborcza» (Польшча)**

Як ён (Лукашэнка) можа пакінуць на волі апанентаў яго фундаментальных ідэй? Гэта, зрэшты, яго памылка. Як ён сам прызнаў: ён развёў у краіне занадта шмат дэмакратыі. Ён залішне аслабіў ціскі, у якіх знаходзілася прэса, і нягоднікі гэтым скарысталіся. Яны нават адважыліся выступіць на дзяржаўным тэлебачанні!

**«Agora Vox» (Францыя)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### КІРГІЗІЯ. МАГІЯ ЯК СРОДАК СУПРАЦЬ РЭВАЛЮЦЫІ

120 кіргізскіх народных выбраннікаў скінуліся прыкладна па 15 долараў, каб магічным спосабам нармалізаваць працу парламента. Сабраных грошай хапіла на 7 ахвярных баранаў, якія былі ўрачыста зарэзаныя перад пачаткам пленарнага пасяджэння. Такім спосабам дэпутаты паспрабавалі выгнаць «злых духоў», якія, па іх меркаванні, замінаюць нармальнай працы парламента. Нагадаем, што будынак парламенту быў двойчы разгромлены падчас апошніх рэвалюцый. Спікер парламента адзначыў, што частка сабраных дэпутатамі сродкаў была накіравана на рахункі дамоў для састарэлых і дзіцячых інтэрнатаў.

**Па матэрыялах кіргізскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. ШЛЮБ ДАПАМОЖА АДРАДЗІЦЬ ФРАНЦУЗСКУЮ МАНАРХІЮ

Вяселле Кейт і Уільма выклікала цікавую рэакцыю па той бок Ла-Маншу. Інтарэс да мерапрыемства перарос у інтарэс да мадэлі манархіі і, адпаведна, спрыяў росту інтарэсу да ідэі рэстаўрацыі каралеўскай улады ў Францыі. Мясцовыя манархісты ахвотна выкарыстоўваюць гэтую атмасферу ў мэтах прапаганды. Яны звяртаюць увагу на тое, якую вялікую ролю інстытут манархіі гуляе ў механізме стварэння калектыўнай ідэнтыфікацыі брытанцаў. Нагадаем, што зараз Францыя сутыкнулася з феноменам, калі французскія грамадзяне, асабліва мусульмане, не лічаць сябе французамі. Якім чынам інтарэс да манархіі можа перарасці ў канкрэтныя крокі па вяртанню караля, застаецца загадкай. Акрамя таго, манархісцкая супольнасць Францыі расколатая на прыхільнікаў Бурбонаў і Напалеонаў.

**Па матэрыялах «Le Figaro» (Францыя)**

### ТУРКМЕНІЯ. АПАЗІЦЫЯ ПРАПАНУЕ ЗМЯНІЦЬ НАЗВУ ДЗЯРЖАВЫ

Група туркменскіх апазіцыянераў, якія знаходзяцца ў эміграцыі, выступіла з ініцыятывай змяніць назву краіны і карэннай нацыі. На думку апазіцыянераў, краіна павінна называецца Туран. Быццам назва «туркмены» была навязаная тубыльцам цюркамі, якія захапілі старажытную дзяржаву Туран у VI стагоддзі. Справу асіміляцыі працягнулі арабы, а канчатковую кропку паставіла племя тэке, якое прыйшло сюды з Персіі. У XIX стагоддзі ў край прайшла Расія, якая зрабіла стаўку на клан тэке. Практыку працягнулі бальшавікі, пры якіх была створаная Туркменская АССР. «Сыходзячы з выкладзенага вышэй, уяўляецца мэтазгодным і неабходным назваць краіну Туран, а жыхароў зваць туранцамі. Трэба вывесці туранскі народ з цемры «забыцця», вярнуць да сваіх сапраўдных каранёў і сваёй праўдзівай гісторыі», — гаворыцца ў дакуменце апазіцыянераў. Пакуль на іх радзіме ніяк на прапанову не рэагуюць.

**Па матэрыялах туркменскіх СМІ**

### РАСІЯ. СІБІР БУДЗЕ ПРАТЭСТАВАЦЬ

1 мая ў Новасібірску адбудзецца вулічная акцыя пад лозунгам «Хопіць плаціць даніну Маскве». Адзін з арганізатараў акцыі мастак Арцём Лапікаў наступным чынам растлумачыў яе сэнс: «У Маскве праводзіўся мітынг «Хопіць карміць Каўказ». Лозунг «Хопіць плаціць даніну Маскве» — гэта рэакцыя на тое, што адбываецца ў Маскве. Сібір з'яўляецца маскоўскай калоніяй. З Сібіры выпампоўваецца нафта і газ. Да Сібіры стаўленне як да складу рэсурсаў», — заявіў мастак. Ён дадаў, што ўлады Новасібірска далі згоду на правядзенне шэсця, хаця спачатку адмовілі.

**Па матэрыялах расійскіх СМІ**

### ГРУЗІЯ. АБ'ЯДНАНЫЯ ШТАТЫ КАЎКАЗУ

У экспертную сферу Грузіі і Арменіі патрапілі чуткі пра тое, што Вашынгтон плануе стварыць на тэрыторыі Каўказа нейкую новую міждзяржаўную структуру. Такім чынам, быццам, можа вырашыцца пытанне канфліктаў на Каўказе. Пра тое, што міжнародная супольнасць працуе над планам стварэння «Каўказскіх злучаных штатаў», заявіў лідар армянскай партыі «Новы час» Арам Карапецян. Па версіі журналістаў у Грузіі, такім чынам Захад жадае вывесці з-пад уплыву Расіі, з аднаго боку, Арменію, з іншага — канфліктныя рэгіёны Карабаху, Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Па версіі грузінскага эксперта па пытаннях Каўказа, штосьці падобнае зараз рыхтуе і Расія. Па яго словах, у Крамлі распрацоўваецца план стварэння мадэлі СНД новага тыпу, у які павінны ўвайсці Абхазія і Паўднёвая Асеція.

**Па матэрыялах грузінскіх СМІ**

### ПЕРУ. СУПРАЦЬ ЧАВЕСА СТВОРАНЫ ГЕАПАЛІТЫЧНЫ БЛОК

У Лацінскай Амерыцы з'явілася новае інтэграцыйнае аб'яднанне. У яго склад увайшлі краіны Ціхаакіянскага ўзбярэжжа: Перу, Чылі, Мексіка і Калумбія. Мэта блока — паглыбленне эканамічнага супрацоўніцтва паміж удзельнікамі, захоп новых рынкаў, у першую чаргу ў Азіяцка-Ціхаакіянскім рэгіёне, а ў перспектыве — стварэнне агульнага рынка. На саміце чатырох краін падпісаная «дарожная карта», якая вызначае асноўныя кірункі супрацоўніцтва ў вытворчай сферы і аказанні паслуг. Новае аб'яднанне атрымала назву PACIFICA. Між тым, эксперты шукаюць сапраўдны матывы інтэграцыі. Магчыма, чацвёрка хоча такім чынам скласці канкурэнцыю Бразіліі, якая стала галоўным фінансавым цэнтрам мацерыка. Іншыя кажуць, што гэта хутчэй аб'яднанне супраць Венесуэлы і іншых радыкальных левых краін — Эквадора, Балівіі і Нікарагуа.

**Па матэрыялах «El País» (Іспанія)**

МЕРКАВАННЕ

# БІТВА ЗА КРЭМЛЬ ПАЧАЛАСЯ

**Дзмітрый Мядзведзеў і Уладзімір Пуцін заявілі, што збіраюцца ісці на прэзідэнцкія выбары 2012 года паасобку. Што стаіць за гэтымі заявамі? Пра гэта журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з расійскім палітолагам Дзмітрыем Касценкам.**



***— Калі з'явіліся прыкметы таго, што тандэм Мядзведзеў—Пуцін перажывае крызіс?***

— Даўно назіраліся нейкія супярэчнасці. Напрыклад, прэм'ер і прэзідэнт па-рознаму падыходзілі да справы Хадаркоўскага. Пасля быў скандал, звязаны з фігурай віцэ-прэм'ера Ігара Сечына, які лічыўся чалавекам Пуціна і якога нечакана знялі з пасады. Аднак, відавочна, што водападзелам стала Лівія. Мядзведзеў даў рэзка негатыўную характарыстыку заявам Пуціна пра памылковасць аперацыі Захаду супраць Кадафі. Праблема не толькі ў тым, што Мядзведзеў, у сваю чаргу, кантраста выступіў за сыход Муамара. Кіраўнік ураду асмеліўся каментаваць тэмы міжнароднай палітыкі, якая была вотчынай прэзідэнта. Для расійскага грамадства гэта стала сігналам таго, што Мядзведзеў гатовы кінуць выклік Пуціну. Пазней абодва сапраўды заявілі, што будуць балатавацца ў прэзідэнты. Бітва за Крэмль пачалася.

***— Якія шансы ў Мядзведзева перамагчы Пуціна?***

— Усім было відавочна, што Пуцін хоча застацца пры ўладзе нават пасля свайго сыходу з пасады прэзідэнта. Інакш ён бы не прасоўваў на вакантнае месца такога слабага і малавядомага палітыка, як Мядзведзеў. Лепшая ілюстрацыя — сітуацыя з партрэтамі прэзідэнта. Па закону, у афіцыйных кабінетах павінен вісець толькі партрэт прэзідэнта. Так было ў часы Ельцына і Пуціна. Аднак з прыходам да ўлады Мядзведзева ў грамадстве пайшла мода побач з Мядзведзевым вешаць фізіяномію Пуціна. Але гэта не значыць, што Мядзведзеў прайграе проста так. Калі ён зробіць добрае пасланне, вакол яго могуць аб'яднацца ліберальныя Піцер і Масква, лідары аўтаномій, частка моладзі, якая думае. Гэта будзе добры зачын на будучыню. Пуцін не вечны.

***— Ці няма ў вас адчування, што вайна Мядзведзева супраць Пуціна — гэта тонкі палітэхналагічны ход?***

— Згодны. Інакш бы расійскія афіцыйныя СМІ гэтак ахвотна не выносілі б на публіку канфлікты паміж прэзідэнтам і прэм'ерам. Супрацьстаянне Мядзведзева і Пуціна цалкам разбурае старую апазіцыю. Апазіцыя ў выглядзе камуністаў або нацыяналістаў Жырыноўскага папросту пасоўваецца на другі план. Галоўны грамадскі канфлікт у такім выпадку больш не будзе праходзіць па лініі — прыхільнікі рэстаўрацыі Імперыі або СССР супраць расійскіх дзяржаўнікаў. Ствараюцца два новых полюсы — памераныя лібералы пад кіраўніцтвам Мядзведзева, якім супрацьстаяць нацыянал-кансерватары Пуціна. Для Крамля галоўны плюс у тым, што абедзве фракцыі знаходзяцца ў адзіным дыскусійным полі, дзе няма лозунгаў геапалітычнага рэваншу. Быццам вырашаецца праблема грамадскага кансенсусу.

***— Як мінімум на апошніх двух выбарах прэзідэнта галоўнымі апанентамі кандыдатам ад Крамля былі Зюганаў і Жырыноўскі. Ці гатовыя лідары КПРФ і ЛДПР да таго, каб зараз гуляць ролю статыстаў?***

— Падсвядома, думаю, так. Каб кансалідаваць свой электарат, Зюганаў вымушаны ўвесь час чытаць філіпікі савецкім часам. Гэта дае яму стабільны працэнт, што, аднак, ператварае партыю ў зачынены клуб для тых, каму за шэсцьдзесят. Ёсць цяжкасці ва Уладзіміра Жырыноўскага, чый імідж нацыянал-патрыёта, асабістая эксцэнтрычнасць, флірт з крамлёўскай адміністрацыяй не зразумелыя новай генерацыі нацыяналістаў. Па шматлікіх прагнозах, партыя Жырыноўскага можа ўвогуле не трапіць у Думу па выніках восеньскіх выбараў. У ліберал-дэмакратаў рэйтынг не больш за 4 працэнты (прахадны бар'ер у Дзяржаўную Думу РФ складае 7 працэнтаў).

— Як можа сябе павесці на выбарах «Справядлівая Расія»?

— Гэта прадукт Пуціна, што з'яўляецца германафілам і доўгі час марыў пра імпарт у Расію нямецкай партыйнай сістэмы, якая, як вядома, заснаваная на супрацьстаянні кансерватараў і эсдэкаў. Ролю ружовых павінна была згуляць «Справядлівая Расія» (СР). Аднак апошняя працэсы ў партыі і вакол яе кажуць пра тое, што эсэры больш не запатрабаваныя. Усё з-за таго, што яны не здолелі выканаць сваёй галоўнай місіі — перахапіць на левым флангу ініцыятыву ў камуністаў. Расійскі пенсіянер як галасаваў, так і галасуе за Зюганава. Затое эсэры прыцягнулі на месцах усіх, хто з'яўляецца антыкамуністамі і пры гэтым антыпуцінцамі. Да прыкладу, касцяк партыі ў Піцеры — гэта былы актыў мясцовай секцыі партыі "Яблоко". Падобныя людзі стварылі СР вобраз трэцяй сілы, якая пачала інтэнсіўна адбіраць галасы ў "Адзінай Расіі". Апошнія мясцовыя выбары ў сакавіку сталі сапраўдным прарывам для эсэраў. І пасля такога поспеху нечакана з пасады старшыні сыходзіць Сяргей Міронаў. Міронаў як палітык — фігура проста на двойку, аднак ягоны статус спікера сенату, па сутнасці трэцяй асобы ў дзяржаве, вельмі спрыяў партыйнаму будаўніцтву СР на месцах. Замест Міронава прызначаюць нікому не вядомага Мікалая Левічава. У любым выпадку, ад нямецкай мадэлі адмаўляюцца. Будуецца нешта накшталт амерыканскай двухпартыйнай сістэмы.

***— Як павядзе сябе ліберальная апазіцыя ў выпадку, калі фаварытамі выбараў стануць Мядзведзеў і Пуцін?***

— Цяперашняя хваля расійскіх лібералаў, баюся, — гэта праект, які сваё адгуляў. Справа нават не ў тым, што гэтыя людзі не здольныя дамовіцца паміж сабою. Больш важна для абывацеля тое, што ўсё яны па розных прычынах былі ў свой час выкінутыя за борт правячай эліты. Касьянаў — былы прэм'ер, Нямцоў — былы віцэ-прэм'ер, Рыжкоў стаяў каля вытокаў «Адзінай Расіі». Калі яны крытыкуюць уладу за тую ж карупцыю, людзі іх не разумеюць.

***— Ці маюць апошнія падзеі ў арабскіх краінах уплыў на расійскую грамадскую дыскусію?***

— Амаль ніякага. Наадварот, навіны пра тое, што з-за тых жа арабскіх рэвалюцый кошт на нафту ідзе ўгору, выклікалі ў людзей шмат ілюзій наконт таго, што крызіс праходзіць, вяртаюцца тлустыя часы першай дэкады стагоддзя. Іх сімвалам, безумоўна, з'яўляецца Пуцін. Таму зараз перамога яму гарантаваная. Пасля, баюся, калі кошты на нафту і газ застануцца высокімі, нас чакае сапраўдная дэкада застою. У афіцыйных СМІ гэта эра, натуральна, будзе называцца «стабілізацыя».

РЭФЕРЭНДУМ

# ХТО АТРЫМАЕ ПАЛІТЫЧНАГА ОСКАРА?

Алег НОВІКАЎ

**Вяселле прынца Уільяма пасунула на другі план гістарычную падзею ў брытанскай палітычнай гісторыі. 5 мая брытанцы будуць прымаць рашэнне, па якіх правілах абіраць парламент.**




Падзея значная, сыходзячы хаця б з таго факту, што рэферэндум 5 мая — другі ў гісторыі краіны. Першы раз уся нацыя адправілася на ўсеагульнае галасаванне ў далёкім 1975-м, калі вырашалася пытанне, ці быць Вялікабрытаніі сябрам Еўрапейскай эканамічнай супольнасці.

У пяты дзень мая на суд публікі выносіцца лёс FPTP (first past the post). У перакладзе на зразумелую нам мову, гэта — мажарытарная сістэма, калі кожную акругу прадстаўляе ў парламенце адзін дэпутат. Яго абіраюць простай большасцю галасоў. Ёсць прапанова ўвесці ў FPTP элементы AV (alternative vote) — так у Вялікабрытаніі чамусьці называюць прапарцыйную сістэму, калі людзі галасуюць па партыйных спісах.

Ідэя рэферэндуму нарадзілася год таму ў час кааліцыйных перамоваў паміж ліберал-дэмакратамі і кансерватарамі. Першыя, якія ў агульным заліку набіраюць па краіне пад 20 працэнтаў, а прадстаўленыя ў парламенце былі толькі 10–12 асобамі, з'яўляюцца галоўнымі ахвярамі мажарытарнай сістэмы. І, адпаведна, даўно патрабуюць у гэтай сферы перамен, а менавіта — прапарцыйнай сістэмы.

Торы старая выбарчая сістэма быццам задавальняла, аднак на той час ім быў вельмі патрэбны партнёр, каб сфармаваць урад. Партыя Дэвіда Кэмерана пагадзілася з патрабаваннямі ліберал-дэмакратаў. Уже 25 мая, зачытваючы перад новым кабінетам тронную прамову, каралева Елізавета згадала пра будучы Парламенцкі Канстытуцыйны біль. Трэба нагадаць, што такога кшталту прамовы для каралевы піша асабіста прэм'ер.

Махавік пачаў круціцца. У ліпені на разгляд парламента было вынесена пытанне наконт правядзення рэферэндуму аб папраўках у выбарчы кодэкс. У выніку доўгіх дэбатаў вырашылі ад мажарытарнай сістэмы цалкам не адмаўляцца.

Выбаршчыкі, як і раней, будуць галасаваць па геаграфічнаму прынцыпу за аднаго кандыдата. Аднак пры гэтым яны могуць запоўніць так званы «Прэферэнцыйны ліст», якія складаецца з імёнаў кандыдатаў ад усіх партый. Калі ніводны з палітыкаў не атрымае 50 працэнтаў галасоў, у другі тур выходзяць тыя, імёны якіх часцей сустракаюцца ў гэтых лістах. Далей галасуюць зноў, пакуль нехта не набярэ патрэбных 50 працэнтаў. Пасля кожнага раунда, той, хто заняў апошняе месца, адсейваецца. Дарэчы, такі прынцып адсейвання вельмі папулярны на Захадзе. Напрыклад, так абіраюць лаўрэатаў прэміі Оскар.

7 верасня 2010 года большасцю (328 супраць 269) галасоў дэпутатаў закон пра рэферэндум і AV быў прыняты. Засталася фармальнасць — заручыцца падтрымкай большасці брытанцаў.

Апошні раз пра змену выбарчага кодэкса гаварылі ў 1990-я гады, калі дом на Даўнінг-Стрыт, 10 акупаваў Тоні Блэр. Была створана спецыяльная камісія па рэформе, а таксама праведзеныя тэсты. У якасці эксперыментальных трусоў абралі шатландцаў і валійцаў, якія абіраюць дэпутатаў у рэгіянальных парламенты па партыйных спісах. Такім жа чынам абіраецца Вялікі савет Лондану.

Праект ліберал-дэмакратаў больш маштабны. Ён тычыцца Маці ўсіх парламентаў, як пафасна называюць брытанскую ніжнюю палату.

Натуральна, у Ніка Клега (лідар лібералаў), ёсць багата праціўнікаў. І перш за ўсё сярод тых жа торы, якія, у абыход партыйнай дысцыпліны, выступаюць за тое, каб 5 мая сказаць «не». Само кіраўніцтва партыі апынулася ў шпагаце. Дэвід Кэмеран, які год таму рашуча быў за рэформу, зараз кажа, што ён паважае адначасова дзве пазіцыі — «за» і «супраць». Адпаведна апытанням, толькі 45 працэнтаў выбаршчыкаў 5 мая прагаласуюць за змены.

Партнёраў па кааліцыі гэты факт і трывожыць і адначасова радуе. Цяпер ліберал-дэмакратаў ужо не будуць так ідэнтыфікаваць з непапулярнымі эканамічнымі рэформамі, якія праводзіць Дэвід Кэмеран.

Іншыя партыі занялі наступныя пазіцыі. Лейбарысты заклікаюць галасаваць «за», не забыўшыся пры гэтым нагадаць, што менавіта яны ў 1990-я гады пачалі дыскусію наконт рэформы выбарчай сістэмы. «За» — таксама Зялёныя, шатландскія, валійскія і ірландскія нацыяналісты.

Галоўныя аргументы падтрымаць AV банальныя. Сістэма FPTP робіць выбары прадказальнымі, яна пахавала нізавыя ініцыятывы. Новыя правілыададуць міжпартыйнай канкурэнцыі, а значыць, больш ўдзел грамадства ў палітыцы.

Акрамя торы супраць рэформы і юніяністы Паўночнай Ірландыі. Супраць заклікаюць галасаваць правыя радыкалы з Брытанскай нацыянальнай партыі. Яны кажуць, што AV у варыянце торы і лібералаў — падман брытанскага народа. Прыкладна з такіх жа пазіцый выступае і Брытанская кампартыя. З той розніцай, што для яе AV — падман брытанскага пралетарыяту.

Рэтраграды прагназуюць пасля ўвядзення AV татальны паралюш выканаўчай улады з-за таго, што ўрад быццам будзе сфармаваны на базе некалькіх партый. Хаця гэта пакуль слаба адпавядае вынікам апытанняў. Большасць брытанцаў захоўваюць сімпатыі да старых вялікіх партый.

Але ўсё ж большасць брытанцаў выступае за змены выбарчай сістэмы. Калі лічбы не зменяцца, або зменяцца не так кардынальна, у 2015 годзе выбары ў парламент Вялікабрытаніі адбудуцца па новых правілах. Хаця, магчыма, і раней. У час кампаніі «за» ліберал-дэмакраты, каб падтрымаць імідж сацыяльнай партыі, вылілі на кансерватараў такую порцыю бруду, што ў выніку выклікалі спекуляцыі наконт магчымага хуткага краху кабінета і правядзення датэрміновых выбараў.

Спрэчкі выклікала і дата, на якую прызначылі галасаванне, — 5 мая. Частка кансерватараў і шатландскіх нацыяналістаў падпісала заяву з патрабаваннем змяніць дату рэферэндуму, паколькі на той жа дзень прызначаны мясцовыя выбары. Яны падазраюць, што тэма рэферэндуму, галоўнымі лабістамі якога з'яўляюцца лібералы, можа ўздзейнічаць на выбарах у муніцыпалітэты. Аднак з улікам таго, што рэферэндум — справа нятанная, Нік Клег лёгка пераканаў, што лепш правесці ўсё ў адзін дзень.

**Апошні раз пра змену выбарчага кодэкса гаварылі ў 1990-я гады, калі дом на Даўнінг-Стрыт, 10 акупаваў Тоні Блэр. Была створана спецыяльная камісія па рэформе, а таксама праведзеныя тэсты**

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ЦІЛА САРАЦЫН



Былы міністр берлінскага ўраду, як зрабіў сабе імя за кошт крытыкі эмігрантаў, стаў героем сярод правых радыкалаў. Апошнія прапануюць яму стварыць асабістую партыю, якая, па ацэнках палітолагаў, сапраўды можа пасправабаваць прарвацца ў парламент. Аднак сам Ціла ўпарта застаецца адданым роднай нямецкай партыі сацыял-дэмакратаў (SPD). І партыйнае кіраўніцтва не супраць. 21 красавіка яно пастанавіла не выключаць Сарацына за яго расісцкія забабоны. Навіна выклікала выбух пратэстаў сярод шараговых сяброў SPD. Яны баяцца, што Ціла надае партыі расісцкі імідж, што абавязкова адгукнецца сацыял-дэмакратам на бліжэйшых выбарах. Лідары эсдэкаў у сваё апраўданне кажуць, што Ціла апошнім часам ужо не так радыкальна гаворыць пра пагрозу эміграцыі. Шмат хто сцвярджае, што SPD наўмысна пакінула Сарацына ў сваіх шэрагах. Антыэмігранцкія погляды дастаткова папулярныя ў ФРГ і могуць дапамагчы партыі сабраць добры ўраджай галасоў. Пытанне, аднак, у тым, што бліжэйшыя выбары адбудуцца ў верасні ў прыхільных левым па поглядах і мультыкультурным Берліне. Тое, што Сарацын застаўся сябрам SPD, можа, наадварот, спрыяць правалу ружовых. Берлінскія эсдэкі нават гатовыя выйсці з SPD і заснаваць новы партыйны праект.

### ОЛЕСЬ ДОВГІЙ



Спадар Довгій стаў жывым прыкладам таго, што шлюб па разліку не з'яўляецца панацэяй. Каб зразумець гэту ісціну, трэба вярнуцца на 5 гадоў назад, калі 26-гадовы юрыст Олесь заняў пасаду сакратара Кіеўскай гарадской рады, куды ён трапіў як дэпутат ад Блоку Чарнавецкага. Хутка, нягледзячы на свой малады ўзрост, ён стаў другім чалавекам у горадзе. З яго ўдзелам, як піша прэса, адбыўся самы вялікі дзерыбан у гісторыі Кіева. Муніцыпалітэт перадаваў у прыватную ўласнасць нерухомасць і зямлю кампаніям, блізкім да клану Чарнавецкага. Аднак кожная добрая казка мае фінал. Пасля абрання Януковіча на пасаду прэзідэнта Партыя Рэгіёнаў вырашыла адабраць у Чарнавецкага сталіцу. Яго самога прымусілі перадаць паўнамоцтвы чыноўніку ад Партыі Рэгіёнаў. Супраць шэрагу сяброў «маладой каманды» — так называў сваё атачэнне Чарнавецкі — распачалі справы за карупцыю. Каб перастрахавацца, Олесь пайшоў на крайні крок. Калі верыць плёткам, ён у аварыйным рэжыме вырашыў знайсці сабе жонку з лагеру Партыі Рэгіёнаў. Сапраўды, другая палова была аператыўна знойдзеная (ёй аказалася дачка дэпутата ад партыі Януковіча). Аднак гэта не ўратавала Олеся. На мінулым тыдні яго пазбавілі пасады сакратара гарсавету. На гэтым справа можа не закончыцца. Для падтрымкі рэйтынгу Януковіч апошнім часам актыўна саджае самых вядомых карупцыянераў.

### МАРЫНА ЛЕ ПЭН



Лідар французскай правай радыкальнай партыі Нацыянальны Фронт літаральна за месяц пасля абрання на пасаду старшыні стала трэцім палітыкам у Францыі. Цяпер яна зрабіла наступны прарыў. Адпаведна вынікам апытання саліднага выдання «Journal du Dimanche», яна абышла па папулярнасці цяперашняга прэзідэнта Нікаля Сарказі. Калі прызначаныя на наступны год выбары прэзідэнта адбываліся б сёння, у другім туры змагаліся б Марына і прадстаўнік партыі сацыялістаў. Марына мела б 35 працэнтаў, а яе праціўнік — 36. Такія расклады, на думку экспертаў, могуць значыць старт новай урадавай кампаніі супраць эмігрантаў, якая мае за мэту раскалоць электарат Марыны. Пралогам кампаніі ўжо сталі дэбаты наконт таго, каб зачыніць мяжу з Італіяй, адкуль едуць эмігранты з Афрыкі, і ідэя скараціць квоту легальных эмігрантаў. Між тым, эксперты маюць сумнеў, што гэта вельмі дапаможа Сарказі. Марына Ле Пэн займае тую нішу, якую Сарказі меў, калі быў у свой час кандыдатам у прэзідэнты. Усе разглядалі яго як асобу, якая надасць імпэту французскай палітычнай сістэме. Пакуль у Сарказі нічога не атрымліваецца. Замест абнаўлення — адны карупцыйныя аферы. І Марына мае добры шанс скарыстацца памылкамі прэзідэнта.

ЛЁСЫ

# ГЕНЫ ВАСІЛЯ ШАРАНГОВІЧА

Аляксандр ТАМКОВІЧ

**Калі Васіля Шаранговіча ў 1953 годзе прымалі ў камсамол, у яго спыталіся: «У каго верыш, у Леніна альбо Бога?» Вася адказаў — у Леніна і Бога. У тыя часы такі адказ мог каштаваць вельмі дорага, а прыгадаў я яго для таго, каб нагадаць, што ў нашым жыцці не бывае толькі чорна-белых колераў. Летась Васіль Шарагновіч прэзентаваў мне кнігу ўспамінаў «Ген жыцця». А ў гэтым годзе я запісаў яго канцэнтраваны аповед пра галоўныя складнікі, што вызначылі яго лёс, які зараз і прапаную чытачам.**







## Ген мастацтва

Мяне хрысцілі 14 студзеня 1939 года. Бацькі, асабліва мама, хацелі назваць Генадзем. Царква ж знаходзілася ў вёсцы Мікасецк, што ў шасці кіламетрах ад родных Качаноў. Кумы, дзядзька Пётр і цётка Ганна, па дарозе забыліся гэта незвычайнае для нашых мясцін імя. Што рабіць? Не вяртацца ж назад у такую сцюжу, а айцец Пятро Пароменскі параіў даць мне імя Васіль, бо 14 студзеня па царкоўнаму календару лічыцца днём святога Васіля Вялікага. Так і стаў Васілём, хаця ў народзе кажуць, што прозвішча даюць родныя, а імя трэба рабіць самому.

У школе вучыўся выдатна, з незвычайнай лёгкасцю. Напрыклад, я ніколі дома не вучыў на памяць вершы. Да школы было паўтара кіламетра, і пакуль ішоў, то, напрыклад, прачытаў па дарозе тое ж «Беразіно» і на ўроку мог расказаць яго на памяць. Ведаў амаль усю «Новую зямлю» Якуба Коласа, чытаў яе са школьнай сцэны, а таксама аднавяскоўцам.

Маляваць пачаў недзе з пятага класа, і першым настаўнікам была мама. Яна сама малявала ў вольны час, закончыла шэсць класаў польскай школы і ў юнацтве марыла стаць мастаком. Таму зусім натуральна, што яна ўсяляк падштурхоўвала маю схільнасць да малявання і паказвала мне, як намаляваць птушку, кветку альбо дрэўца ці пянёк. Бацька быў слынным кавалём, а таксама сталяром і слесарам, аб чым меў дыплом, атрыманы ў Вільні. Ён і мяне прывучаў да рамесніцкай працы, што ў далейшым жыцці вельмі спатрэбілася.

Думаю, генетычная аснова — амаль галоўны складальнік чалавечага лёсу. Гэта я адчуў на сабе, бо многае мне перадалося ад бацькоў, а можа і ад дзядоў.

Закончыўшы сем класаў з пахвальным лістом, захацелася прадоўжыць вучобу. А для гэтага трэба было ехаць у наш раённы цэнтр Мядзел, да якога трынаццаць кіламетраў. Бацькам клопат: трэба здымаць кватэру, даваць хоць нейкі харч. Сяляне ж пасля вайны жылі вельмі бедна, і таму з далёкіх вёсак рэдка якія дзеці вучыліся ў раённай сярэдняй школе.

Бацька дамовіўся з мядзельскай гаспадыняй, што я буду год у яе кватараваць за пабудаваную ёй веранду, а далей знаходзіў новыя магчымасці сваёй працай аплачваць выдаткі за кватараванне, бо грошай аніякіх у сям'і не было. Я і сёння ўдзячны бацькам, што, нягледзячы на цяжкія ўмовы, яны ўсімі сіламі падтрымлівалі маё імкненне да вучобы.

А тым часам цяга да малявання пачала памалу знікаць, і я стаў больш думаць аб матэматыцы, якую таксама любіў і якая мне лёгка давалася. Але ў сярэдзіне навучальнага года ў наш клас зайшоў нейкі высокі смуглявы настаўнік і сказаў: «Арганізоўваю гурток малявання, жадаючыя могуць прыходзіць». Гэта быў Генадзь Ігнатавіч Астроўскі, як я потым даведаўся — настаўнік матэматыкі, які адыграў лёсавызначальную ролю ў маім жыцці.

На першыя заняткі гуртка прыйшло чалавек дваццаць, на другія — я і Міша Чарняўскі (у далейшым знакаміты гісторык-археолаг), на трэція — толькі я адзін. З Астроўскім паўгода мы пастаянна малявалі, сустракаліся пасля заняткаў амаль кожны дзень, і ён, убачыўшы мае поспехі, параіў паспрабаваць паступіць у Мінскую мастацкую вучэльню.

Крыху пра Генадзя Астроўскага. Гэта была асоба неардынарная, з тонкім пачуццём гумару, энергічны і добразычлівы чалавек. Акрамя захаплення мастацтвам, ён прыгожа граў на баяне, добра ведаў нотную грамату. У школе ўсе здзіўляліся, што ён са мной, вучнем 8-га класа, вітаецца за руку.

## Ген настойлівасці

Закончыўшы восем класаў, я рашыўся падаць дакументы для паступлення ў Мінскую мастацкую вучэльню. Натуральна, ні капейкі ў бацькоў не было, але Астроўскі ўзяў усе выдаткі на сябе, і мы паехалі ў сталіцу. Такі вялікі горад я ўбачыў упершыню. Здалі дакументы і пайшлі ў мастацкую галерэю (Мастацкага музея тады не было), якая мясцілася ў доме на плошчы Свабоды, дзе зараз знаходзяцца розныя прафсаюзы. Наведалі салон-магазін, дзе Астроўскі накупіў розных фарбаў і пэндзляў, дайшлі да аўтавакзала і паехалі дадому.

Потым, зноў жа з дапамогай майго настаўніка, я прыехаў у Мінск здаваць уступныя экзамены. Спачатку маляваў так, як умеў, але заўважыў, што паступаючыя малююць штрыхамі, і наступны малюнак паспрабаваў зрабіць гэтаксама, але, натуральна, нічога слушнага не атрымалася, бо за яго я атрымаў «тройку», і зразумела, што паступленне не ўдалося.

Але гэта няўдача ніколькі не засмуціла, і ўвесь наступны навучальны год я працаваў упарта. Зноў падаўшы дакументы ў вучэльню, выдатна вытрымаў уступныя экзамены. Паколькі я быў выдатнікам у школе, то астатнія экзамены здаваць не трэба было, і дырэктар мастацкага вучылішча сказаў, каб я пакаваў чамадан.

А ў каго ў вёсцы мог быць чамадан? Бацька змайстраваў з тоненькіх дошак нешта падобнае на чамадан, з якім я і прыехаў у Мінск. Апрануты быў, думаю, вельмі экзатычна: зялёны фрэнч, сінія галіфэ (бацькі танна купілі ў вайскоўца), вышытая маці кашуля, зробленыя бацькам боты. Гэта быў 1955 год. Бацькі далі 100 рублёў (пасля рэформы 1961 года гэта ўсяго 10 — заўвага аўтара). У чамадане быў кавалак сала, некалькі яек. Інтэрната ў мастацкай вучэльні не было, і неабходна было шукаць кватэру ці хоць бы вугал для жыцця.

Перад ад'ездам бацька сказаў мне: «Вася, ты накіроўваешся ў вялікую дарогу, дык жыві з людзьмі і сярод людзей». Яго словы я запомніў на ўсё жыццё і прытрымліваўся гэтага наказу. А яшчэ ён дадаў, што калі нічога не атрымаецца, то каб вяртаўся дадому працаваць разам у кузні.

Два дні я «поўзаў» па Мінску з цяжкім чамаданам (не фанера, а дошкі ўсё ж такі) у пошуках кватэры. Спаў на вакзале ці на якой-небудзь лаўцы. Так нічога не знайшоўшы, думаў ужо ад'язджаць дадому. І тут пашанцавала. Каля нашай вучэльні, што месцілася тады ў будынку Опернага тэатра, я сустрэў двух хлопцаў, з якімі разам паступаў. Яны якраз знайшлі кватэру і шукалі «трэцяга», якім я і апынуўся.

Калі пачаў вучыцца, то высветлілася, што на 1-ы курс набраны дзве групы: адна з тых, хто закончыў сем класаў, другая — з сярэдняй адукацыяй. Прыйшлося разам з віцебскім хлопцам Васем Ціханенкам ісці ў вячэрнюю школу, каб атрымаць агульную сярэднюю адукацыю.

Днём вучыўся маляваць, а вечарам ішоў у дзявятую вячэрнюю школу, што месцілася на Юбілейнай плошчы. Наступілі сапраўдныя галодныя гады, і я часам на вуліцы страчваў прытомнасць ад малакроўя. Бывала, падаў проста на асфальт.

Настаўнікі вячэрняй школы, як і ў Мядзельскай, зноў раілі мне кідаць маляванне і заняцца сур'ёзна матэматыкай. Я гэтага не зрабіў, але неяк непрыкметна захапіўся шахматамі. А праз нейкі час, ужо будучы студэнтам другога курса, пачаў займацца ў гуртку пад кіраўніцтвам міжнароднага майстра Шагаловіча.

Аднойчы я сыграў з ім унічыю, што з'явілася сенсацыяй. Майстар Шагаловіч пачаў мяне ўгаворваць кідаць мастацкае вучылішча і сур'ёзна заняцца шахматамі, бачачы ў маёй асобе будучага гросмайстра.

Тым часам стаў заўважаць, што цяга да шахмат мацнела, і ў вучылішча я браў эцюднік і шахматную дошку. І што дзіўна — гледзячы на «натуру», мне мроіліся клетачкі, на якіх бегаюць шахматныя фігуркі.

Я зразумеў, што трэба займацца нечым адным, і праз некалькі дзён, ранenька прыйшоўшы да навучальных майстэрань, што непадалёку ад круглай плошчы, спусціўся да Свіслачы і з мосту кінуў у ваду шахматы, развітаўшыся з імі назаўсёды.

## Ген выпадковасці

Мастацкае вучылішча скончыў у 1960 годзе. Як выдатніку, мне павінны былі выдаць чырвоны дыплом, але нешта пераблыталі і выпісалі сіні. Па маёй як бы «віне» ўсе выпускнікі павінны былі чакаць два дні да атрымання дыплому.

У той час выдатнікі мастацкага вучылішча мелі права паступаць у інстытут па свайму жаданню, лепшыя ж павінны былі атрымаць накіраванне Міністэрства адукацыі. Я рашыў не паступаць у інстытут, а паехаць працаваць у Брэст па размеркаванню. Справа ў тым, што акрамя мяне ў сям'і было яшчэ трое (два браты і сястра) малодшых дзяцей, якія таксама хацелі вучыцца і якім трэба было дапамагаць.

Але тут здарылася нечаканае. Выклікаюць у ваенкамат, каб прызваць у армію, і падстрыгаюць «пад нуль». Я і забыўся, што падчас вучобы была адтэрміноўка. Мне аднакурснікі параілі паступаць у інстытут, бо там ёсць ваенная кафедра.

Паехаў дадому ў свае Качаны, каб параіцца з бацькамі. З мястэчка Мядзел прыйшоў дахаты толькі ноччу, пагрукаў у акно і напалохаў маці, якая ўбачыла на дворы нейкага лысага юнака. Бацькі мне сказалі, што лепш вучыцца ў інстытуце, чым тры гады «аддаваць доўг радзіме» невядома за што.

Словам, падаў заяву ў Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут за гадзіну да заканчэння прыёму дакументаў. Да гэтага да мяне падышоў аднакурснік па вучылішчы Пеця Свентахоўскі і запытаў, на якое аддзяленне я збіраюся паступаць. Пачуўшы, што на жывапіснае, ён стаў упрошваць падаць заяву на графіку, бо ўсе, хто меў права паступаць у інстытут, падалі заявы на жывапіс, і ніхто — на графіку. А паступіўшы на графіку, я потым змагу перавесціся на жывапіс, але затое не буду пры паступленні замінаць іншым.

Пагадзіўшыся з такім довадам, перапісаў заяву і паступіў на графічнае аддзяленне. Мне так спадабалася графіка, што я ў далейшым ніколі нават не падумаў, каб перавесціся на жывапіснае аддзяленне. Вось так выпадкова вырашыўся накірунак маёй далейшай творчай дзейнасці.

Ды і з будучай жонкай я таксама, можна лічыць, сустрэўся выпадкова, хоць тая сустрэча стала «выключэннем на ўсё жыццё». Адбылося гэта 8 мая 1960 года. Мой сябра, будучы пісьменнік, Адольф Варановіч (на жаль, ужо нябожчык) ніяк не мог пазнаёміцца з якой-небудзь дзяўчынай, тым больш саромеўся свайго імя (вядома ж, водгук вайны). Ён папрасіў мяне пайсці з ім на танцы ў парк Горкага, бо тады існавала такая мода, што дзяўчаты і хлопцы прыходзілі на танцы «парамі». Мне не хацелася ісці, але трэба ж было дапамагчы сябру. І вось на гэтых танцах я пазнаёміўся з Галяй, якая, як высветлілася пазней, студэнткай філфаку БДУ. У далейшым мы сталі сустракацца, а ў 1962 годзе ажаніліся і ўжо 48 гадоў ідзём па жыцці поруч. Жонка жыла ў Віцебску, а я тут, у Мінску, да заканчэння інстытута. А гэта чатыры гады.

Закончыўшы тэатральна-мастацкі інстытут, абараніў дыпломную работу «Ілюстрацыі да паэм Янкі Купалы» на «выдатна». А перад абаронай было абавязковае размеркаванне. Мне хацелася ехаць у Віцебск на выкладчыцкую працу ў педінстытут: там жыла мая жонка, цесць быў значным партыйным начальнікам, і ён, напэўна, дапамог бы атрымаць нейкую кватэру. Гэта пытанне вельмі турбавала, бо я з 13 гадоў туляўся па розных чужых кватэрах і інтэрнатах. У Мінску ж не бачыў ніякіх шанцаў хоць на нейкае сваё жытло.

Аднак старшыня камітэта па друку Р. Канавалаў прапанаваў мне застацца ў сталіцы мастацкім рэдактарам у выдавецтве «Беларусь», паабяцаўшы за год даць кватэру. І я застаўся ў Мінску.

Праз год мяне запрасілі ў свой жа родны тэатральна-мастацкі інстытут на выкладчыцкую працу, і я звярнуўся да таго ж Канавалава, каб ён адпусціў мяне з работы, бо я працаваў па накіраванню.

Хутка мяне абралі старэйшым выкладчыкам, а ў 1972 годзе — загадчыкам кафедры графікі. І гэта ў 33 гада, ды, як кажуць, пры жывым прафесары П. Любамудраве. Такога ў інстытуце яшчэ не было.

Кафедру давялося арганізоўваць практычна з нуля, паколькі ў свой час яна была закрытая, а цяпер адноўлена. Творчую работу не запусціў, а можна сказаць стаў працаваць з яшчэ большым імпэтам. На чарговым з'ездзе Саюза мастакоў мяне выбралі старшынёй рэвізійнай камісіі, а праз пяць гадоў — сакратаром Саюза мастакоў і старшынёй камісіі па рабоце з моладдзю, хаця сам я быў яшчэ зусім малады. Гэта грамадская дзейнасць накладвала на мяне яшчэ большую адказнасць. Працаваць давялося вельмі многа, так што сям'і і асабліва маленькай дачцэ мала ўдзяляў увагі. Сыходзіў з дому, калі яна яшчэ спала, і вяртаўся, калі ўжо засынала.

Дзеля праўды трэба сказаць, што мае высілкі на творчым і педагагічным шляху былі належным чынам адзначаны. У 1975 годзе мне прысвоілі званне дацэнта, у 1978 — званне заслужанага дзеяча мастацтваў, а ў 1981 годзе я стаў прафесарам, зноў жа самым маладым у гісторыі нашага інстытута.

### Ген непакорнасці

Тым часам у тэатральна-мастацкім інстытуце разгортваліся свае падзеі. У 1984 годзе вымушана была пайсці з пасады рэктара Э.П. Герасімовіч, а на яе месца нечакана быў пастаўлены загадчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва А. В. Сабалеўскі.

Справы ў інстытуце пагоршыліся, калектыў стаў развальвацца проста на вачах, і гэта не засталося незаўважаным у «вярхах». Небезвядомы І. І. Антановіч, загадчык аддзела культуры ЦК КПБ, бачачы памылку ў прызначэнні, прапанаваў мне стаць першым прарэктарам (прарэктарам па навучальнай рабоце). Я, напэўна, з паўгода думаў. Угаворвалі як калегі, так і Антановіч. Усё ж такі згадзіўся, і на пачатку 1986 года быў прызначаны прарэктарам. І вось цяпер увесь груз выпраўлення становішча ў інстытуце зваліўся на мяне. Творчая работа адышла на другі план і, як потым высветлілася, вельмі надоўга.




У 1989 годзе рэктар А. Сабалеўскі быў звольнены з пасады, а в. а. рэктара інстытута міністр культуры прызначыў мяне. У гэты самы час уступіла ў дзеянне новае дэмакратычнае правіла — рэктары ВНУ не прызначаюцца, а выбіраюцца калектывам, уключаючы студэнтаў, а дакладней, прадстаўнікамі прафесарска-выкладчыцкага складу і студэнтаў. Яны ж, у сваю чаргу, выбіраюць усімі падраздзяленнямі ВНУ. У першым туры выбараў тайным галасаваннем з сямі прэтэндэнтаў больш 50% галасоў набраў адзін я і ў другім туры быў выбраны аднагалосна.

Трэба сказаць, што я стаў першым і апошнім рэктарам, якога выбраў калектыў, бо потым гэта правіла было адменена. Думаю, што выбары кіраўнікоў калектываў адыгрывалі станоўчую ролю. Бо ў такім разе кіраўнік адчувае абвостраную адказнасць перад даверам калектыву, а не перад рознага рангу чыноўнікамі. Усё гэта я адчуў на сабе.

Падчас свайго рэктарства, а 90-я гады былі вельмі складанымі як у эканамічным, так і ў палітычным плане, мне ўдалося правесці шэраг рэформаў. Першае — гэта ў 1991 годзе рэарганізаваць тэатральна-мастацкі інстытут у Беларускую акадэмію мастацтваў. Першапачатковая назва аніяк не адпавядала сутнасці інстытута — была адкрыта падрыхтоўка спецыялістаў кіна- і тэлемастацтва, ужо існаваў факультэт дызайну.

За заслугі перад мастацтвам і мастацкай адукацыяй у 1991 годзе мне было прысвоена ганаровае званне «Народны мастак Беларусі».

Паступова акадэмія мастацтваў пераходзіла на беларускую мову навучання. Усё справаводства было пераведзена на беларускую мову адразу з маім прыходам на пасаду рэктара. У навучальныя планы былі ўведзены беларуская мова і літаратура, беларуская гісторыя. Увесь калектыў акадэміі не прымусова, а натуральна стаў карыстацца беларускай мовай.

У 1995 годзе акадэмія шырока адзначыла 50-годдзе з дня заснавання, яе грамадскі аўтарытэт стаў вельмі высокім.

Цягам часу я адчуў пільную ўвагу да акадэміі і асабліва да сваёй персоны з боку ўладных структур. Залішняя дэмакратычнасць, панаванне беларускай мовы, удзел выкладчыкаў і студэнтаў у грамадскіх акцыях — усё гэта не магло задаволіць вышэйшыя эшалоны ўлады.

І вось у 1997 годзе пад канец прыёмных экзаменаў у акадэмію мастацтваў заявілася камісія ў складзе начальніка ўпраўлення паліўна-энергетычных рэсурсаў Дзяржкантролю нейкага Ложачніна і яго паплечніка. Ужо ў размове са мной яны выказалі абсурдныя абвінавачванні. Вядома ж, гэтыя людзі былі далёкія ад мастацтва, як неба ад зямлі. Пад вечар таго ж дня яны зніклі, экзамены праз некалькі дзён закончыліся, і я пачаў забываць непрыемную сустрэчу.

А праз нейкі час, прыйшоўшы раней на работу, я яшчэ да 9-ці раніцы пазваніў першаму намесніку міністра культуры Ул. П. Рылатку, а той у мяне пытаецца: «Вы што, на працы? А газету «Советская Белоруссия» не чыталі? Тады пачытайце». Адчуўшы нешта нядобрае, выйшаў на вуліцу, купіў вышэйназваную газету і там прачытаў, што я зняты з працы за «міфічныя» парушэнні пры правядзенні ўступных экзаменаў. Так, «добра» папрацаваў тагачасны віцэ-прэм'ер небезвядомы палкоўнік Замяталін!

У гэтым годзе спаўнялася 30 гадоў маёй педагагічнай і 35 гадоў творчай дзейнасці. Вось дык падарунак!

Неўзабаве мяне запрасіў міністр культуры А. У. Сасноўскі і прапанаваў стаць дырэктарам Нацыянальнага мастацкага музея, але я адмовіўся. Тады міністр прапанаваў узначаліць музей сучаснага выяўленчага мастацтва, якога не існавала, а была толькі пастанова Савета Міністраў аб яго стварэнні. Усё трэба было пачынаць з чыстага ліста, і я згадзіўся.

Стварыў новы ў Беларусі музей, ён стаў папулярным не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі. За час працы ў музеі выканаў шэраг творчых работ, бо вольнага часу было больш, чым у Акадэміі.

А тут незаўважна наблізілася сямідзесяцігоддзе. Напісаўшы аўтабіяграфічную аповесць «Ген жыцця», выдаўшы альбом аб сваёй творчасці, арганізаваўшы ў сваім жа музеі юбілейную выставу, я падаў заяву аб звальненні з пасады дырэктара і нарэшце стаў вольным мастаком, аб чым марыў са студэнцкіх гадоў.

ПРЭЗЕНТАЦЫЯ

# СЁСТРЫ ПСІХЕІ

Аляксей ХАДЫКА

**22 красавіка ў «Кнігарні ЛогвінаЎ» вядомы даследчык беларускай літаратуры часоў Рэнесансу і барока, доктар філалогіі, а таксама не менш слынны драматург Сяргей Кавалёў прэзентаваў надрукаваны выдавецтвам Ігара Логвінава чарговы зборнік сваіх п'ес — «Сёстры Псіхеі».**




Падзея мела выключны характар, бо Кавалёў зараз стала выкладае ва ўніверсітэце Марыі Складоўскай-Кюры ў Любліне і ў Мінск завітаў толькі на тыдзень. Да таго ж, адначасова было прадстаўлена мініяцюрнае падарункавае выданне лірычных вершаў Францішкі Уршулі Радзівіл «Нясвіжскі альбом», падрыхтаванае «Беларускім кнігазборам». І ў той жа самы дзень тэатр Янкі Купалы даваў прэм'ерную пастаноўку Мікалая Пінігіна «Тэатр Уршулі Радзівіл», спектакля з трох п'ес Уршулі — балета «Дасціпнае каханне», оперы «Выкраданне Еўропы» і камедыі «Распуснікі ў пастцы», сцэнічную адаптацыю якіх у адну мастацкую дзею таксама выканаў Сяргей Кавалёў.

«Сёстры Псіхеі» — чацвёрты зборнік драматургічных прац Кавалёва, названы паводле п'есы, якая сёння паспяхова ідзе на падмостках Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі, — быў прадстаўлены аўтарам досыць парадаксальна. «Я больш не збіраюся пісаць гістарычныя драмы», — заявіў ён, здзіўляючы публіку, якая ведае пра поспех пастановак яго п'ес як у Беларусі, так і за мяжой.

Фактычна Кавалёў абвясціў пра заканчэнне свайго «тэатральнага праекту», што складаўся з двух накірункаў. Гэта, па першае, п'есы, дзе аўтар «звяртаўся да міфа, у дагістарычную свядомасць», па другое — тэксты, дзе ён «спрабаваў наладзіць дыялог з сучаснасцю, з рэчаіснасцю пасля гісторыі». Кавалёў распачаў праект напрыканцы 1990-х, пабачыўшы, як звужаецца разуменне нацыянальнай драматургіі, абмяжоўваючыся «выключна жанрам гістарычнай драмы, а дакладней, яго прафанацыяй — бясконцым любоўным серыялам у гістарычных касцюмах і з патрыятычнымі лозунгамі». Што і ператварала гістарычную драму ў мастацкі штамп.

З разважаннямі аўтара пра тое, як ён імкнуўся разарваць зачараванае кола, утворанае ўмовамі жыцця ў варунках моўнай рэзервацыі, можна пазнаёміцца ва ўводзінах да зборніка. У яго ўвайшлі дзве п'есы з «міфалагічнага» накірунку («Сёстры Псіхеі», «Пан Твардоўскі»), і дзве — з сучаснага («Інтымны дзённік», дзе вядзецца пра Максіма Багдановіча, і «Вяртанне Галадара»). Усе яны прадстаўлены на беларускай сцэне, прычым тры з іх, за выняткам «Пана Твардоўскага», можна ўбачыць у РТБД у Мінску.

Цікавая гутарка разгарнулася ў сувязі з прэм'ерай «Тэатра Уршулі Радзівіл», пастаноўкай, якую Сяргей Кавалёў параўнаў з «рэканструкцыяй святочнага вечара ў Нясвіжскім замку». У спектаклі задзейнічанае цэлае суквецце купалаўскіх актораў — заслужаныя артысты Рэспублікі Беларусь Віктар Манаеў, Георгій Маляўскі, Аляксандр Падабед, Сяргей Журавель і іншыя.



Але справа не толькі ў гэтым. Роля Францішкі Уршулі як драматурга і паэткі апошнім часам сур'ёзна пераглядаецца ў бок значна вышэйшай ацэнкі яе творчага патэнцыялу і ўкладу ў гісторыю культуры Рэчы Паспалітай — сведчаннем чаго манаграфія польскай аўтаркі Барбары Юдковяк, прысвечаная Уршулі Радзівіл — паэтцы (1992). Цяпер, з пастаноўкай яе п'ес, кожны зацікаўлены глядач можа паспрабаваць адказаць на пытанне пра стаўленне да спадчыны «музы Нясвіжа», асабіста пазнаёміўшыся з яе сцэнічным увасабленнем. Наступныя спектаклі — 19, 20 і 29 мая на сцэне Палаца афіцэраў.

Паколькі тэматыка часткі п'ес і пастановак Сяргея Кавалёва звязана з Радзівіламі і Нясвіжам, я пацікавіўся ў даследчыка і драматурга, ці не мае ён намеру прыкласці свае веды ў рэалізацыі тэатральных праектаў у Нясвіжы. Адказ быў станоўчым: паколькі зараз у Нясвіжы хуткімі тэмпамі ідзе абсталяванне замкавай тэатральнай залы, а таксама плануецца прыстасаванне пад тэатралізаваныя дзеі замкавага дзядзінца і балкона, якія выходзяць на валы, досвед Кавалёва, відавочна, будзе запатрабаваны.

Свежую кнігу п'ес Кавалёва «Сёстры Псіхеі» раю шукаць у «Кнігарні ЛогвінаЎ» (пр. Незалежнасці, 37а).

ПАДЗЕЯ

# НЕ, ТАНЦЫ!

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**26 красавіка ў рамках закрыцця мінскага «Таго самага фестывалю» эксперыментальных тэатраў сталічнай публіцы былі паказаныя «Не танцы» — пластычна-танцавальная прыпавесць пра беларускі валютны крызіс.**

Чаму пра крызіс? Таму што пастаноўка маладога рэжысёра Яўгена Карняга не мае сюжэту. Яна мае генеральную лінію — настрой, на які глядач накладае тыя сэнсы, што яго хвалююць. А паколькі аўтарку гэтых радкоў у дадзены момант надзвычай хвалюе эканамічнае становішча асабістае і дзяржавы, у антытанцах васьмі актораў, апранутых у чорнае, яна была схільная пабачыць менавіта такія сэнсы. Але, здавалася, перад кожным у вялікім зале ДК Прафсаюзаў, пад завязку запоўненай як радавой публікай, так і ўдзельнікамі тэатральнага фестывалю, разыгрываўся яго асабісты спектакль.

«Не танцы» з'явіліся ў 2007 годзе як дыпломны праект выпускнікоў Беларускай акадэміі мастацтваў. Зазвычай дыпломныя спектаклі занепадаюць. А вось «Не танцы» выжылі — і трапілі на вялікія падмосткі, у фестывальныя праграмы, на гастролі. У гэтым, трэба думаць, заслуга новага пакалення беларускіх тэатралаў: і прафесіяналаў, якія не цураюцца слова «маркетынг», і гледачоў, якія жыва адгукаюцца на мастацтва, якое сапраўды іх чапляе. У часы, калі «Не танцы» ставіліся на сцэне Акадэміі мастацтва, некаторыя фанаты наведалі спектакль каля дзесяці разоў запар!

Пад старыя песенькі нямецкага ды французскага кабарэ на сцэне адбываецца гвалт. Гвалт мужчыны ў дачыненні да жанчыны, настаўніка — да вучня, салдата — да вязня канцлагеру. На сцэне — няспыннае напружанне, сутыкненне эмоцый, рухаў, энергетыкі... Усё гэта літаральна прыкоўвае да дзеяння на паўтары гадзіны. Як і належыць сур'ёзнай, непапсовай сцэнічнай працы, «Не танцы» дзейнічаюць адначасова на розум і пачуцці.

Для гледачоў, якім выпадала трапляць на спектаклі маленькіх тэатрыкаў па ўсёй Еўропе, нічога прынцыпова новага не адбываецца. «Не танцы» — дабротны еўрапейскі мэйнстрым. З уласцівым яму мінімалізмам, непрамалінейнасцю, сімвалічнасцю. Такімі сімваламі ў спектаклі выступаюць знятыя жаночыя туфлі (чытай Фрэйда), рыдлёўка, зачыненыя дзверы, у якія б'ецца чалавек, зламаныя гваздзікі... Тэатр гвалту ва ўсёй яго красе. Трупа «Карняг-тэатра» ўзнімае тыя ж вечныя праблемы грамадства, што і «Свабодны тэатр» Мікалая Халезіна — але без уласцівага апошняму палітыканства. Больш далікатна, метафарычна і, што важна, — абсалютна легальна. І тое, як прагна ўспрымаецца гэтая пастаноўка аматарамі тэатру па ўсёй Беларусі, сведчыць: тое, што ў Еўропе — звычайная справа, у нас па-ранейшаму — промень святла ў цёмным царстве.

«Не спрабуйце звязаць у адно цэлае тое, што вы зараз пабачыце. У вас усё адно нічога не атрымаецца», — шчыра папярэджваюць акторы публіку перад пачаткам спектаклю. Але ўсё ж такі існуе нешта, што аб'ядноўвае шэраг танцавальных сцэнаў у адно палатно. І гэтае нешта — густ рэжысёра. «Не танцы» — сур'ёзны выклік старому беларускаму тэатру, якому бракуе найперш густу.

Расійскі крытык Марк Ліпавецкі высоўвае асцярожнае меркаванне, маўляў росквіт драматургіі ў літаратуры прыпадае на часы, калі пасля бурных узрушэнняў у грамадстве наступае застой, заняпад, дэпрэсія... Гэта, здаецца, працуе і для беларускага тэатру.

Беларускі тэатр доўгі час знаходзіўся ў стагнацыі, будучы, па-за рэдкімі выняткамі накшталт пастановак Мікалая Пінігіна ці легендарнага «Альтэрнатыўнага тэатра», перажыткам савецкай эпохі. З гэтай стагнацыі тэатр пачаў выходзіць хіба некалькі гадоў таму — са з'яўленнем маладых труп, незашораных рэжысёраў, свежых павеваў з Захаду (Еўропа) і Усходу (Расія). Самае цікавае ў айчынным тэатральным мастацтве адбываецца на вучэбных, дапаможных, эксперыментальных, імправізаваных падмостках — на тых, якія не трапляюць у поле зроку праўладных змагароў з авангардам. «Не танцы» — лішняе таму пацверджанне.

ЗАКЛІК

# АБАРОНІМ ВЫСПУ БЕЛАРУШЧЫНЫ

Алесь ГІНЗБУРГ

**У красавіку ЖРЭА Савецкага раёна было скасавана права на арэнду памяшкання на Машэрава, 8, якое без малага 20 гадоў арандавала БНФ «Адраджэнне».**

28 сакавіка старшыня партыі БНФ Аляксей Януkевіч абвясціў старт кампаніі па абароне сядзібы.

Людзі культуры і навукі не засталіся ў баку. Публікуем тэкст звароту да чыноўнікаў і грамадства, які на дадзены момант падпісалі больш за 60 асобаў. Сярод іх — акадэмік Радзім Гарэцкі, Народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, пісьменнік Уладзімір Арлоў, музыкі Лявон Вольскі і Зміцер Вайцюшкевіч, сябры Беларускага ПЭН-Цэнтра, Саюзу беларускіх пісьменнікаў, ЗБС «Бацькаўшчына», журналісты «Новага часу» і «Нашай нівы».

**Грамадскасці Беларусі**
**Копія: Старшыні Мінгарвыканкама Ладуцьку М. А.**
**Копія: в.а начальніка ЖРЭА Савецкага раёна г. Мінска Самуйліку А.М.**

## ЗВАРОТ

Суайчыннікі, абараніце Управу!

Сядзіба на Машэрава, 8 — асаблівае месца ў найноўшай гісторыі Беларусі. Ад 1992 года яго арандаваў Беларускі Народны Фронт, але так сталася, што цяпер гэты офіс мае значэнне не для асобнай партыі, а для цэлага грамадства.

Пытанне з офісам на Машэрава, 8 выходзіць за межы спрэчкі гаспадарчых суб'ектаў. З высяленнем офіса ЖРЭА ліквідуе своеасаблівую выспу беларускасці, на якой ішла актыўная грамадская і культурная дзейнасць.

Сядзіба на Машэрава, 8 (раней Варвашэні, 8) — гэта рэдкая публічная прастора, дзе бытуе жывая беларуская мова. Гэта месца, дзе людзі натуральна набываюць вопыт гаварэння па-беларуску — крытычна важны для захавання мовы. Адначасова, гэта месца, дзе фармуецца грамадзянская супольнасць Беларусі. Тут сутыкаюцца погляды. Без такога месца наша свабода і наша культура пацерпяць.

Трэба абараніць яго. Гэта патрэбна не дзеля палітыкі. Гэта патрэбна дзеля культуры, дзеля мовы.

Мы — у большасці сваёй беспартыйныя — дактары і педагогі, навукоўцы і спевакі, пісьменнікі і артысты, бацькі беларускамоўных школьнікаў і краязнаўцы, карысталіся памяшканнямі на Машэрава, 8 для грамадскай дзейнасці, для самаадукацыі і самарэалізацыі, дзякуючы таму, што Партыя БНФ трымала дзверы адкрытымі для ўсіх. Другога такога памяшкання ў нас няма.

Звяртаемся да адпаведных чыноўнікаў, якія могуць вырашыць гэтае пытанне.

Офісных плошчаў хапае. Арандатар спраўна плаціў у бюджэт гораду. Просім пакінуць Управу па ранейшым адрасе. Беспадстаўна скасаваць арэнду — гэта значыць нанесці крыўду многім людзям, стварыць нагоду для грамадскага пратэсту.

Звяртаемся таксама да ўсіх грамадзянаў нашай краіны.

Існаванне беларусаў у сённяшняй Беларусі — гэта няспынная здача пазіцый. Беларуская нацыя падышла да крытычных рубяжоў — як у дэмаграфіі, так і ў сітуацыі моваў, культурай. І адзін з гэтых рубяжоў — Управа.

У свой час моладзь абараніла народны мемарыял Курапаты ад апаганьвання. Хто мае гонар грамадзяніна — далучайцеся гэтаксама да абароны Управы.

Заклікаем кожнага, хто можа, несці вахту салідарнасці ў памяшканні па адрасе праспект Машэрава, 8.




Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар
**Кароль Аляксей Сцяпанавіч**

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284—85—11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1-1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 462

Падпісана да друку 29.04.2011. 8.00.

Наклад 7000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.